беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НІВА

№ 20 (58)
12 жніўня 1996 г.
панядзелак

выходзіць у панядзелкі

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА
ТЭЛЕПРАГРАМА
БІРЖА ПРАЦЫ

Непатрэбны рэфэрэндум

Мечыслаў Грыб



8 жніўня сталі вядомыя пытаньні новага рэфэрэндуму, якія А.Лукашэнка прапануе Вярхоўнаму Савету зацьвердзіць на бліжэйшай сэсіі. Прэзыдэнт хоча, каб беларускія грамадзяне сёлета 7 лістапада вызначыліся: ці прымаюць яны зьмены ў Канстытуцыі, прапанаваныя прэзыдэнтам. Ухвала другога пытаньня, сэнс якога ўжо агучаны аўтарам у СМІ, будзе азначаць зьмену Канстытуцыі краіны. У зьвязку з гэтым карэспандэнт «НН» Севярын Квяткоўскі зьвярнуўся па камэнтар да экс-сьпікера беларускага парлямэнту Мечыслава Грыба, подпісам якога зацьверджана першая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусі.

Гутарка на старонцы 2.

Джахар і Шаміль

«... Я старшыня ўсёй чачэнскай дыяспары ў Расеі, гэта каля 500 тыс. чалавек. Я ведаю, што Расея не вае за цэласнасьць сваёй тэрыторыі. Яна проста хоча вынішчыць нас. Усіх чачэнцаў. Яны арыштоўваюць нас безь ніякіх падставаў, б'юць і нават забіваюць.

— Толькі за тое, што вы чачэнцы?

— Так, бо людзей дыскрымінуюць паводле крытэрыяў нацыянальнасьці. Я пасылаў лісты ў ОБСЕ, у ААН, у Раду Эўропы — і нічога, усе маўчаць. Усе найвялікшыя дзяржавы аплочваюць гэтую вайну.

— Навошта Захаду аплочваць вайну ў Чачэніі?

— Бо гутарка ідзе пра чарговы падзел сфэраў уплыву. Мы, Захад, забіраем сабе Югаславію, а вы, Расея, можаце сабе вырашаць свае справы на Каўказе так, як палічыце патрэбным. У Грузіі і Абхазіі, у Арменіі, у Карабаху, нас гэта не цікавіць. Гэта зона вашых інтарэсаў.

Пакуль Расея будзе дзейнічаць так, як гэта выгадна для краінаў Вялікай Сямёркі, то што б яна ні рабіла, ніхто не запратэстуе...»

Гутарка на старонцы 4.



Калгасная плянёрка

П'ЕСА Ў АДНЫМ АКЦЕ

У пэўнай славянскай краіне, каб захаваць калгасы, паста навілі іх узбуйніць. Зь некалькіх рабілі адзін, але вельмі вялікі па плошчы. У калгасе адбываецца плянёрка, прысьвечаная штогадовай бітве за ўраджай. Размова трансьлюецца праз кабэльнае тэлебачаньне ў навакольных вёсках. У старшыні сабраныя галоўныя спэцыялісты са справаздачамі, гутарка з брыгадзірамі ўчасткаў адбываецца праз сэлектарную сувязь. Даяркі, сьвінаркі, пастухі і мэханізатары сабраныя з гэтай нагоды ў чырвоных кутках на фэрмах і ў мэхмайстэрнях. Рабочая мова сэлектарнай плянёркі — дзяржаўны «новаяз».

– Дакладваю: на жніве-95 у нас было 65 ахвяр, але хлеб убралі воўрэмя і без пацер.

– А ў гэтым годзе ўбяром, таварыш Скакун?

– Так точна, таварыш прэдсядацель.

– Усіх на ўборку. Запомніце. Школьнікаў, ваенных, служачых і эту самую – інцелігенцыю. А то міня ні за што далбаюць у газэтах, што завальваю дзела. І ўпасі вас гаспадзь, гаспадзін Бойка, штобы з саляркай усё было о'кэй, а то самі паедзіце на камбайне ў самую заваленую брыгаду ўбіраць ураджай. Эта ў лучшым случаі.

– Так ня плоцяць жа грошы за паліва, Васіль Іваныч.

– Плаціць нада, на дурняк ніхто ня будзе даваць. Лічна далажыце. А сам прэдсядацель выйдзе да людзей і будзе прасіць напрачся. Задалжалі мы ім з зарплатай, 400 мільярдаў.

Так, а што там у нас у брыгадзе Козела? Я пралятаў у суботу над яго дзярэўняй. Ні аднаго камбайна не ўвідізеў у полі. Што ў цібя ў тваёй епархіі робіцца Козел, а?

– Дакладваю: няма на сёньняшні дзень раўнадушных ні ў дзярэўні, ні ў канторы.

– Прасьці міня, ня ўры.

– Створаны сьпецыяльны штаб. Усё пастаўлена на стрэмя – хлеб усяму галава! Навука гаварыць аб том, што ўраджай будзе каля...

– Ты перапісаў чужое выступленьне і чытаеш. Мне эта не інцірэсна. Скажы лучшэ канкрэтна і чэсна: сколькі ўбралі?

– Адзін працэнт. Але ўсе на стрэмені...

– Давай ціпер ты, Басалай. Але толькі без сьцяналій і заклінаній.

– Бальшыня камбайнаў атработала сваё. Мы паддзержываем вашы мысьлі, Васіль Іваныч, ліквідзіраваць абразаваўшыйся мінус па надоях. Яшчэ адна пазіцыя, каторая стучыцца ў дзьверы. Праблема сьцеклатары.

– А с ураджайнасьцю што?

– Па тры разы ў дзень дождж.

Працяг на старонцы 16.

Мастацтва ненароджаных

Старая рубрыка «Нашай Нівы», у якой мы друкуем творы, якія «яшчэ не нарадзіліся» як літаратура, і аўтараў, якія яшчэ ня сталі ўласна аўтарамі. Рэдакцыя атрымвае шмат літаратурных практыкаваньняў, але ня ў кожным зь іх ёсьць зерне таленту. Тыя творы, аўтарам якіх, на нашу думку, варта працягваць пісаць, мы і публікуем у рубрыцы «Мастацтва ненароджаных».

Старонкі 14-15.

«Молатаў – Рыбэнтроп»

Архіў

23 жніўня 1939 году была заключана Дамова аб ненападзе паміж Нямеччынай і Савецкім Саюзам. Аднак да цяперашняга часу ў Беларусі не публікаваліся сакрэтныя дадатковыя пратаколы да гэтай дамовы. Больш таго, іх існаваньне адмаўлялася. Толькі на мяжы 80-х і 90-х гадоў першыя публікацыі гэтых дакумэнтаў зьявіліся ў савецкім друку, зь ліку народных дэпутатаў СССР была створана Камісія па палітычнай і прававой ацэнцы савецка-нямецкай дамовы аб ненападзе. Камісія прызнала існаваньне сакрэтных пратаколаў і назвала іх «сговором»...


Яхім фон Рыбэнтроп

Самым непасрэдным чынам сакрэтныя пратаколы датычаць і гісторыі Беларусі. Гэта яны сталі юрыдычнай падставай далучэньня Заходняй Беларусі да БССР. Па-рознаму пасьля называлі падзею 17 верасьня 1939 году: хто — узьяднаньнем беларускай нацыі, а хто — "вызваленьнем ад хлеба". Канчатковага і адназначнага тлумачэньня не існуе дагэтуль...

Як бы там ні было, сёньня ў «Нашай Ніве» мы ажыцьцяўляем першую беларускую публікацыю сакрэтных дадатковых пратаколаў. Дакумэнты і камэнтар гісторыка

– на старонцы 3.

Навіны ў скарам

навіны ў скарам

СУД. Суд над сямю грамадзянамі Ўкраіны ў справе красавіцкіх падзеяў у Менску адбудзецца 21 жніўня ў будынку Менскага гарадзкога суда, бо заля суда Цэнтральнага раёну горада разьлічана ўсяго на пяць чалавек.

АБЯЦАНЬНЕ. А.Лукашэнка паабяцаў не павялічваць аплаты за камунальныя паслугі для насельніцтва, хоць ня выключыў магчымасьці падвышэньня тарыфаў на 50%, калі будзе забясьпечаны нармальны ўзровень жыцьця людзей.

БАНКІ І КРЭДЫТОРЫ. Нацыянальны банк вызначыў парадак прыняцьця прэтэнзіяў да банкаў, якія ліквідуюцца: 10 верасьня прэтэнзіі будуць прымаць банкі «Інтэкс», «Садружнасьць», «Беларускі крэдыт», да 25 верасьня – «Магнатбанк», да 2 кастрычніка –»Дукат».

ІРАН. У сувязі з падпісаньнем прэзыдэнтам ЗША Клінтанам закону, які прадугледжвае жорсткія санкцыі супраць Ірану ды Лівіі, што лічацца апірышчам міжнароднага тэрарызму, Беларусь страчвае свайго пэрспэктыўнага гандлёвага партнэра – Іран.

ПАВІНШАВАЛІ. Чачэнскія ваяры за незалежнасьць свае краіны адзначылі афіцыйнае абвяшчэньне Барыса Ельцына прэзыдэнтам Расеі пасьпяховым буйнамаштабным наступам на Грозны, што суправаджаўся цяжкімі стратамі для расейскіх войскаў.

СУПАКОІЛІ. Судовыя мэдыкі, што правялі ўскрыцьцё загінулых у катастрофе «Боінгу» амэрыканскай авіякампаніі TWA, сказалі, што ўсе ахвяры загінулі імгненна, ня зьведаўшы агоніі ды пакутаў.

ПАВОДКА І. Больш за 80 чалавек загінулі ў гішпанскім турыстычным лягеры Біэскас у выніку нечаканай паводкі, выкліканай моцным дажджом.

AIDS. Амэрыканскія мэдыкі зрабілі сэнсацыйнае адкрыцьцё дэфэктнага чалавечага гену, які зьяўляецца прычынай таго, што 1% людзей мае натуральны імунітэт да вірусу ВІЧ.

ПАМЫЛІЛІСЯ. ФБР давядзецца публічна прасіць прабачэньня ў Рычарда Джуэла – супрацоўніка службы аховы на алімпійскіх гульнях у Атлянце, які першы знайшоў бомбу й пачаў эвакуацыю людзей, у неабгрунтаваным падазрэньні яго прыналежнасьці да тэракту і праведзеных у яго доме трох вобыскаў.

ОЛЬСТЭР. Мірныя дэманстрацыі каталікоў-незалежнікаў ды прабрытанскіх пратэстантаў-англіканаў у паўночнаірляндзкім горадзе Ландандэры, што праходзілі без гвалтоўнага супрацьстаяньня ды беспарадкаў, пад раніцу ў нядзелю закончыліся пагромамі ды кіданьнем «кактэйля Молатава» ў паліцыю.

ПАВОДКА ІІ. У выніку тайфуну ў Паўднёва-ўсходнім Кітаі загінула 233 чалавекі і 234 зьніклі бязь вестак, давёўшы сьпіс ахвяраў паводак ды тайфунаў апошніх тыдняў да 2300.

«ТЭХНА». У Цюрыху болей за 350 тыс. аматараў музыкі «тэхна» ды зьвязанага зь ёю стылю жыцьця правялі свой традыцыйны фэстываль.

Славамір Адамовіч як пэрсанаж Франца Кафкі



Абсурднасьць «справы Адамовіча» сёньня ўжо вартая пяра Кафкі. 7 жніўня сьледчы КГБ тав. Сакольчык адмовіў маці паэта ў сустрэчы з сынам. Калі кабета, якая прыехала аж з-пад Будслава, зьвярнулася па дапамогу да адваката, ен высьвятліў, што падставаю для адмовы стала тое, што сьледства ў КГБ ужо скончанае і па дазвол на сустрэчу трэба зьвяртацца ў Вярхоўны Суд. Там, у сваю чаргу, растлумачылі, што трэба зьвяртацца ў Віцебск, куды ўжо накіравана справа. У Вярхоўным Судзе прызналі што парушана працэдура, бо самога Адамовіча мусілі ўжо канваяваць туды ж.

Спробы зьвязацца зь Віцебскам таксама былі безвыніковыя. Віцебскі абласны суд мусіў даць дазвол на сустрэчу маці з сынам, які зьняволены ў сьледчым ізалятары КГБ ў Менску!.. Шкала гэтай ужо зусім зьнямоджанай горам жанчыны, якая ня можа зразумець, што адбываецца ў нашай краіне.

Сёньня нават адвакат Адамовіча ня ведае дакладнай даты судовага працэсу. Хутчэй за ўсё працэс перанясуць на верасень, калі выйдуць з адпачынку супрацоўнікі Віцебскага абласнога суда. «Адпачынак» Адамовіча да таго часу складзе шэсьць месяцаў.

Працэс...

С. Х.

Сьвет старэе

Раней людзі былі здаровыя і дужыя, цяпер яны кволыя і маленькія, у ранейшыя часы жонкі заставаліся верныя мужам, а васалы – сваім сэньёрам... Так уяўлялася зьмена часоў паводле сярэднявечнай канцэпцыі Старэньня сьвету (Mundus senescit). Матывы гістарычнага пэсымізму ажываюць у сёньняшняй Беларусі, дзякуючы рэанімацыі савецкага антуражу.

Усталёўваецца бясконцая чарга сьвятаў, якія даюць нагоду для чарговага «Звароту» вышэйшае ўлады. Звычайна такія звароты пачынаюцца з формулы: «Не выпадкова ў народзе кажуць: на прафэсіі будаўніка (адзін з апошніх прыкладаў) зямля трымаецца» (Хто кажа? Калі?). Кабінэт міністраў прымае пастанову «Пра арганізацыю рэспубліканскага спаборніцтва па ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур у 1996 г.» Шыюцца пераходныя чырвоныя сьцягі. У мову вяртаюцца савецкія канцылярызмы, усё больш няшчасным робіцца лёс слова «таварыш», канкрэтны зьмест якога (пазначэньне блізкасьці ў поглядах і дзейнасьці) зноў загружаецца ідэалягічным сьмецьцем.

Галоўны лёзунг, пад якім адбываюцца ўсе падобныя «новаўвядзеньні», гучыць так: «Раней было лепей!» Вонкава гэта выглядае як адраджэньне тых савецкіх традыцыяў, што маюць каштоўнасьць. І вось узьнікае праблема з каштоўнасьцямі – з гэтымі эмацыйна афарбаванымі ўяўленьнямі пра тое, што пажаданае, а што не, што слушнае, а што не. Але ў тым і рэч, што ня ўсе афіцыйныя каштоўнасьці прызнаюцца аднадушна.

Панаваньне афіцыйных каштоўнасьцяў усталёўвае своеасаблівае адчуваньне часу, што можна вызначыць як геалягічны гістарызм – калі вядомыя як пачатак, так і канец гісторыі, які вызначаецца ўсталяваньнем абвешчаных каштоўнасьцяў. А гэта значыць, што вядомы зьмест гісторыі, бо ён заключаецца ў рэалізацыі гэтых каштоўнасьцяў. Такое вымярэньне часу ўлічвае не падзеі, а ілюзію прыроднага, таму для яго неабавязковы і немагчымы дакладны адлік. Фактычна – гэта квазівясковы час, не прапушчаны праз культурныя коды новага ўрбанізму. Таму геалягічны гістарызм шукае хоць нейкія знаёмыя ідэалягічныя пэўнасьці ў мінуўшчыне, якой бы змрочнай яна ні была. Савецкія каштоўнасьці ў канкрэтнай беларускай сытуацыі – папросту знаёмыя.

І вось тут назіраецца радыкальная розьніца з ідэалёгіяй нацыяналізму, у якой рэалізацыя аўтэнтычнасьці дае свабоду й аўтаномію. Каштоўнасьці мінуўшчыны служаць для нацыяналіста мадэляй і апірышчам, часам – мераю недахопаў сучаснае эпохі. Але гэтыя каштоўнасьці не даюць плян на будучыню. Мінулае «падтрымліваецца», каб пабудаваць лепшую й больш стабільную будучыню. Нацыянальны праект, шануючы мінулае, скіроўваецца ў будучыню.

У аўтарытарных грамадзтвах якраз тое, што абвяшчаецца стрыжнёвымі каштоўнасьцямі, робіцца аб'ектам грамадзкае нязгоды. Ёсьць яшчэ адна стадыя разьвіцьця сюжэту, калі афіцыйныя стрыжнёвыя каштоўнасьці ўяўляюць толькі пазыцыю кіраўнічага рэжыму. Такая сытуацыя – ўжо падстава для сатыры.

Уяўленьне пра тое, што рэаліі й пэрсанажы мінуўшчыны належаць ня толькі мінуламу часу, але прысутнічаюць і ў сучасным жыцьці, мы знаходзім у паэзіі вагантаў – вандроўных песеньнікаў. Але што зрабілася зь велічнымі вобразамі й фігурамі? У адной з іранічна-сур'ёзных песень знакамітага вагантаўскага цыклю «Carmina Burana» ў скаргах на ўпадніцтва й псаваньне сьвету згадваюцца найвялікшыя аўтарытэты, якія апынуліся хто ў багадзельні, хто пад судом, а хто – на рыбным рынку. «Марыю больш не цікавіць сузіраньне жыцьця, а Марфу – дзейнае жыцьцё, Лія бясплодная, Катон зачасьціў у шынок, і Лукрэцы стаў прасталыткаю».

Алег Дзярновіч

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік
НАША НІВА
заснаваны ў 1906,
адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
дызайн і вёрстка Лявон Раманчык
набор Таццяна Чуйвід
стыль Антон Кузьміч
карэктура Сяргей Сматрычэнка
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
Падпісны індэкс 63125

Непатрэбны рэфэрэндум

«НН»: Спадар Мечыслаў, як Вы ставіцеся да заявы ў прэсе аб тым, што дзейная Канстытуцыя Беларусі ня можа мець сілы, бо падпісаная ня ўсім народам, а адным чалавекам?

М.Г.: Гэты тэндэнцыйны артыкул, які зьявіўся ў «Народнай газеце», мне нават нясёмка камэнтаваць — ён відавочна заказны. Згодна зь беларускім заканадаўствам, Вярхоўны Савет ня мусіў выносіць на рэфэрэндум пытаньне аб зацьвярджэньні Канстытуцыі. Беларускі народ зрабіў свой выбар, калі абраў сваіх прадстаўнікоў у парлямэнт. Яны прынялі Канстытуцыю, і даручылі мне, як старшыні парлямэнту, яе падпісаць. Што я зрабіў з задавальненьнем.

«НН»: 8 жніўня А.Лукашэнка перадаў у ВС свой праект пастановы аб правядзеньні чарговага рэфэрэндуму. Як Вы пракамэнтуеце прапанаваныя прэзыдэнтам пытаньні?

М.Г.: Галоўнае сярод іх, на мой погляд, другое, аб зьменах у Канстытуцыі 1994 году. Само пытаньне зразумелае — «за» ці «супраць» зьменаў і дапаўненьняў у Канстытуцыі. Але ж самі варыянты зьменаў і дапаўненьняў, якія хоча ўвесьці прэзыдэнт, адсутнічаюць. Тым самым, на мой погляд, праводзіцца нейкая не зусім прыстойная гульня. Дасланы гэты праект 8 жніўня, згодна зь дзейным заканадаўствам, ад Вярхоўнага Савету будуць патрабаваць разгледзець яго не пазьней за месячны тэрмін. Я як юрыст тлумачу, што нельга з 8 жніўня адлічваць месячны тэрмін, бо няма адказу на пытаньне: у чым сэнс прапанаваных зьменаў? Калі такі адказ зьявіцца — ніхто ня ведае. Бо тое, што казаў прэзыдэнт у сродках масавай інфармацыі — гэта яшчэ не дакумэнт.

Што да астатніх пытаньняў, мне яны падаюцца, мягка кажучы, ня вельмі сур'ёзнымі, хоць і не супярэчаць нашаму заканадаўству. Напрыклад, першае. Навошта сумяшчаць два розныя сьвяты? Дзень вызваленьня Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў, безумоўна, дарагі кожнаму беларусу, у мяне ў самога бацька загінуў на вайне. Дзень Незалежнасьці — гэта іншае сьвята: дзень прыняцьця Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце нашай краіны. Так робіцца ва ўсім сьвеце — незалежнасьць зьвязаная з дэклярацыяй. Аб'ядноўваць два сьвяты ня мае ніякага сэнсу. Калі гэтая зьмена будзе прынятая, любы чалавек зможа запытацца, маўляў, а што, да 1943 году у нас не йснавала БССР? А калі йснавала, ці ж была яна самастойнай у складзе СССР пасьля 1943 году? Я ўпэўнены, што нельга спалучаць адно з другім, і гатовы паспрачацца.

Далей, трэцяе пытаньне. Ну што яно азначае? «Ці вы за свабодныя куплю-продаж зямлі, без абмежаваньняў?» Хіба ж існуе хоць адна дзяржава з падобнымі правіламі? Закон аб прыватнай уласнасьці, прынятый Вярхоўным Саветам, рэгулюе адносіны гэтага кшталту. Навошта выносіць гэтае пытаньне на рэфэрэндум? Яно ж нічога ў сабе не нясе!

Што да сьмяротнага пакараньня, гэта дарадчае пытаньне. Я разумею, што ў будучыні мы прыйдзем да ягонай адмены. Але, ці можам мы сёньня на гэта пайсьці? Хіба ўзровень цяжкіх злачынстваў у нас памяншаецца?

«НН»: Праект новага рэфэрэндуму яшчэ больш абвастрыў палітычную сытуацыю ў краіне. У зьвязку з гэтым, Ваш прагноз на восень: чым можа скончыцца супрацьстаяньне паміж парлямэнтам і прэзыдэнтам?

М.Г.: Самая няўдзячная справа — рабіць нейкія прагнозы, асабліва, калі гэта ў той ці іншай ступені датычыць цябе. Хоць я сёньня не займаю аніякае кіраўнічае пасады, але ўвосені будзе вырашацца лёс Вярхоўнага Савету, разам зь лёсам усёй краіны. Увосені эканамічны крызыс дасягне свайго піку. І хоць А.Лукашэнка абяцаў, што пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі нашыя тавары пойдуць у Расею, а адтуль грошы пацякуць да нас ракой, мы бачым, што гэтага не адбываецца і з аб'ектыўных прычынаў адбыцца ня можа. Таму абвастрэньне сацыяльна-палітычнай абстаноўкі ў краіне абсалютна рэальнае.

«НН»: Такім чынам, якімі Вы бачыце захады сацыял-дэмакратычнай партыі, да якой Вы належыце, у сытуацыі сацыяльнага выбуху? Ці маеце Вы на мэце ўзначаліць рабочы рух?

М.Г.: Натуральна, мы падтрымаем справядлівыя патрабаваньні працоўных пра падвышэньне заробкаў, пра першачарговасьць выплаты заробкаў і іншыя. Але наша партыя, як і астатнія партыі ў Беларусі, яшчэ досыць малая. Аб сапраўдным уплыве нейкіх партыяў на нашае грамадзтва можна казаць адно ў праекцыі на будучыню. Нашы людзі яшчэ ня маюць досьведу дэмакратычнага палітычнага жыцьця. І гэтую сытуацыю вельмі цяжка зьмяніць, калі дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі манапалізаваныя адным чалавекам у краіне.

«НН»: Эканамічны крызыс відавочны. Ці здатная сёньня наша дзяржава выканаць патрабаваньні сацыяльнае абароны?

М.Г.: Мы разумеем, што у бюджэце элемэнтарна бракуе грошай. Але я перакананы, што існуе палітычнае выйсьце з гэтай сытуацыі. Усім прадстаўнікам беларускага палітычнага спэктру трэба сесьці за стол перамоваў. Пра тое, што шляхі выхаду існуюць, нам сьведчаць прыклады Польшчы, Чэхіі, Вугоршчыны, прыбалтыйскіх і іншых краінаў. Я мяркую, што рэзалюцыя 27 ліпеня, падпісаная прадстаўнікамі сямі ў некаторых выпадках супрацьлеглых паводле накірунку палітычных партыяў, выразна прадэманстравала падрыхтаванасьць нашых палітыкаў да дыялёгу.

Гэта вынікае з сытуацыі, якую стварыў сваёй палітыкай прэзыдэнт: у Беларусі не засталося месца цэнтрызму, ці лібэралізму. Да апазыцыі можна залічыць ці ня кожнага, чыё меркаваньне хаця б крыху разыходзіцца зь меркаваньнем прэзыдэнта. Існуе падзел — альбо ты за А.Лукашэнку, альбо —супраць. А.Лукашэнку ўвесь час нестае ўлады, яму ўвесь час хтосьці перашкаджае палепшыць становішча ў краіне. Ну навошта яму дадатковыя два гады прэзыдэнцтва? Калі ён за пяць гадоў ня справіцца з кіраваньнем краінай, два дадатковыя яму нічым не дапамогуць.

Ён хоча вынесьці на рэфэрэндум пытаньне пра двухпалатны парлямэнт, дзе верхняя палата будзе ўтварацца з прадстаўнікоў прэзыдэнцкай вэртыкалі, якая, у сваю чаргу, на свае пасады прызначаецца прэзыдэнтам. Гэта азначае парушэнне балянсу паміж заканадаўчай, выканаўчай і судовай уладамі дзяржавы, што супярэчыць шостаму артыкулу Канстытуцыі РБ. Прэзыдэнт мае права выносіць свае пытаньні на рэфэрэндум, але ў выпадку, калі будуць прынятыя прапанаваныя ім зьмены ў Канстытуцыі, будзе парушаны дзяржаўны лад Беларусі. А.Лукашэнка хоча ператварыць Беларусь у абсалютысцкую краіну. У свой час ён заяўляў, што яму вельмі неабходна ўзяць як мага болей улады дзеля барацьбы з карупцыяй. Але абсалютная ўлада ў любой краіне вядзе адно да татальнай карупцыі. Узгадайце ягоныя словы, сказаныя пасьля мінулага рэфэрэндуму: прэзыдэнт прызнаўся тады, што атрымаў паўнамоцтвы большыя, чым у цара.

«НН»: У Беларусі насьпела сытуацыя, у якой магчымая альбо абсалютная ўлада аднаго чалавека, альбо зьмена лідара. У зьвязку з гэтым, ці адчуваеце Вы сябе здольным узначаліць кіраваньне краінай? Вы адзіны зь нямногіх палітыкаў, якія маюць багаты досьвед дзяржаўнага кіраўніцтва.

М.Г.: Пытаньне лідарства ў краіне залежыць найперш ад народу. Я цяпер не хачу называць канкрэтныя імёны верагодных прэтэндэнтаў, я мяркую, што час для гэтага пакуль што не прысьпеў. Але не выключаю, што кандыдаты ў прэзыдэнты 1994 году зноў зьявяцца ў гэтым сьпісе. Добра вядома, што на сёньняшні дзень А.Лукашэнку падтрымлівае 30 працэнтаў выбаршчыкаў. Калі ўсе яны прыйдуць на рэфэрэндум — прэзыдэнт пераможа, бо стопрацэнтавы ўдзел людзей у выбарах малаверагодны. А тады трэба чакаць трэцяга рэфэрэндуму — аб далучэньні да Расеі. Прычым, А.Лукашэнка здатны яго правесьці нават пры ўмове, што кіраўнічыя колы Расеі могуць не падтрымаць гэтую ініцыятыву.

«НН»: У гэтай сытуацыі які Вам уяўляецца самы непрымальны варыянт разьвязкі супрацьстаяньня Аляксандра Лукашэнкі зь іншым сьветам?

М.Г.: Мне вельмі не хацелася б, каб гэтае супрацьстаяньне было даведзенае да скрайнасьці і зьявіліся чалавечыя ахвяры.

«НН»: Ці апраўданыя, на Вашу думку, заявы З.Пазьняка і С.Навумчыка наконт магчымай пагрозы іхнім жыцьцям?

М.Г.: Што да Пазьняка і Навумчыка, магу прывесьці прыклад з маёй дзейнасьці ў камісіі па дасьледваньні незаконнага затрыманьня дэпутата Паўла Знаўца, якое адбылося ў штаб-кватэры БНФ 26 красавіка. Нам дагэтуль не назвалі асобаў, якія яго затрымалі, не назвалі іхнія мэты і паўнамоцтвы. Але дакладна вядома, што ў той дзень яны зьбіраліся затрымаць Зянона Пазьняка.

Калі ў краіне парушаюцца Канстытуцыя й іншае заканадаўства, у ёй магчыма ўсё, што заўгодна. Памятаеце, як абураўся А.Лукашэнка, калі Вярхоўны Савет прыняў закон аб крымінальнай адказнасьці за невыкананьне Канстытуцыі, законаў і вэрдыктаў Канстытуцыйнага Суда? Маўляў, як гэта можа быць, каб і прэм'ер-міністар РБ, і брыгадзір аднолькава выконвалі дзейнае заканадаўства: яно ж недасканалае! Кіраўніцтва справамі прэзыдэнта знаходзіць самыя неверагодныя шляхі для ўціску «канкурэнтных» галінаў улады. Напрыклад, нядаўна Кантрольная Палата ВС атрымала ліст ад Івана Ціцянкова. У ім паведамляецца, што прэзыдэнт прыняў распараджэньне аб перадачы будынка Кантрольнай Палаты, які належыць Вярхоўнаму Савету, Кіраўніцтву справамі прэзыдэнта. Рэч у тым, што гэтае распараджэньне Вярхоўны Савет ня можа абскардзіць у Канстытуцыйным Судзе, бо гэта ня ўказ. Яго, гэтае распараджэньне, КС можа разгледзець толькі са сваёй ініцыятывы. А ці будзе ён гэта рабіць, пакуль нікому невядома. Такім чынам, Кантрольная Палата можа патрапіць у поўную залежнасьць ад Кіраўніцтва справамі прэзыдэнта, якое КП ужо другі год спрабуе прарэвізаваць.

«НН»: Апошнім часам можна падумаць, што КГБ у нашай краіне —гэта самастойная палітычная структура, якая вядзе сваю асабістую гульню...

М.Г.: Я б нават сказаў, што КГБ апошнія гады вядзе рэй у палітычным жыцьці краіны.

«НН»: Як Вы ацэньваеце заяву дэпутата расейскага парлямэнту Ілюхіна аб шпіёнскіх плянах ЦРУ ў Беларусі?

М.Г.: Калі б Ілюхін меў нейкія дакумэнты і хацеў дапамагчы выкрыць нейкую змову, ён мусіў бы перадаць інфармацыю ў адпаведныя органы. Мне падаецца, што месца стварэньня гэтай заявы — Беларусь, дакладней — Менск. Адсюль усё йдзе.

«НН»: Калі будзе прынятае рашэньне пра рэфэрэндум, ці станеце Вы ў ім удзельнічаць?

М.Г.: Гэта залежыць ад таго, якія пытаньні зацьвердзіць Вярхоўны Савет. Але ў любым выпадку, я лічу, што гэты рэфэрэндум не патрэбны нашым людзям. Сёньня беларусам патрэбна праца, і заробак за яе.

ДАВЕДКА «НН»:

Былы дэпутат ВС Алег Трусаў прынес у рэдакцыю «НН» дакумэнт, які сьведчыць пра поўную зьмену поглядаў колішняга дэпутата ВС А.Лукашэнкі, які ў 1991 годзе актыўна выступаў літаральна за ўсё тое, супраць чаго сёньня выступае А.Лукашэнка-прэзыдэнт.

Рэзалюцыя
мітынгу-сустрэчы з народнымі дэпутатамі СССР і БССР на Савецкай плошчы горада Магілёва 1 чэрвеня 1991 году.

Прысутнічалі: С.Габрусеў, У.Фаменка, З.Пазьняк, А.Лукашэнка, А.Трусаў, П.Катушкін, а таксама дэпутаты мясцовых Саветаў.

Мы, удзельнікі мітынгу, зьвяртаемся да народных дэпутатаў БССР ад Магілёўшчыны з наступнымі патрабаваньнямі:

1. Галоўнай умовай пераадоленьня дзяржаўнага крызысу лічыць наданьне Дэклярацыі аб сувэрэнітэце БССР статусу канстытуцыйнага Закону.

2. Настойваць на прыняцьці пастановы аб хутчэйшай дэпартызацыі прадпрыемстваў і дзяржаўных установаў.

3. Улічваючы бессэнсоўнасьць далейшых эканамічных рэформаў і кадравых перамяшчэньняў пад крылом цяперашняга Вярхоўнага Савету БССР, які не спраўляецца з задачамі кіраваньня рэспублікай, прыняць новы Закон аб выбарах народных дэпутатаў у БССР на шматпартыйнай аснове і, кіруючыся гэтым Законам, правесьці новыя выбары.

4. Выступаць супраць падпісаньня саюзнага дагавору да прыняцьця новай Канстытуцыі Беларусі, склíканьня новага Вярхоўнага Савету БССР і рашэньня пытаньня аб кампэнсацыі рэспубліцы і яе жыхарам за ўрон, нанесены Чарнобыльскай катастрофай.

5. Патрабаваць ад саюзнага кіраўніцтва вывесьці з тэрыторыі рэспублікі ракетна-ядзерныя ўстаноўкі, аб'явіць Беларусь бязьядзернай зонай.

6. Выступаць супраць увядзеньня пасады прэзыдэнта ў рэспубліцы да прыняцьця новай Канстытуцыі і выбараў Вярхоўнага Савету на шматпартыйнай аснове.

7. Падтрымаць патрабаваньні народнага дэпутата А.Лукашэнкі аб тэрміновай прыватызацыі дзяржаўнай уласнасьці, у тым ліку зямлі, лічачы гэта асноўнай антыкрызыснай мерай у эканоміцы.

8. Настойваць на прыняцьці пастановы аб наданьні Магілеву статусу свабоднай эканамічнай зоны.

Жнівень 39-га: фрагмэнты ісьціны

57 гадоў мінула з таго дня, калі быў заключаны пакт аб ненападзе паміж СССР і Нямеччынай. Па-рознаму ацэньваюць гісторыкі і палітыкі гэты дакумэнт. На думку адных, ён быў непазьбежны для Савецкага Саюзу і быў буйной дыпляматычнай перамогай, іншыя лічаць, што ён адкрыў шлях Гітлеру да сусьветнай вайны, а СССР урэшце не атрымаў ніякіх выгадаў з адтэрмінаваньня нямецкага нападу...

На навагоднім прыёме дыпляматычнага корпусу ў Бэрліне гасьцей прымаў сам Адольф Гітлер. Згодна з этыкетам, ён па чарзе паціскаў рукі дыпляматам, часам кідаў кароткія рэплікі. Але, калі надышла чарга савецкага паўпрэда А.Меракалава, Гітлер ня толькі затрымаў поціск рукі, але і ўзнагародзіў візаві размовай, якая цягнулася некалькі хвілін.

Трэба згадаць, у якія часы прахолзіў гэты прыём. Пачатак новага, 39-га году выдаўся неспакойны. Грамадзянская вайна ў Гішпаніі скончылася — рэспубліканцы яўна пацярпелі паразу. І вось у гэтых абставінах, калі ў Гішпаніі іх суайчыньнікі страляюць адзін у аднаго, рэйхсканцлер Гітлер і паўпрэд Меракалаў амаль па-сяброўску гутараць...

Былы гітлераўскі генэрал Курт Тыпэльскірх у сваёй аб'ёмістай працы па гісторыі Другой сусьветнай вайны, зьвяртаючыся да складаных адносінаў Нямеччыны і СССР, піша, што ў 39-м годзе, «не зьбліжаючыся з Савецкім Саюзам палітычна, Гітлер імкнуўся перамяніць тон ў адносінах да яго... Расейцы вырашылі парушыць сваю ранейшую стрыманасьць і першыя сталі зандаваць глебу ў Бэрліне, што дазволіла зрабіць выснову пра іх імкненьне да палітычнага ўзаемаразуменьня зь Нямеччынаи. Калі Гітлер прыняў гэтыя іхнія спробы вельмі асьцярожна, то заходнія дзяржавы ў канцы сакавіка пачалі перамовы з СССР».

Тыпэльскірх ня быў дыпляматам, ён працаваў у разьведвальным ведамстве, але, трэба меркаваць, мог быць інфармаваны і пра зьнешнепалітычныя справы. Хто першы пачаў, трэба яшчэ праверыць, але кантакты былі — гэта дакладна.

У канцы жніўня 1939-га над сьветам нібы выбухнула бомба: СССР і Нямеччына, якія яшчэ нядаўна ганьбілі адзін аднаго на чым сьвет стаіць, нечакана для ўсіх падпісалі пакт аб ненападзе. Ніхто яшчэ ня ведаў, што да яго дадаецца сакрэтны пратакол, у якім быў зафіксаваны падзел Усходняй Эўропы на сфэры ўплыву паміж Масквой і Бэрлінам. Праз тыдзень Нямеччына ўварвалася ў Польшчу, а праз 17 дзён савецка-польскую мяжу перасекла Чырвоная Армія. Як і прадугледжвалася ў сакрэтных дамовах, Польшча (у склад якой тады ўваходзілі Заходняя Беларусь і Заходняя Ўкраіна) была падзелена паміж СССР і Нямеччынай.

Дагэтуль робяцца спробы патлумачыць гэтую акцыю выключна «клопатам пра бясьпеку нашай краіны», імкненьнем «адсунуць заходнія межы СССР» напярэдадні гітлераўскай агрэсіі, «прыйсьці на дапамогу ўкраінскім і беларускім братам». Тут толькі адна частка праўды.

Другая, зацененая частка ў тым, што «аднаўленьне справядлівасьці» ў адносінах да Ўкраіны і Беларусі (якое адбывалася разам з «тэрытарыяльна-палітычным пераўладкаваньнем») не хвалявала Сталіна... Стаўшы на шлях падзелу здабычы з драпежнікам, Сталін пачаў карыстацца мовай ультыматумаў і пагрозаў з суседнімі, асабліва малымі краінамі. Не палічыў непрыстойным выкарыстаць зброю — так адбылося ў спрэчцы зь Фінляндыяй. У вялікадзяржаўнай манеры зьдзейсьніў вяртаньне ў склад Саюзу Бэсарабіі, «аднавіў» савецкую ўладу ў рэспубліках Прыбалтыкі.

Сёньня скінута покрыва сакрэтнасьці з жнівеньскіх дамоўленасьцяў 1939 году паміж Гітлерам і Сталіным. Разам зь ім разьвеяна вера ў тое, што ўсе крокі даваеннага савецкага кіраўніцтва ў зьнешняй палітыцы дыктаваліся толькі неабходнасьцю бясьпекі краіны. Былі ў іх дзеяньнях і цынічныя разьлікі, і імпэрскія амбіцыі, і пагарда да малых народаў суседніх дзяржаваў.

А пакуль, пачынаючы з восені 1939 году, «цягнік дружбы» паміж дзьвюма дзяржавамі ўжо нёсься на ўсю моц. Крытыка ў адрас Англіі і Францыі, якая упершыню прагучала з вуснаў Сталіна на XVIII зьезьдзе ВКП(б) 10 сакавіка 1939 году, набыла да гэтага часу характар анафэмы. Хлусьня, якую падавалі сваім народам сталінскія і гітлераўскія кіраўнікі, цалкам не ўсьведамлялася. Яны абвясьцілі падпальшчыкамі вайны Англію і Францыю, а сапраўдны агрэсар — фашысцкая Нямеччына — аказалася «ў становішчы дзяржавы, якая імкнецца да міру» і вядзе «справядлівую, абарончую вайну». Больш за тое, новаспечаныя саюзьнікі нават не пасаромеліся пагразіць Захаду кулаком: «... У выпадку працягу вайны Ўрад Нямеччыны і СССР будуць кансультавацца адзін з адным аб неабходных мерах».

Фюрэр, напэўна, быў у захапленьні. Бо яшчэ 25 жніўня, праз два дні пасьля заключэньня пакту аб ненападзе паміж СССР і Нямеччынай, ён пісаў Мусаліні: «Я ўпэўнены, што магу паведаміць Вам, Дучэ, што дзякуючы перамовам з Савецкай Расеяй у міжнародных адносінах узьнікла зусім новае становішча, якое павінна прынесьці Восі найвялікшы з магчымых выйгрышаў». Чаканьні Гітлера збываліся.

31 кастрычніка на сэсіі Вярхоўнага Савету СССР прагучала сумна вядомая прамова Молатава, у якой ён заявіў: «Ідэалёгію гітлерызму... можна прызнаваць альбо адмаўляць... Кожны чалавек зразумее, што ідэалёгію нельга зьнішчыць сілай... Таму ня толькі бессэнсоўна, але і злачынна весьці такую вайну, як вайна за «зьнішчэньне гітлерызму», якая прыкрываецца фальшывым сьцягам барацьбы за "дэмакратыю"».

У друку цяпер не дапускалася ніводнага закіду супраць нацызму. Фон Шуленбург паведамляў у Бэрлін: «Савецкі ўрад робіць усё магчымае, каб зьмяніць стаўленьне насельніцтва да Нямеччыны. Прэсу нібы падмянілі. Ня толькі спыніліся ўсе выпады супраць Нямеччыны, але і падаваныя цяпер падзеі зьнешняй палітыкі грунтуюцца пераважна на нямецкіх паведамленьнях, а антынямецкая літаратура канфіскуецца з кніжнага продажу і г.д... Савецкі ўрад заўсёды ўмела ўплываў у пажаданым для яго кірунку на свае насельніцтва і гэтым разам ён таксама не шкадаваў неабходнае прапаганды».

Гэта праўда. Нават Лаўрэнцій Бэрыя ўнёс свой уклад ва ўмацаваньне савецка-нямецкага сяброўства, выдаўшы для ГУЛАГу загад, які забараняў наглядчыкам у турмах і лягерах называць вязьняў «фашыстамі».

Гэта толькі пасьля, у трагічную нядзелю 22 чэрвеня 1941 году, Молатаў будзе граміць «зграю крыважэрных фашысцкіх кіраўнікоў Нямеччыны». А пакуль савецкі прэм'ер па ўказаньне Сталіна не губляў ніводнай магчымасьці расшаркацца перад Гітлерам з прычыны яго чарговых «бліскучых перамог». 9 верасьня 1939 году ён віншуе Бэрлін з тым, што войскі вэрмахту ўварваліся ў Нарвэгію і Данію. Молатаў заяўляе Шуленбургу, што савецкі ўрад з разуменьнем ставіцца да гэтых «захадаў» і жадае Нямеччыне «поўнай перамогі ў яе абарончых мерапрыемтвах». А 17 чэрвеня 1940 году, у дзень, калі пала Францыя, Молатаў выклікае да сябе Шуленбурга і выказвае яму «самыя цёплыя віншаваньні савецкага ўраду з нагоды бліскучага посьпеху ўзброеных сілаў».

23 жніўня 1939 году пакт аб ненападзе быў заключаны; дадатковы пратакол, які стаў сакрэтным, падпісаны. Рыбэнтроп па дарозе дадому даваў інтэрвію ў аэрапорце Кёнігсбэргу: «Фюрэр паслаў мяне ў Маскву. Магчыма, гэта зьявілася нечаканасьцю для многіх у Нямеччыне. Аднак мы, нацыянал-сацыялісты, ведаем, што ўсё, што робіць фюрэр, — слушна. Расею запрашалі ў кальцавы фронт (у антыгітлераўскую кааліцыю). Але фюрэр яшчэ раз спрацаваў маланкава. Ён вырваў Расею з гэтага фронту. Вось вынікі гэтага 24-гадзіннага візыту».

А Гітлер адправіў Мусаліні ліст, дзе падвёў вынік дасягнутага: «Гатовасьць Крамля, якая адкрылася пасьля адхіленьня Літвінава, прыступіць да пераарыентацыі сваіх адносінаў зь Нямеччынай узмацнілася ў апошнія некалькі тыдняў і дала мне магчымасьць пасьля пасьпяховай падрыхтоўкі адправіць свайго міністра замежных справаў у Маскву для заключэньня дамовы...»

Інакш кажучы, Сталін даў Гітлеру ўнікальную магчымасьць, аб якой нямецкі генэралітэт, безумоўна, марыў з пачатку стагодзьдзя: разграміць Францыю, не баючыся ўдару з усходу, а потым, павярнуўшы назад, накінуцца на Расею. Гітлер ацаніў гэта. Нездарма, ставячы Сталіна на адну дошку з сваім неразлучным сябрам Мусаліні, ён з трывогай казаў: «Як і сьмерць Сталіна, сьмерць дучэ можа пагражаць нам небясьпекай».

23 жніўня 1940 году «Праўда» надрукавала перадавы артыкул, дзе, у прыватнасьці, гаварылася: «... наяўнасьць савецка-нямецкага пакту... забясьпечыла Нямеччыне спакойную ўпэўненасьць на Ўсходзе». Такім чынам, Сталін пацьвярджаў, што Гітлер можа быць спакойны за свой усходні вал, адкрыта нацкоўваў яго на Англію. І ў выніку гэтага 22 чэрвеня 1941 г. Савецкі Саюз апынуўся ў палітычнай ізаляцыі.

Адна з малавывучаных у Беларусі — праблема перасяленьня пасьля пакту 1939 году заходніх беларусаў з тэрыторыі Польшчы на тэрыторыю БССР, а таксама перасяленьня асобаў нямецкага і габрайскага паходжаньня з занятай нямецкімі войскамі Польшчы.

Так званае «перасяленьне» ажыцьцяўлялася няпроста. Пра яго жахлівыя эпізоды ў нас вядома мала — усё замазала пачатая неўзабаве вайна. Што гэта было? У адпаведнасьці з пагадненьнем, падпісаным нямецкім і савецкім бокам 16 лістапада 1939 г., у Нямеччыну адпраўлялі немцаў з занятай савецкімі часткамі тэрыторыі Польшчы, а ў СССР — беларускае насельніцтва генэрал-губэрнатарства.

Зь нямецкага боку гэтым займалася каманда, якая складалася пераважна з эсэсаўцаў. На працягу двух месяцаў яна цалкам свабодна дзейнічала на Беларусі ў савецкай зоне акупацыі Польшчы і кантралявала сумесна з адпаведнымі службамі НКВД БССР перасяленьне тысяч асобаў нямецкага паходжаньня.

Большыя складанасьці ўзьнікли з адваротным перасяленьнем (беларусаў, напрыклад, якія зусім ня марылі перабрацца ў СССР). Але самае кепскае чакала шматтысячнае габрайскае насельніцтва гэтых месцаў. Савецкія ўлады, так як і нямецкія, спрабавалі «ўпіхнуць» у эшалёны тысячы габраяў альбо, не паведамляючы другому боку, проста выштурхнуць іх за дэмаркацыйную лінію.

5 сьнежня 1939 году генэрал-палкоўнік Кейтэль паведамляў у нямецкі МЗС: «Высяленьне габраяў на расейскую тэрыторыю праходзіла ня так гладка, як, верагодна, чакалася». Насамрэч практыка была, напрыклад, такая: у ціхім лясным месцы ў раёне Горадні тысяча габраяў была выкінута за савецкую мяжу, за 15 км ад гэтага месца яны зноў вярнуліся да мяжы з афіцэрам НКВД, які хацеў прымусіць немцаў прыняць іх назад.

Зь сьнежня 1939-га — красавіка 1941-га НКВД і гестапа ўступаюць у непасрэдны кантакт, адносіны паміж карнымі апаратамі двух рэжымаў нагадваюць гульню — партнэры садзяцца за стол, гуляюць, і кожны імкнецца падмануць другога.

Перадачу «дабраахвотнікаў» партыямі ажыцьцяўлялі афіцэры НКВД і гестапа на мосьце ў Берасьці-Літоўскім. Успамінае Маргарэт Бубэр-Нойман: «Сьнежань 1939 году. Нас было дваццаць восем мужчын і тры жанчыны... Здавалася, што ўсе ад страху застылі. Мы стаялі і глядзелі на чыгуначны мост у Берасьці-Літоўскім, які разьдзяляў занятую немцамі Польшчу і яе частку, акупаваную расейцамі. Праз мост да нас паволі крочыў вайсковец. Калі ён падыйшоў бліжэй, я разгледзела эсэсаўскую фуражку.

Афіцэр НКВД і эсэсавец павіталіся, прыклаўшы руку да брылька. З вузкай сьветла-брунатнай кайстры афіцэр НКВД выняў сьпіс і стаў называць прозьвішчы. У гэты момант ад нашай групы аддзяліліся трое, кінуліся да энкавэдзіста і сталі штосьці ўзбуджана яму тлумачыць. Каля мяне хтосьці прашаптаў: «Адмаўляюцца пераходзіць мост!»... Натуральна, усіх трох прагналі цераз мост...»

Вайна, якая пачалася ў чэрвені 1941 году, падвяла рысу пад гэтым «мірным супрацоўніцтвам». Многіх нямецкіх эмігрантаў, ужо прызначаных да выдачы, не пасьпелі давезьці да Менску з далёкіх лягераў, яны засталіся дасьледжваць. У тых, каго выдалі, лёс складваўся па-рознаму, наконт гэтага Нямеччына выпрацавала выразныя інструкцыі: тых, супраць каго мелі матэрыял, чакаў канцлягер, «незаплямленыя» накіроўваліся ў вэрмахт, габраяў адназначна дэпартавалі ў гета, а адтуль у лягер зьнішчэньня...

МНОГАЕ аб'ядноўвала Гітлера і Сталіна, але найперш тое, што яны абодва ўвасаблялі, — дыктатура. Усе дыктатары вельмі любяць пустасловіць пра «дабрабыт народу», «сьветлую будучыню» і г.д. Пры гэтым ня мае ніякага значэньня тое, як вызначае сутнасьць свайго рэжыму сам тыран. Дыктатура пазакласавая.

Пры ўсёй сваёй супрацьлегласьці палітычныя рэжымы Гітлера і Сталіна былі шмат у чым падобныя. Іх аб'ядноўвала беспрынцыповасьць, падступнасьць і жорсткасьць (нават у адносінах да сяброў), нястрымнае жаданьне ўлады, поўная нецярпімасьць і прэтэнзіі на валоданьне абсалютнай, ледзьве ня боскай ісьцінай. Вядома, культ асобы Адольфа Гітлера насаджваўся і квітнеў у Нямеччыне ў ня менш грандыёзных маштабах і фанатычнай форме, чым культ Сталіна — у СССР.

Часта даводзіцца чуць, што Сталін зрабіў для краіны больш, чым хто іншы, ператварыўшы яе з аграрнай у магутную індустрыйную дзяржаву. Але тое самае зрабіў у сябе Гітлер, аднаўляючы магутнасьць, якую страціла Нямеччына пасьля Першай сусьветнай вайны. У абедзьвюх краінах нагнятаўся псыхоз шпегаманіі, даносьніцтва, падазронасьці. Гітлераўская фэміда зраднілася са сталінскай — зь яе ОСО, «тройкамі», «двойкамі», зь яе цынізмам і дэспатызмам.

31 жніўня 1939 году Вярхоўны Савет СССР аднагалосна ратыфікаваў савецка-нямецкі пакт аб ненападзе. «Мы перасталі быць ворагамі», — сказаў на сэсіі Молатаў. Пра дадатковы пратакол, безумоўна, не было сказана ні слова.

У гэты ж дзень дамова была ратыфікаваная і ў Бэрліне.

Ігар Кузьняцоў

Сакрэтны дадатковы пратакол



На здымку: Я.Рыбэнтроп і І.Сталін. Масква, Крэмль, 24 жніўня 1939 г. 5 гадзінаў раніцы. Цырымонія падпісаньня савецка-нямецкага пакту.

З выпадку падпісаньня Пакту аб Ненападзе паміж Нямеччынай і Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік упаўнаважаныя абодвух Бакоў, якія падпісаліся ніжэй, абмеркавалі ў строга канфідэнцыйных гутарках пытаньне аб размежаваньні сфэраў іхняга ўплыву ва Ўсходняй Эўропе. Гэтае абмеркаваньне прывяло да пагадненьня ў наступным:

1. У выпадку тэрытарыяльных і палітычных пераўтварэньняў у абласьцях, якія належаць Прыбалтыйскім дзяржавам (Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Літве), паўночная мяжа Літвы адначасова будзе зьяўляецца рысай, якая падзяляе сфэры ўплыву Нямеччыны і СССР. У сувязі з гэтым зацікаўленасьць Літвы ў раёне Вільні прызнана абодвума Бакамі.

2. У выпадку тэрытарыяльных і палітычных пераўтварэньняў у абласьцях, якія належаць Польскай Дзяржаве, сфэры ўплыву Нямеччыны і СССР будуць размежаваныя прыблізна па лініі рэк Нарэва, Віслы і Сана.

Пытаньне пра тое, ці пажаданае ва ўзаемных інтарэсах абодвух Бакоў захаваньне незалежнай Польскай дзяржавы, і пра межы такой дзяржавы будзе канчаткова вырашана толькі ў часе будучых палітычных падзеяў.

Ва ўсякім выпадку, абодва Ўрады вырашаць гэтае пытаньне шляхом сяброўскай згоды.

3. Датычна Паўднёва-Ўсходняй Эўропы Савецкі бок паказаў на сваю зацікаўленасьць у Бэсарабіі. Нямецкі бок ясна заявіў пра поўную палітычную незацікаўленасьць ў гэтых тэрыторыях.

4. Дадзены пратакол разглядаецца абодвума Бакамі як строга сакрэтны.

Масква, 23 жніўня 1939 г.

Паўнамоцны прадстаўнік Ураду СССР: В.Молатаў

За Ўрад Нямеччыны: Я.Рыбэнтроп.

Тлумачэньне да «Сакрэтнага дадатковага пратаколу» ад 23 жніўня 1939 году

У мэтах удакладненьня першага абзацу п.2 «Сакрэтнага Дадатковага Пратаколу» ад 23 жніўня 1939 году цяперашнім удакладняецца, што гэты абзац у наступнай канчатковай рэдакцыі, а менавіта:

«2. У выпадку тэрытарыяльных і палітычных пераўтварэньняў у абласьцях, якія належаць Польскай Дзяржаве, мяжа сфэраў інтарэсаў Нямеччыны і СССР будзе прыблізна праходзіць па лініі рэк Піса, Нарэва, Віслы і Сана».

Масква, 28 жніўня 1939 году.

Упаўнаважаны Ўраду СССР (Молатаў)

За Ўрад Нямеччыны (Шуленбург)

Джахар і Шаміль

Размова з Дэні Тэпсам, кіраўніком Кангрэсу Вайнахскай Дыяспары Расейскай Фэдэрацыі, якая аб'ядноўвае чачэнцаў і інгушоў, што жывуць у Расеі

— Чаму сымбаль Чачэніі — воўк?

— Ёсьць такая чачэнская легенда пра ваўка, дакладней, пра ваўчыцу, якая выратавала ўсіх жывых істотаў.

Некалі даўно Бог, які стварыў нашу зямлю, пасяліў на ёй людзей і ўсіх жывёлаў, паглядзеў і убачыў, што людзі моцна грашаць, увогуле ўсё ідзе да фатальнага канца. Вельмі яму гэта не спадабалася і ён вырашыў сьвет зьнішчыць. Дзеля гэтага на зямлю быў насланы страшны гураган. Гураган разбураў горы, выдзіраў дрэвы з каранямі, нішчыў чалавечыя сялібы. Людзі пакідалі свае дамы, жывёлы — свае норы, і ўцякалі, але не было куды ўцячы. Яны гінулі і нішто не магло іх ратаваць. Дарослыя і дзеці ў страху і паніцы беглі наперад, падалі і паміралі, бо нідзе ня можна было схавацца ад ветру і ніадкуль не было ратунку. І толькі воўк не ўцякаў, ён стаў і затуліў ад гурагану сваіх ваўчанятаў, каб ім не было халодна. Калі Бог убачыў, што нехта супраціўляецца яму, ён загадаў гурагану дзьмуць яшчэ мацней. Тады воўк мацней упёрся нагамі і працягваў стаяць. Віхура здзірала яму скуру з пысы і поўсьць з усяго цела, воўк паміраў, але не паддаваўся. І калі іншыя людзі і жывёлы пабачылі, што ён стаіць, яны перасталі ўцякаць. Яны сталі за плячыма ваўка, бо толькі ён стрымліваў вецер. Тады Бог зразумеў, што незалежна ад таго, зь якой сілай ён будзе вынішчаць усё жывое, гэта ня ўдасца, пакуль ёсьць такая жывёла, як воўк. Такая гордая і незалежная. З такой вялізнай воляй да жыцьця, з такой упартасьцю і годнасьцю ў захаваньні сваіх дзяцей. Такая істота вартая выратаваньня і майго спрыяньня — падумаў Бог і сьцішыў гураган... Таму ў нас, у Чачэніі, лічыцца, што воўк — кароль прыроды. Калі ваўку добра на сьвеце, то іншым таксама добра. У Чачэніі ўсе ведаюць гэтую легенду. Яна вельмі актуальная, асабліва цяпер.

— Вы выкладаеце ва ўнівэрсытэце ў Пецярбургу. А ў Чачэнію езьдзіце?

— Вядома. Там мае браты, бацька. Там забілі маю маці.

— Навошта Расеі вайна ў Чачэніі?

— Як прыклад для іншых рэспублік — няхай пабачаць, што іх чакае, калі паспрабуюць гаварыць пра незалежнасьць. Для таго, каб паказаць сваю сілу. Давесьці, што грамадзкая думка ўвогуле ня ўлічваецца. Ну і яшчэ грошы. Мноства людзей на той вайне робіць капітал. Такім чынам, гэта змаганьне за ўладу і грошы.

Я старшыня ўсёй чачэнскай дыяспары ў Расеі, гэта каля 500 тыс. чалавек, бо палова майго народу жыве ў Расеі. Я ведаю, што Расея не ваюе за цэласнасьць сваёй тэрыторыі. Яе не турбуе, ці застанецца ці не застанецца Чачэнія ў складзе Расейскай Фэдэрацыі. Яна проста хоча вынішчыць нас. Усіх чачэнцаў. І тых, якія жывуць за межамі краіны, таксама. Яны арыштоўваюць нас безь ніякіх падставаў, б'юць і нават забіваюць.

«КАЛІ НАРАДЖАЮЦЦА ДЗЕЦІ, ТО ЎСІМ ХЛОПЦАМ БАЦЬКІ ДАЮЦЬ ІМЁНЫ ДЖАХАР АБО ШАМІЛЬ. ШАМІЛЬ АБО ДЖАХАР... ЯНЫ НІКОЛІ НАС НЕ ЗАНЯВОЛЯЦЬ. АЛЬБО НАС ЗАБ'ЮЦЬ УСІХ ДА АДНАГО, АЛЬБО МЫ ПЕРАМОЖАМ».

— Толькі за тое, што вы чачэнцы?

— Так, бо людзей дыскрымінуюць паводле крытэрыяў нацыянальнасьці. Я пасылаў лісты ў АБСЭ, у ААН, у Раду Эўропы — і нічога, усе маўчаць. Увогуле гэта ня дзіўна — усе найвялікшыя дзяржавы аплочваюць гэтую вайну, таму можна іх абвінаваціць у саўдзеле ў генацыдзе.

— Навошта Захаду аплочваць вайну ў Чачэніі?

— Бо гутарка ідзе пра чарговы падзел сфэраў уплыву. Мы, Захад, забіраем сабе Югаславію, а вы, Расея, можаце сабе вырашаць свае справы на Каўказе так, як палічыце патрэбным. У Грузіі і Абхазіі, у Арменіі, у Карабаху, нас гэта не цікавіць. Гэта зона вашых інтарэсаў.

— Зноў Ялта, так?

— Згодны, свайго роду Ялта. Пакуль Расея будзе дзейнічаць так, як гэта выгадна для краінаў Вялікай Сямёркі, то што б яна ні рабіла, ніхто не запратэстуе. Калі ж раптам Расея сваю палітыку зьменіць, то пачнуцца пратэсты, абвінавачаньне ўладаў Расеі ў парушэньні правоў чалавека, скажам, у Чачэніі.

Бо Захаду патрэбная Расея — вялікая, моцная, але не занадта. Як жандар, застрашальнік Эўропы, асабліва Ўсходняй Эўропы. Амэрыка увогуле не хацела б вельмі моцнай і сапраўды аб'яднанай Эўропы, і Расея стварае для яе сытуацыю пэўнай нестабільнасьці. Расея патрэбная таксама як супрацьвага Кітаю і ісламскім дзяржавам. І таму могуць паміраць чачэнцы, можа працягвацца вайна ў Таджыкістане.

— Што будзе далей?

— Вайна. Вайна, мэта якой вынішчэньне нашага народу. Праблема толькі ў тым, што яны хацелі гэта зрабіць адным скокам, і не ўдалося. Цяпер чачэнцы маюць шанцы ператрываць і выйграць. Бо нават псыхічна чачэнцы зьмяніліся так моцна, што перамагчы іх будзе неверагодна цяжка. Калі нараджаюцца дзеці, то ўсім хлопцам бацькі даюць імёны Джахар або Шаміль. Шаміль або Джахар. Яны ніколі нас не заняволяць. Альбо нас заб'юць усіх да аднаго, альбо мы пераможам.

Нядаўна адбыўся кангрэс Вайнахскай Дыяспары Расеі, на якім гаварылася, што мы маглі б зрабіць у Расеі больш-менш тое самае, што яны робяць у нас. Але мы не тэрарысты, як яны пераконваюць увесь сьвет.

— Якая існуе розьніца паміж тэрарызмам і партызанскім боем?

— Змаганьне з акупантам — гэта не тэрор, а роспач, як апошні аргумэнт, калі ўжо іншых няма.

— Чаго заслугоўвае Доку Заўгаеў, чалавек, які ў вашым краі мае ўладу, атрыманую ад Расеі?

— Сьмерці.

Gazeta Wyborcza



Хто яна, амэрыканская міліцыя?

У зьвязку зь нядаўнім выбухам у Атлянце ўсе замежныя тэлестанцыі, якія вялі рэпартажы зь месца здарэньня, загаварылі пра магчымы ўдзел у арганізацыі гэтага тэрарыстычнага акту сяброў адной з ваенізаваных груповак, якія ў ЗША называюць міліцыяй. Былі паказаныя апранутыя ў палявую ўніформу людзі, што старанна стралялі ды пераадольвалі паласу перашкодаў на ўзор марскіх пехацінцаў ці дэсантнікаў. Дарэчы, пасьля папярэдняга выбуху, у Аклахоме, таксама згадвалася міліцыя. Пра якую міліцыю ідзе гутарка?

У сваім клясычным значэньні міліцыя – гэта група звычайных узброеных людзей, арганізаваная для самааховы сваёй мясцовасьці. Ці інакш – апалчэньне. Тое, што ў нас паліцыя называецца міліцыяй – папросту перажытак камуністычных часоў. Хоць, як заўважыў адзін мой знаёмы амэрыканскі прафэсар сацыялегіі, нашым ахоўнікам парадку слова міліцыя якраз і пасуе. Ён растлумачыў, што ў ЗША задача паліцыі – ня толькі лавіць злодзеяў, але й дапамагаць людзям, на чые падаткі яна ўтрымліваецца, у самых розных сытуацыях. «А ў вас гэтыя бамбізы з гумовымі дручкамі і сапраўды міліцыя – проста ўзброеныя людзі. Толькі спытаеш, як куды прайсьці, – адразу дакумэнты патрабуюць», – кажа прафэсар. Хто-хто, а ён добра ведае розьніцу паміж двума словамі. Бо акурат у ЗША міліцыя зьявілася задоўга да паліцыі.

Атрады міліцыі стваралі яшчэ першыя каляністы, што прыяжджалі засяляць Новы Сьвет. Ім даводзілася бараніцца як ад індзейцаў, так і ад бандаў крымінальнікаў. Пазьней тая ж міліцыя ваявала з ангельцамі за незалежнасьць ЗША. Па сутнасьці на базе міліцыі (апалчэнцаў) Джордж Вашынгтон і стварыў сваю армію. Міліцыя заўсёды грала значную ролю ў жыцьці амэрыканцаў, выконваючы функцыі нечага накшталт народнай дружыны. З той розьніцай, што тамтэйшыя дружыньнікі могуць быць узброеныя агнястрэльнай зброяй. Другая папраўка да канстытуцыі ЗША сьцьвярджае права амэрыканцаў ствараць міліцыю, мець і насіць зброю.

Але зь цягам часу, па меры таго, як функцыі аховы парадку ўсё больш і больш пераходзілі да паліцыі ці нацыянальнай гвардыі, зьмяншалася й роля міліцыі. Новае жыцьцё ўдыхнулі ў міліцыю жаўнеры, што вярталіся з вайны ў Віетнаме, якія, падобна нашым «афганцам», зь цяжкасьцю знаходзілі сябе ў мірным жыцьці, дзе іх да таго ж ганілі тыя, хто выступаў супраць гэтай вайны. Многія вэтэраны віетнамскай вайны пачалі аб'ядноўвацца ў клюбы, што ўяўлялі зь сябе атрады накшталт сваіх былых узводаў і далей заставаліся ў кампаніі сваіх баявых таварышаў. Такім чынам, яны паказалі прыклад і заклалі аснову сёньняшнім паравайсковым групоўкам у ЗША, арганізаваным на ўзор сапраўдных вайсковых падразьдзелаў. Нешта накшталт руху скаўтаў, дзе дарослыя дзядзькі могуць адчуць сябе «крутымі хлопцамі». Асаблівую папулярнасьць такія атрады набылі зь зьяўленьнем галівудзкіх баевікоў накшталт «Рэмба», «Камандас» ці «Амэрыканскі Ніндзя». Попыт спарадзіў прапанову, і ў выніку ўзьнік шматмільённы бізнэс вайсковых гульняў для дарослых. Заняткі пачалі праводзіць інструктары зь ліку былых спэцназаўцаў ды «зялёных бэрэтаў». Да гэтага далучыліся дасьведчаныя кампаніі – вытворцы зброі ды іншага вайсковага рыштунку. Нацыянальная Стралковая Асацыяцыя ЗША, што мае моцнае лобі ў Кангрэсе, дамаглася нават, каб урад на дзяржаўныя грошы пачаў праводзіць спаборніцтвы ў стральбе з баявой зброі, у асноўным з традыцыйнай амэрыканскай аўтаматычнай вінтоўкі М-16. Да таго ж зьявілася магчымасьць прадаваць залежалую на складох вайсковую амуніцыю. Паколькі ў ЗША людзі валодаюць вялікімі абшарамі зямлі, месца для вучэньняў хапае. А каб ніхто не перашкаджаў, то на межах уладаньняў выстаўляюць шыльды з надпісам: «Прыватная ўласнасьць. Усялякі, хто ступае на гэтую зямлю, трапляе пад дзеяньне ўстаноўленых Богам законаў». Гэта значыць, што калі парушальніка прыстрэляць, то той сам вінаваты.

Паступова гульнямі ў «вайнушку» пачалі займацца ня толькі «крутыя мужыкі», але й звычайныя амэрыканскія абывацелі. Сваю ролю тут адыграў штогадовы рост злачыннасьці, якую ўладальнікі паравайсковага бізнэсу выкарыстоўвалі для рэклямы сваіх паслугаў. Таму страляць пачалі як маладыя дзяўчаты, так і нямоглыя бабулькі. Не адстаюць ад дарослых і дзеці, якія пачынаюць з пнэўматычнай зброі, пераходзячы паступова на больш сур'ёзную.

Апроч чыста спартовага ці ўтылітарнага інтарэсу амэрыканцаў да зброі існуе так бы мовіць «ідэалягічны» бок. Бо разам з ростам ліку зброі на руках у насельніцтва і павелічэньнем яго ў паравайсковых фармаваньнях актывізавалі сваю дзейнасьць тыя палітычныя колы (звычайна гэта прадстаўнікі левай Дэмакратычнай партыі), што выступаюць за забарону свабоднага продажу зброі. Яны ўжо дамагліся забароны аўтаматычнай зброі для насельніцтва. Так што цяпер амэрыканскія М-16, расейскія «калашнікі» ды ізраільскія «узі» прадаюцца выключна ў паўаўтаматычным варыянце. Натуральна, што ў такіх захадах многія амэрыканцы бачаць абмежаваньне свайго канстытуцыйнага права, гарантаванага другой папраўкай. Пачынаюць гучаць галасы пра тое, што жаданьне раззброіць амэрыканцаў паходзіць з ААН, якая імкнецца паставіць ЗША пад свой кантроль. Асаблівай нялюбасьцю ААН карыстаецца ў кансэрватыўных хрысьціянаў усіх канфэсіяў, якія разглядаюць ААН як праабраз Зьвера – будучага сусьветнага ўраду Антыхрыста, апісанага ў Адкрыцьці Яна Багаслова. Многія зь іх лічаць, што дзеля ўсталяваньня «новага сусьветнага парадку» ўрад ЗША пайшоў на нейкую злавесную змову з ААН, скіраваную супраць незалежнасьці краіны і яе грамадзян, уключаючы магчымы генацыд.

Незалежны кандыдат у прэзыдэнты ЗША на выбарах 1992 г. палкоўнік Джэймс Грыц на падставе трагічных падзеяў у Вака, калі ў выніку спробы раззброіць прадстаўнікоў рэлігійнай сэкты Дэвіда Корэша загінула болей за паўсотні чалавек, называе ўрад ЗША «драпежнікам, накіраваным на зьнішчэньне людзей». У штаце Айдаха ён разам з сваімі паплечнікамі набыў самае бясьпечнае ў ЗША месца, куды не нацэлены ядравыя ракеты, дзе не бывае ўраганаў і тарнада, дзеля заснаваньня калёніі «вольных людзей, што згодныя стаяць за канстытуцыйныя правы свайго бліжняга». Як дасьведчаны вайсковец палкоўнік Грыц сам трэніруе сяброў свайго пасяленьня. Апроч таго, ён падрыхтаваў тысячы амэрыканцаў з усяе краіны, якія прыяжджаюць да яго па досьвед. Ён кажа: «Усе дарагія мне людзі – мая жонка, мая дачка, мая нявестка – усе маюць пры сабе 45-ы калібар, больш за тое, яны маюць 45-ы з двайной руляй. Што можа быць лепшага за 45-ы калібар? Два 45-я калібры! Калі я націскаю курок, у мяне страляюць дзьве рулі. Для таго, каб выжыць, вы павінны прымусіць непрыяцеля спыніць агонь!»

Натуральна, што апроч атрадаў міліцыі, нацэленых на ўласную абарону, існуюць і шматлікія экстрэмісцкія атрады. Іх асноўная ідэалёгія – расізм. Расізм як белы, так і чорны. Сярод белых – гэта нашчадкі колішняга Ку-Клукс-Клану ды фашыстоўцы зь ліку скін-хэдаў (голеных галоваў), а з чорных вылучаецца арганізацыя «Чорныя пантэры». Якраз яны і ствараюць найбольш клопату для ФБР, што спрабуе нэўтралізаваць іх ці, прынамсі, спрагназаваць іхнюю дзейнасьць, засылаючы туды сваіх агентаў.

Азіраючыся на ўсю гісторыю міліцыі ў ЗША, адзначым значную трансфармацыю гэтага чыста амэрыканскага фэномэну. З колішніх атрадаў узброеных фэрмэраў ці местачкоўцаў на чале з шэрыфам, якія дапамагалі ўраду адваёўваць ды асвойваць новыя землі, сёньняшнія міліцыянты пераўтвараюцца ў сур'ёзную апазыцыйную, непадкантрольную дзяржчыноўнікам сілу. Чым больш дзяржава імкнецца іх абмежаваць, тым больш экстрэмісцкімі робяцца многія зь іх.

Уладзімер Бараніч

К а л я н д а р

Сапраўдная Сталіца

Чаму праз безьліч часу, калі наш край ізноў зацікавіць археолягаў, яны ня змогуць адшукаць цікавы помнік — грандыёзную стэлу? Будзе высьветлена, што ад пачатку яна месьцілася на вялікім пагорку, а пасьля апынулася на дне забагненай рачулкі. Словы, высечаныя на стэле, наўрад ці зьдзівяць археолягаў больш, чым сучасьнікаў. «ВЕВЯРЭСК — летапісны горад. Ён узгадваецца ў «Сьпісе гарадоў рускіх далёкіх і блізкіх» у канцы XIV ст. На думку некаторых навукоўцаў, ён стаяў тут, на месцы в. Вавёрка Лідзкага раёну Гарадзенскай вобласьці».

Селішча, якое сучасьнікі назвалі горадам і занесьлі ў адпаведны дакумэнт, ня можа зьнікнуць выпадкова. Вевярэск узгадалі адзін раз — у часе, калі вакол гораду буяла жыцьцё: на поўначы дабудоўваліся Медніцкі й Крэўскі замкі, на поўдні закладаўся Навагрудзкі, а зусім побач, у двух дзясятках вёрстаў, квітнеў замак места Ліды. Але згадка Вевярэска ў гістарычным дакумэнце ёсьць, бадай, нейкай фантастычнай памылкай Часу. Горад мусіў зьнікнуць бясьсьледна...

Вевярэск пакінуў па сабе дзьве рэчы: назву й срэбны праскі грош, які яшчэ знойдуць недалёка ад стэлы. Гэтая манэтка, якая прыйшла ў горад з выпадковым эўрапейскім вандроўнікам, парушыла status quo: яна выкацілася з вацка і легла на мяжы прасторы Вевярэска й астатняга сьвету. Хада падзеяў ссунулася, і тым самым НАКАПАВАНАЕ зьнікненьне скарэктавалася. Зусім крыху, адно каб уратаваць назву. Дзякуючы гэтаму, насуперак лёсу, «Род, прысуджаны на сто гадоў адзіноты», якому праз гэта «не наканавана зьявіцца на зямлі двойчы», працягвае сваё існаваньне. Ён жыве на сваёй зямлі, і спрабуе аднавіць свой Дом. Штораз, калі сьцены амаль збудаваныя, узьнікае сьмерч, які руйнуе плён працы. Але цяпер сьмерч штораз слабне, з таго часу, як 105 гадоў таму Род атрымаў ІМЯ. З тога моманту Род не баіцца расшыфроўкі пэргамэнтаў, у якіх запісаная ягоная гісторыя, бо той, хто мае ІМЯ, ня можа зьнікнуць.

Магчыма, сёньня Род адзінокі, як ніколі, — ён ня можа да канца пазбавіцца адчуваньня ўласнай мітычнасьці. Каб аддаліцца ад мяжы ірэальнасьці, трэба аднавіць Вевярэск, і тады кола разамкнецца. Мы ня ведаем, якім гэты горад быў у сапраўднасьці. Тым лепей — ягонае аблічча залежыць ад нас.

Севярын Квяткоўскі

№ 20/96
12 — 18 жніўня

Новае слова на рынку беларускае прэсы – штотыдзень 8 паласоў патрэбнае інфармацыі

Інфарматар

НАША НІВА

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЕ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ



Ці пры поўнай пары ці ў сухім рэжыме – ня ўсе дванаццаць праверaных прасаў здолелі справіцца з кантрольнымі патрабаваньнямі гэтага выпрабаваньня бяз шкоды для сябе. І палова прасаў, што праходзілі тэст, ня здолела пакінуць у лябараторыі й на практыцы "добрае" агульнае ўражаньне.

Хто сёньня купляе прас, той, звычайне, робіць выбар на карысьць наяўнасьці паравога рэжыму. Гэта зьвязана з тым, што для многіх матэрыялаў, каб стаць гладкімі, неабходны ня толькі пал і ціск, але й вільготнасьць, якая выклікае набраканьне тканевых нітак і спрыяе тым самым магчымасьці наданьня ёй пэўнае формы. Той, у каго ёсьць нармальны прас з рэгулятарам, звычайна ў гэтым разе сьпярша апырсквае бялізну перад прасаваньнем ці карыстаецца дапамогаю вільготнай анучы. Прасы з паравым рэжымам закліканыя зрабіць гэты працэс зручнейшым: пры запаўненьні ёмкасьці для вады ўнутры праса па дасягненьні пэўнай тэмпэратуры з адтулінаў на напаленай паверхні праса выступае пара і ўвільгатняе матэрыял. Ці прыносяць прасы жаданыя вынікі? Мы спраўдзілі гэта на прыкладзе 12 паравых прасаў коштам ад 60 да 190 марак.

Бясьпека

Усе выпрабаваныя прасы маюць так званы абмежавальнік тэмпэратуры, які папярэджвае завялікі напал ніжняй паверхні праса ў выпадку паломкі рэгулятара. Такім чынам ліквідуецца небясьпека, што гэтая паверхня дэфармуецца й пачне плавіцца і што нават увесь прас загарыцца. Праўда, трэба прызнаць: прасы, у якіх абмежавальнік тэмпэратуры папярэдзіў найгоршае, ужо ня могуць працаваць, і іх трэба рамантаваць. Прасы з дадатковымі электроннымі прыладамі бясьпекі (чатыры зь іх мы выпрабавалі) выраблены для зусім ужо няўважлівых. Калі, напрыклад, забываюць пра ўключаны прас, бо нехта пазваніў у дзьверы, то ён ужо праз некалькі сэкундаў падае ўладару гукавы ці сьветлавы сыгнал трывогі, а калі ён не пачуты, хутка адключае электрасілкаваньне. За гэтую дадатковую прыладу забесьпячэньня бясьпекі трэба, праўда, раскашэліцца. Меней за 120 марак аніводны з выпрабаваных прасаў такога кшталту не каштуе.

Вынікі тэсту

Агульны вынік ня быў нечаканы. Сем прасаў атрымалі, праўда, адзнаку якасьці "добра" ці "задавальняльна". Астатнія пяць, аднак, праваліліся, атрымаўшы адзнаку "зь недахопамі". Прычыны: прас "Сімэнс", які за мінулы час заменены на новую мадэль, не вытрымаў кароткага замыканьня й таму атрымаў у графе бесьпека, і тым самым, у агульнай адзнацы якасьці "зь недахопамі".

Тэст на вапну

Сур'ёзныя заганы выявіліся ў доўгатэрміновым тэсьце на вапну, які скончыўся кепскай агульнай адзнакай для чатырох прасаў. Калі напаўняць іх у адпаведнасьці з інструкцыяй вадаправоднай вадой, то яны хутка, нягледзячы на ўсе захады, пакрываюцца вапнай. У гэтым разе яны ўжо ня маюць слушнага выпарэньня й губляюць, такім чынам, сваю сутнасную функцыю.

Для напальваньня да найбольшай тэмпэратуры аніводнаму з прасаў ня трэба болей за паўтары хвіліны. Таксама добра вытрымліваюцца прадугледжаныя нормамі тэмпэратуры для розных тканінаў. І ў дачыненьні функцыянаваньня выпарэньня былі атрыманы станоўчыя адзнакі. Тым ня менш толькі асобныя

Працяг на стар. 6



БІРЖА ПРАЦЫ

Запрашаем адукаваных і культурных жанчынаў і мужчынаў, якія жадаюць і ўмеюць сумленна й добра працаваць, для працы ў якасьці **прадаўцоў** у міні-каварнях на кірмашах. Абавязкова мець хатні тэлефон, ня мець шкодных звычак, маленькіх дзяцей і лецішча. Даведкі на тэл.: 233-58-19 з 9.00 да 20.00.

Установа запрашае на працу **мытнага агента** з досьведам працы, **дэкляранта**. Зьвяртацца на тэл.: 229-25-46 з 9.00 да 18.00. Пэйджэр. 278-11-01.

Установа запрашае на працу **намесьніка дырэктара крамы**. Патрабаваньні: досьвед працы ад 5 гадоў, узрост ад 30 гадоў. Тэлефон: 245-72-95.

ТАА "БСВ-швей" запрашае да супрацоўніцтва **высокакваліфікаваных швачак**, якія працавалі ў масавай вытворчасьці. Запрашаецца **рэзьнік швачнай вытворчасьці**. Наша адрэса: г. Менск, вул. Якубоўскага, 45. Тэлефон: 257-77-69.

Фірма на конкурснай аснове запрашае **бугальтара** з досьведам працы ў камэрцыйнай структуры, веданьнем кампутару для працы ў якасьці галоўнага бугальтара. Фірма запрашае **кіроўцу-прафэсійца** для працы на легкавым аўтамабіле (досьвед працы ад 10 гадоў). Тэлефон: 233-58-19.

Фірме патрабуецца **мэнэджэр**. Патрабаваньні: узрост 25-27 гадоў, вышэйшая адукацыя, веданьне нямецкай мовы, кампутар, пажадана мець аўтамабіль. Тэлефон: 269-12-15.

Установа запрашае **кіроўцу грузавога аўтамабіля** (магчымасьць выправаў па РБ), **кіроўцу зь легкавым аўтамабілем**. Тэлефон: 259-58-68, 259-58-71 (з 16.00 да 17.30).

Установа запрашае на конкурснай аснове **дзяўчатаў** 18-27 гадоў для дапамогі на гаспадарцы, абслугоўваньня банкетаў і ўрачыстасьцяў. Тэлефон: 246-39-11.

Установе патрабуюцца **гальванікі**, высокакваліфікаваныя **наладнікі зварнага абсталяваньня** 4-6 ступені. Тэлефон: 245-46-84.

Менскі досьледна-выпрабавальны завод тэхнічнага абсталяваньня запрашае на сталую працу **эканаміста**, **токара** 5-6 ступені, **шліхтара**, **сьлесара-інструмэнтальніка**, **сьлесара-электрыка**, **апэратара станкоў з ЛПК**. Наша адрэса: г. Менск, вул. Варвашэні, 15. Тэлефон: 239-48-39.

Запрашаем на працу **выкладчыкаў**: маркетынгу, бугальтарскага ўліку, мэнэджмэнту, бізнэс-пляну. Тэлефон: 231-85-58.

Фірма запрашае на працу **грузчыка**. Тэлефон: 223-58-19 з 10.00 да 18.00.

Запрашаем маладых энэргічных **супрацоўнікаў** без абмежаваньня ўзросту, якія жадаюць мець асноўны й дадатковы заробак. Тэлефоны: 54-44-06 з 8.00 да 14.00.

ЗАТ "БелІнфармПрэс" запрашае **прадаўцоў** друкаванай прадукцыі ў электрацягніках. Даем дазвол на гандаль. Тэл.: 43-85-40, 43-88-31.

Установа запрашае на працу **бугальтара**. Тэлефон: 265-20-97.

Установа запрашае на працу **інжынэра халадзільнай тэхнікі**. Тэлефон: 227-51-15.

Запрашаем на працу **мэнэджэра продажу** харчовых тавараў, **намесьніка** крамы. Тэлефон: 234-84-46.

Для сумеснай працы патрабуюцца энэргічныя камунікабэльныя **людзі**. Даведкі на тэл.: 264-88-01 з 8.00 да 11.00 штодня.

Кампанія запрашае на працу **супрацоўнікаў**. Гэта бізнэс паводле сыстэмы MLM. Запрашаем энэргічных, працалюбных людзей, а таксама мэдычных работнікаў, касмэтолягаў, масажыстаў. Тэлефон: 245-44-80.

Прапануем працу ў Англельшчыне, Нямеччыне, Галяндыі, Даніі, Францыі. Капэрта з адваротнай адрэсай: 220114 Менск, п/с 387.

Завод ЖБК трэсту "Менсксельбуд" запрашае на працу **эканаміста** з вышэйшай адукацыяй і досьведам працы на падобнай вытворчасьці ад 4 гадоў. Запрашаем таксама **муляра**, **цесьляра**. Наша адрэса: г. Менск, зав. Промысловы, 6. Тэлефоны: 244-18-02, 244-18-11.

ТАА "Місфіт" патрабуюцца **маклеры** й **дыспэтчары** з досьведам працы ў галіне нерухомасьці. Тэлефон: 268-58-39 з 9.00 да 20.00, 250-13-90 пасьля 20.00.

Выдавецкі дом "Мэджык" запрашае на працу **рэклямных агентаў**. Сумоўе ў жніўні адбываецца штосерады а 17.00 на адрэсе: г. Менск, вул. Калініна, 7. Тэлефон для даведак: 27-69-75.

БЯСПЛАТНЫЯ ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Малады хлопец пазнаёміцца з маладым хлопцам. Я — 22/176/60. Адказы высылаць па-беларуску. Адрэса: Box: 118, 98-965, Лодзь, Польшча.

Печы й каміны. Майце справу з прафэсіяналамі. Тэл. 224-29-74, 232-37-54.

Нямецкая мова: пераклады. Тэл. 275-11-78.

Набуду падшыўку "НН" (нумары 1-12 ад пачатку ўзнаўленьня) і перавыданьні "НН" пачатку стагодзьдзя. Захлебава А. пр. Ракасоўскага 49-184, тэл.47-63-40.

Прадаю кухню "Хозяюшка", новую, пад дрэва, тэл. 47-63-40.

Прадам 4-пакаёвую кватэру ў Гатаве. 48 м², 1 паверх, тэлефон, прыватызаваная. Кошт $ 17.000. Абмяняю 4-пакаёвую кватэру ў Гатаве — 48 м², 1 пав., тэл., прыватыз. — на 3-пак. у Менску. Без даплаты. Тэл. 277-85-28.

Шукаю матэрыялы аб збройнай барацьбе за Незалежнасьць Беларусі ў XX ст.
Менск, вул. Д.Сердзіча, 62, 91.

Распрацую на прафэсійным узроўні фірмовы знак, фірмовы стыль, лягатып, выраблю рэкляму.
Тэл. 5-48-96.

Куплю смычок у добрым стане для скрыпкі 1/4. Нядорага.
Т. 236-54-89. Званіць пасля 20^{00}.

Мяняю 3-п. кв. (Слуцак) на кватэру ў Менску.
Тэл. 248-28-94, Зьміцер

КУПОН
Бясплатнай прыватнай абвесткі

Імя і прозьвішча ____________________

Адрэса, тэлефон ____________________

Тэкст: ____________________

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.

220123, Менск, а/с. 71

НАША НІВА

Міністэрства сувязі і інфарматыкі
Рэспублікі Беларусі
АБАНЭМЭНТ на газэту **63125**

НАША НІВА

Колькасьць камплектаў

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____________________
(паштовы індэкс) (адрэса)

Каму ____________________
(прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАЎНАЯ КАРТКА

ПВ | месца | Літэр

на газэту **63125**

НАША НІВА

Кошт: падпіскі ______ руб.; перадрэс. ______ руб.

Колькасьць камплектаў

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____________________
(паштовы індэкс) (адрэса)

Каму ____________________
(прозьвішча, ініцыялы)

КАЛІ ЗАХОЧАЦЕ КУПІЦЬ ПРАС

(Працяг. Пачатак на стар. 5)

прасы цалкам задаволілі сваёй працай. Супрацоўніцы, якія ладзілі выпрабаваньні, прасавалі самыя разнастайныя тканіны: адамашкавыя абрусы, блюзкі з паліэстру, спадніцы са складкамі з сумесі паліэстру і воўны, кашулі з бавоўны і джынсы, у тым ліку, вядома, у цяжкіх месцах: пад гузікамі, каўнерыкамі ці пасамі, – у залежнасьці ад віду тканіны з парай ці безь яе. Найлепшыя вынікі былі паказаныя прасам "Тэфал". Аднак восем іншых прасаў пры выпрабаваньнях у працы (функцыянальнае выпрабаваньне) не змаглі пераадолець бар'ер задавальняльнай адзнакі.

Выкід пары й вільготны струмень

Асабліва цяжкія складкі можна выраўняць большасьцю прасаў за кошт дадатковага выкіду пары пры націсканьні клявішы. Гэта можна зрабіць, праўда, толькі пры высокіх тэмпэратурах, у іншым выпадку будуць выходзіць толькі кроплі вады. Калі прас не такі гарачы ці калі асабліва цяжкая складка павінна быць яшчэ раз увільготненая, ва ўсіх прасах можна выкарыстаць вільготны струмень. Ці патрэбны рэальна гэтыя дадатковыя прыстасаваньні – выкід пары й струмень – кожны павінен вырашыць для сябе, сыходзячы з упасных патрабаваньняў. Для жанчынаў, якія прасуюць, гэта не бясспрэчна. Для многіх дастаткова мець просты паравы рэжым.

У большасьці прасаў дозу пары можна рэгуляваць, гэта значыць усталёўваць на нізкім ці на высокім узроўнях, неабходных для добрага прасаваньня. У пэўных выпадках гэта можа мець сэнс. Зь іншага боку, чым болей прас дае пары, тым часьцей трэба напаўняць рэзэрвуар для вады. Пры найвышэйшым узроўні выпарэньня гэта становіцца неабходным ужо праз чвэрць гадзіны, а ў праса "Moulinex Variojet Plus 3300 auto" ужо праз 10 хвілінаў. І гэта азначае ня толькі перапынак у працы, але й магчымае павышэньне эксплюатацыйных выдаткаў пры прасаваньні, асабліва калі выкарыстоўваецца дысталяваная вада.

Догляд

Звычайна паравыя прасы патрабуюць большага догляду, чым прасы з рэгулятарам, калі жадаюць, каб яны доўга працавалі. Асабліва пры выкарыстаньні вадаправоднай вады ўтварэньне вапны застаецца часта ахілесавай пяткай паравых прасаў. Таму абавязкова варта выконваць інструкцыі што да ачысткі ад вапны. Толькі "Равэнта" й "Браўн" ня лічаць неабходным для сваіх прасаў спэцыяльныя захады для вызваленьня ад вапны. Аднак, калі прас усё-ткі пакрываецца вапнай, яго, адпаведна з інструкцыяй, трэба аддаць на сэрвіснае абслугоўваньне.

"Тэфал" ёсьць адзіным прасам, які можна напаўняць цьвёрдай вадой. Гэта робіць магчымым спэцыяльная касэта для зьневапненьня ў прасе, якую трэба замяняць пасьля набыцьця новай пэўнай афарбоўкі (2 штукі каштуюць 5,95 марак). Адна касэта вытрымлівае ў залежнасьці ад частаты прасаваньня й цьвёрдасьці вады ад двух да трох месяцаў. Рэальна гэта звычайна таньней, чым увесь час забясьпечваць прас дысталяванай вадой.

Калі на ніжняй паверхні праса засталіся тканевыя ніткі ці апрэтурныя рэшткі, якія прывялі да ейнага забруджваньня, неабходна правесьці ачыстку толькі ў адпаведнасьці з інструкцыяй. У адваротным выпадку хутка могуць утварыцца, асабліва на мяккім алюміневым пакрыцьці, драпіны.

Хаця нашыя выпрабавальніцы ня мелі вялікіх праблемаў з карыстаньнем прасам, пры пакупцы варта было б паспрабаваць некалькі рухаў, каб выбраць самы зручны для Вас прас:

– Праверце ручку праса. Ці зручна яна разьмяшчаецца ў руцэ? Ці зручна для Вас пераключаць рэгулятар тэмпэратуры, клявішы для выкіду пары й пуску струмяня безь неабходнасьці ставіць прас?

– Зьвярніце ўвагу на вагу. Калі прас вельмі цяжкі, яго лепш не выкарыстоўваць.


Карысна таксама мець выразны паказьнік узроўню вады, каб у час бачыць, калі яе трэба даліваць.

Нашы парады

"Добрыя" прасы каштуюць ужо ад 80 марак ("Браўн Варыё 6000 Стандарт ПФ Н"). Пры гэтым ня трэба адмаўляцца ад дадатковых прыстасаваньняў кшталту выкіду пары, рэгулятара вады й г. д. Для набыцьця прасаў, якія паказалі пры выпрабаваньні самыя лепшыя вынікі, трэба выкласьці болей грошай. Найлепш праявіў сябе "Тэфал Аквагліс 70с (артыкул 1970)". Гэта адзіны прас, які дзякуючы сваёй касэце, можна напаўняць вадаправоднай вадой. Аднак ён каштуе 130 марак.

Прынамсі столькі ж трэба заплаціць за прас, што атрымаў "добрую" адзнаку, з дадатковай электронікай для забесьпячэньня бясьпекі ("Браўн Варыё 6000 пратэктар электронік ПФ 66 Н"). Для асабліва няўважлівых ці асабліва сьвядомых у пляне забесьпячэньня бясьпекі гэтыя выдаткі цалкам могуць акупіцца.

Калі Вы зрабілі свой выбар праса, Вы павінны даглядаць за ім вельмі ашчадна, каб пазьбегнуць дачаснага псаваньня. Гэта ўключае ў сябе дакладнае выкананьне пададзеных у інструкцыі захадаў дзеля ачысткі ад вапны.



									З дадатковымі электроннымі прыстасаваньнямі бясьпекі			
Мадэлі	Braun Vario 6000 Standart PV 60 N	Rowenta DA - 21.1	Tefal Aquagliss 70s	Quelle Privileg (нумар замовы 235.523)	AEG Perfect DB 403 (тып 248.21)	Moulinex Variojet Plus 3300 auto	Philips HD 1615	Siemens TB 6011**	Braun Vario 6000 protector electronic PV 66 N	Moulinex Autojet Electronic (тып 238.24)	Rowenta DA-85.1S	Philips HD 1617
Кошт у нямецкіх марках (прыблізна)	80,-	95,-	130,-	59,95	79,-	80,-	90,-	65,-	130,-	150,-	190,-	120,-
Агульная ацэнка якасьці	добра	добра	добра	задавальняльна	зь недахопамі	зь недахопамі	зь недахопамі	зь недахопамі	добра	добра	задавальняльна	зь недахопамі
Заўвагі	*самы танны "добры" прас з выпрабаваных*	*адзіны прас бяз выкіду пары*	*найлепшы прас у працы*								*самы цяжкі з прасаў*	
Тэхнічныя характарыстыкі												
Магутнасьць (у ватах)	1185	1000	1190	995	990	1565	1135	1175	1140	1485	1115	1135
Ёмкасьць воднага рэзэрвуару ў мл	200	300	245	260	290	255	240	370	200	260	245	240
Вага ў кг / Даўжыня правадоў у м	1,1/2,1	1,1/1,8	1,3/1,9	0,8/1,7	1,7/2,1	1,4/2,4	1,2/2,4	1,1/1,7	1,1/2,1	1,5/2,3	1,8/1,7	1,2/2,5
Аснастка, дадатковыя прыстасаваньні	рэгулюецца доза пары; выкід пары, спомерка (мэнзурка), прылада для намоткі праваду, паз для клявішы, алюміневае пакрыцьцё ніжняй паверхні	здымны рэзэрвуар для вады, алюміневае пакрыцьцё ніжняй паверхні, паз для клявішы	рэгулюецца доза пары; выкід пары, прылада для ачышчэньня ад вапны, спомерка (мэнзурка), прылада для намоткі праваду, паз для клявішаў, лямпачка падключэньня да сеткі, эмаляваная алюміневая ніжняя паверхня	рэгулюецца доза пары; выкід пары, прылада для ачышчэньня ад вапны, спомерка, паз для кнопак, алюміневае пакрыцьцё ніжняй паверхні	рэгулюецца доза пары; выкід пары, прылада для ачышчэньня ад вапны, прылада для намоткі праваду, алюміневае пакрыцьцё ніжняй паверхні	аўтаматычна рэгулюецца доза пары; выкід пары, прылада для ачышчэньня ад вапны, спомерка, прылада для намоткі праваду, храмаванае стальное пакрыцьцё для ніжняй паверхні	рэгулюецца доза пары; выкід пары, прылада для ачышчэньня ад вапны, спомерка, прылада для намоткі праваду, паз для клявішаў, пакрыцьцё ніжняй паверхні з высокаякаснай сталі	рэгуляваная доза пары, выкід пары, мэханізм для ачышчэньня ад вапны, спомерка, прылада для намоткі праваду, паз для клявішаў, алюміневае пакрыцьцё ніжняй паверхні	рэгулюецца доза пары; выкід пары, спомерка, прылада для намоткі праваду, паз для клявішаў, ніжняя паверхня са слоем штучнага матэрыялу	аўтаматычнае рэгуляваньне дозы пары; выкід пары, прылада для ачышчэньня ад вапны, спомерка, прылада для намоткі праваду, храмаванае стальноае пакрыцьцё ніжняй паверхні	рэгулюецца доза пары; выкід пары, здымны рэзэрвуар для вады, прылада для намоткі праваду, акустычны сыгнал падключэньня на сеткі, пакрыцьцё ніжняй паверхні з высокаякаснай сталі	рэгулюецца доза пары; выкід пары, прылада для ачышчэньня ад вапны, спомерка, прылада для намоткі праваду, паз для клявішаў, лямпачка падключэньня да сеткі, пакрыцьцё ніжняй паверхні з высокаякаснай сталі
Тэхнічнае выпрабаваньне	добра	добра	добра	задавальняльна	зь недахопамі*	зь недахопамі*	зь недахопамі*	задавальняльна	добра	задавальняльна	добра	зь недахопамі*
Доўгатэрміновае выпрабаваньне (на вапну)	добра	добра	добра	задавальняльна	зь недахопамі*	зь недахопамі*	зь недахопамі*	задавальняльна	добра	задавальняльна	добра	зь недахопамі*
Выпрабаваньне на карозію	вельмі добра	вельмі добра	вельмі добра	задавальняльна	вельмі добра	вельмі добра	вельмі добра	зь недахопамі *ржа на трубках, што пакрываюць награвальнік*	вельмі добра	вельмі добра	вельмі добра	вельмі добра
Ачыстка ніжняй паверхні	задавальняльна	задавальняльна	вельмі добра	задавальняльна	задавльняльна	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна
Працягласьць награваньня	хутка	крыху доўга	крыху доўга	вельмі хутка	крыху доўга	крыху доўга	крыху доўга	хутка	хутка	крыху доўга	крыху доўга	хутка
Працягласьць астываньня	хутка	крыху доўга	хутка.	хутка	крыху доўга	доўга	доўга	хутка	хутка	доўга	доўга	доўга
Вытрымваньне рэжыму тэмпэратураў пры розных матэрыялах	добра	добра	добра	задавальняльна	добра	задавальняльна	задавальняльна	добра	добра	задавальняльна	задавальняльна	добра
Паравы рэжым	добра	добра	добра	добра	задавальняльна	добра	добра	добра	задавальняльна	добра	добра	добра
Выпрабаваньні на бясьпеку	вельмі добра	вельмі добра	вельмі добра	вельмі добра	добра	вельмі добра	вельмі добра	зь недахопамі* *ня вытрымаў выпрабаваньня на кароткае замыканьне*	вельмі добра	вельмі добра	вельмі добра	вельмі добра
Функцыянальнае выпрабаваньне	добра	задавальняльна	вельмі добра	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна	задазальняльна	задавальняльна	добра	добра	задавальняльна	задавальняльна
Працягласьць прасаваньня: з парам	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна	добра	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна	добра	задавальняльна	задавальняльна
суха	добра	задавальняльна	добра	задавальняльна	задавальняльна	добра	задавальняльна	задавальняльна	добра	добра	задавальняльна	добра
Якасьць прасаваньня: з парам	добра	задавальняльна	вельмі добра	добра	добра	задавальняльна	добра	добра	добра	добра	добра	задавальняльна
суха	добра	зь недахопамі	вельмі добра	задавальняльна	зь недахопамі	задавальняльна	задавльняльна	зь недахопамі	задавальняльна	задавальняльна	задавальняльна	задавльняльна
Зручнасьць карыстаньня	добра	добра	добра	задавальняльна	добра	добра	добра	добра	добра	добра	задавальняльна	добра

* прывяло да паніжэньня ** мадэль зьмененая

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Кася ў школцы / Малюнкі Андрэя Фядорчанкі. – Менск, ВЗАТ "Navia Moriorum", 1996. – 32 с. 4000 ас. ISBN 985-6175-04-6

Строк Л. Апорныя канспэкты па беларускай мове: 5-9-я кл. – 2-е выданьне. – Менск: Унівэрсытэцкае, 1996. – 48 с. 10.000 ас. ISBN 985-09-0171-3

Мозаика детского отдыха / Н.Абранпальская, Н.Баранова, Т.Глазько и др. – Менск: НМ Центр, 1996. – 140 с. 500 ас. ISBN 985-6216-07-9

451° Фарэнгейту



Ян Чачот. Выбраныя творы. – Менск: Беларускі кнігазбор, 1996. – 4000 ас. ISBN 985-6318-06-8

Вось якую нататку я нядаўна напаткаў у сваім архіве – у адной газэце за 2096 год:

"Неадназначнай аказалася рэакцыя шэрагу грамадзян на апошні ўказ прэзыдэнта Беларусі "Аб мерах па канфіскаваньні і зьнішчэньні незарэгістраванай кніжнай прадукцыі". Сярод уладальнікаў увогуле адзінай у наш час сэрыі кніг – Беларускага кнігазбору – якая да таго ж не прайшла перарэгістрацыю, бытавала і раней перакананьне, што, "сабраўшы кнігі гэтай залатой бібліятэкі, яны стануць уладальнікамі самага дарагога скарбу". Пасьля ажыццяўленьня сіламі ўнутраных войскаў апэрацыі па канфіскацыі і зьнішчэньні вышэйназваных кніг стала вядома, што 171 чалавек (колькасьць тамоў сэрыі), якія раней даведаліся пра падрыхтоўку апэрацыі, вывучылі кожны на памяць па адным томе з выданьня і ўцяклі ў недасяжныя лясы Полаччыны. Паводле папярэдніх зьвестак, людзі-тэксты перадаюць своеасаблівую мэнтальную інфармацыю сваім дзецям, унукам, праўнукам..."

Гэта, аднак, не пачатак фантастычнага апавяданьня, а першыя асацыяцыі ад уводнага артыкулу да сэрыі "Беларускі кнігазбор", наблытаныя з рэаліямі сёньняшняга жыцьця.

Спадзяюся, што нікому і ніколі не давядзецца завучваць на памяць, як у Брэдбэры, першы том з БК – творы Яна Чачота. Прымеркаваная да 200-х угодкаў нараджэньня паэта, кніга стала нечаканасьцю, калі не для абазнаных у выдавецкіх справах, то для паспалітых чытачоў, бо вера ў такія архіпраекты, як БК ці новая Энцыкляпэдыя надта слабая. Але не, апроч таго, што хутка пасьля абвяшчэньня праграмы і рэклямы БК распачалося само выдаваньне, першы плод, які атрымаўся, ня выкінеш за плот.

Найперш, бадай, цікавы ня гэтак Чачот, як сам прект БК. У пляне-каталёгу можна вылучыць, па-першае, творы, якія самі забясьпечаць сабе найвялікшы попыт (амаль уся літаратура XI – XVIII.: Беларускія летапісы, Статут ВКЛ, Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі Власта, Слоўнік беларускай мовы Насовіча і г. д.). Другая група – тое, што за апошнія гады выдавалася (пераважна факсымільна): М.Шчакаціхін. Нарысы..., Тарашкевічава Граматыка і г.д. Відавочна, што гэтыя кнігі запатрабуюць больш грунтоўнае працы ўжо з крытычным апаратам да твораў, каб нечым вылучыцца на фоне сваіх папярэдніх выданьняў і забясьпечыць сабе пакупніка. Гэтае ж можна сказаць і пра большасьць пунктаў з каталёгу сучаснае літаратуры.

У пошуках будучыні супрацоўнікі БК пазьбягаюць найноўшае сучаснасьці. Маўляў, хай астыне. Хоць і напісана, што "ў БК увойдуць творы сучасных беларускіх пісьменьнікаў, што атрымалі шырокае грамадзкае прызнаньне", цяжка меркаваць, як спрацуе такі крытэр.

У 1851 годзе беларус Сыракомля выдаў у Вільні свой польскі пераклад одаў беларуса Мацея Казіміра Сарбеўскага. Нарэшце мы мусім атрымаць беларускую вэрсію яго твораў – выбранае з "Багоў паганцаў". У зьвязку з гэтым узьнікае шэраг пытаньняў. Ці будзе ў выданьні "Dii Gentium" толькі пераклад ці таксама паралельны лацінскі тэкст (як у "Песьні пра зубра" 1980 году ці поўным польскім выданьні "Багоў паганцаў")? Бо, каб выйсьці за беларускі кнігарынак, напэўна давядзецца зьмяшчаць і арыгіналы шмат якіх перакладных твораў. Досыць цікава, які пераклад "Пана Тадэвуша" выберуць укладальнікі кнігі Адама Міцкевіча.

Наступным томам у сэрыі мяркуюць выдаць выбранае М.Багдановіча. Наколькі мэтазгодна гэта рабіць, калі ў кнігарнях яшчэ ляжыць апошні том поўнага збору твораў паэта? Відавочна, што БК апраўдвае рызыку сталым попытам на беларускую клясыку, таму й не баіцца выдаваць Багдановіча ў такой сытуацыі.

Чыста практычная карысьць, пры ўмове зьдзяйсьненьня праекту БК, мае быць вялікая – студэнтам калі-небудзь ужо не давядзецца напярэдадні сэсіі займаць чаргу ў Аддзел рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі, каб прачытаць беларускія летапісы ў ПСРЛ, альбо шукаць старажытную, як самыя творы, хрэстаматыю Коршунава.

Гэтая карысьць заўважная ўжо зь першага тому – выбранага Чачота. Апроч таго, што кнігу прыемна трымаць у руках і проста пагартаць (паліграфія на ўзроўні найбольш эфэктыўнага выкарыстаньня абмежаваных рэсурсаў), гэта пакуль самае поўнае выданьне Чачотавых твораў. Зразумела, што для ўсіх школаў і ўнівэрсытэтаў зусім не хапала адной ягонай кнігі, выдадзенай у 1989 годзе (Ян Чачот. Навагрsucceeded замак).

У 1811 годзе немец Тойбнэр заснаваў у Ляйпцыгу выдавецтва, якое стала адным з сусьветных лідараў у друкаваньні твораў антычнае клясыкі (Bibliotheca Teubneriana) і дасюль упэўнена трымаецца на сусьветным кнігарынку. Ці здолее Беларускі Кнігазбор стварыць нешта падобнае ў нашым маштабе? Пакуль мы атрымалі заяўку на ажыцьцяўленьне такога праекту.

Антон Кузьміч

КАСЯ Ў ШКОЛЦЫ / Малюнкі А.Фядорчанкі. – Менск: Navia Morionum, 1996, 36 ст. Наклад 4000 асобнікаў.

НАВІНКА!



Героі гэтай невялічкай, арыгінальна ілюстраванай дзіцячай кніжкі – кацяня, вожык, ваверка, зайчаня... Але жывуць яны ў мястэчку, што вельмі нагадвае старыя беларускія гарады, дый гавораць беларускаю моваю – не "наркомаўкай", а сапраўднаю, "тарашкевіцай". Дарэчы, ледзь не ўпершыню ў Беларусі пасьля 1933 году кніжка для дзяцей выходзіць у нармальнай артаграфіі, адпаведнае жывой мілагучнай матчынай мове. Выдаўцы кніжкі імкнуліся працягнуць традыцыю беларускае кнігі нашаніўскай пары, першых беларускіх чытанак – нескладаны тэкст і малюнкі неназольна прапануюць "беларускую мадэль Сусьвету". Агрэсіўна-безаблічнаму "дыснэеўскаму" стылю, які сёньня ў сваім расейскім адбітку апанаваў нашыя кніжныя паліцы, яны паспрабавалі супрацьпаставіць больш сьціплы, графічны, але індывідуальны варыянт афармленьня. "Кася ў школцы" распачынае сэрыю "Зосіна палічка", дзе кожная кніжка будзе прысьвечана пэўнаму аспэкту штодзённасьці, асяродзьдзю, у якім існуе дзіця, – школе, хатняй гаспадарцы, вясковаму ці гарадзкому побыту; адносінам, што складаюцца паміж дзецьмі ды Сусьветам. У канцы дадаецца невялічкі ілюстраваны слоўнічак, які дапаможа і бацькам і дзецям засвоіць беларускія словы, якія часам пачынаюць ужо забывацца.

У Менску кніжку можна набыць у кнігарнях: "Цэнтральная", "Сьветач", "Падпісныя выданьні", "Мастацтва", "Кніжная скарбонка", "Вільнюс"; "Сельскагаспадарчая кніга", "Акадэмкніга".

НОВЫ БЕЛАРУСКІ КНІЖНЫ ПРАЕКТ

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" наладзіў распаўсюджаньне найноўшых беларускіх выданьняў у галіне гуманістыкі, а таксама мастацкае літаратуры. Наша мэта — зрабіць новую беларускую кнігу жывым фактарам сучаснае культуры.

Сыстэма "Новага беларускага кніжнага праекту" дзейнічае ў гарадах:

БЕРАСЬЦЕ

Кнігі Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію", Энтані Сьміта "Нацыяналізм у XX ст.", Ш.Дэбаша й Ж.-М.Пант'е "Ўводзіны ў палітыку" можна набыць у кнігарнях "СЬВІТАНАК" (бульвар Касманаўтаў, 120) і "АСЬВЕТА" (вул. Маскоўская, 57). У "Сьвітанку" таксама прадаецца камплект каляровых паштовак "Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст."

ГОМЕЛЬ

У намяшканьні Гомельскай абласной унівэрсальнай бібліятэкі (пл. Перамогі, 2) пры Аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў (тэл. 55-71-97) адкрыты кніжны аддзел. Гэта адзіная кропка ў 500-тысячным горадзе, дзе можна пабачыць такі асартымэнт сучасных беларускіх кніг — мастацкую літаратуру, дасьледаваньні ў галіне гуманістыкі, найноўшыя пераклады. Апроч кніжак тут таксама можна прыдбаць самыя апошнія запісы беларускае музыкі.

ГОРАДНЯ

Продаж кніжнай прадукцыі адбываецца ў шапіку "ВАСІЛЁК" (насупраць Унівэрсытэту).

МАЛАДЭЧНА

Кнігі можна набыць у шапіку ТБМ (на чыгуначным вакзале).

МЕНСК

Кніга Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію" прадаецца ў кнігарнях "Сьветач", "Акадэмкніга", "Кнігарня пісьменьніка", "Паліткніга". Кнігі Адама Глёбуса "Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы" й "Дамавікамэрон" прадаюцца ў крамах "Сьветач" і "Кнігарня пісьменьніка", у шапіку ў фае Нацыянальнай бібліятэкі.

12.08 – 18.08

Панядзелак, 12 жніўня

Беларускае тэлебачаньне

17.05 На добры лад.
17.20 "Мікалай Буянаў. Італьянскае капрычыё". Д/ф.
17.50 Музычны антракт.
18.00 Фінансавы час.
18.25 Эканамікст.
18.35 MTV.
18.50 Навіны
19.05 "Крок".
19.40 "Гэтага мы не вывучалі...".
19.55 Беларускі дом.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 Спартовы тэлекур'ер.
22.05 Фільматэка. "Выведчыкі".
23.20 "Улюбёныя песьні сьпявае Л.Гурчанка".
24.00 Навіны.

ОРТ

5.00 Тэлеранак.
8.00 Навіны.
8.15 "Новая ахвяра".
9.05 Поле цудаў.
10.05 "Казка пра папа і пра работніка ягонага Балду". Мультфільм.
10.30 "Адгадай мэлёдыю".
11.00 Навіны.
11.10 "Захавай сябе".
11.55 КВЗ-96.
14.00 Навіны.
14.20 "Рыцар Адважнае Сэрца".
14.40 Маратон-15.
15.00 Зорны час.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Джэм.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Час пік.
18.35 "Адгадай мэлёдыю".
19.00 "Калі..."
19.45 "Дабранач, дзеці!".
20.00 Час.
20.40 М/ф "Бангкок – Хілтан". С 1
21.45 "Юсіф Бродзкі. Старонкі жыцьця".
22.40 Навіны.
22.50 Лінія кіно. "Два капітаны - II"

Канал "Расея"

16.50 "Чэленджэрс".
17.20 Прагулкі для апэтыту.
17.30 L-клюб.
18.15 Момант ісьціны.
19.00, 22.00, 23.15 Весткі.
19.35 "Санта-Барбара".
20.30 Джэнтэльмэн-шоў.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 "Фірма прыгодаў". М/ф.
23.05 Навінкі ад "ТВ-МЭДЫЯ".
23.30 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.45 З хуткасьцю гуку.

СПБ

17.05 "Філязофія паводле Філа".
17.30 "Цікавы спаняня".
17.35 Стыль жыцьця.
17.40 Канцэрт.
18.40 Вялікі фэстываль.
18.55, 22.00 Інфарм ТБ.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 Містэрыя гуку, фээрыя колеру.
20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 Дэтэктыў. "Шпег".
22.20 "Пары". М/ф.

IV канал, НТВ

17.00 Д/ф "Дзікая прырода: змаганьне за жыцьцё".
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00, 23.20 Сёньня.
18.35 Д/ф "Імкненьне да нябёсаў: гісторыя авіяцыі".
19.00 М/ф "Скутыя адным ланцугом".
20.40 Доктар Кут.
21.35 Час сэрыялу. "Каханьне блакітнае і ружовае".
22.30 Часінка.
23.20 Тэніс апоўначы.

Аўторак, 13 жніўня

Беларускае тэлебачаньне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Аўта-парк.
8.30 Абібок.
9.00 "Усё пра ўсё".
9.25 "Жалезная прынцэса". М/ф.
10.30 "Гэтага мы не вывучалі..."
10.45 Цёмны пакой.
11.15 Тураб'ектыў.
11.35 Чацьвертае вымярэньне.
12.15 Акалада.
15.00 Навіны.
15.15 "Фліпэр".
15.40 Мультфільмы.
16.05 "У палоне часу. Румянцавы"
16.35 Скарбы.
16.50 Востры кут.
17.20 Заняткі Н.Наважылавай.
17.50 Музычны антракт.
18.00 "Хахлуха". Д/ф.
18.15 Бывайце здаровыя.
18.25 Эканамікст.
18.35 MTV.
18.50 Навіны.
19.05 "Рэкс – верны сябар паліцэйскага".
20.05 Чарнобыль: праблемы і рашэньні.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.05 М/ф "Злодзейка".
23.45 Мультфільмы для дарослых.
24.00 Навіны.

ОРТ

5.00 Тэлеранак.
8.00 Навіны.
8.15 "Новая ахвяра".
9.05 "Калі..."
9.45 Сьмехапанарама.
10.15 "Лімпапо". Мультфільм.
10.30 "Адгадай мэлёдыю".
11.00 Навіны.
11.10 "Мы і рынак".
11.55 Сэрыял "Чатыры танкісты і сабака".
13.00 Сэрыял "Мера за меру".
13.25 Каханьне зь першага погляду.
14.00 Навіны.
14.20 "Рыцар Адважнае Сэрца".
14.40 Квар'етэ "Вясёлая квампанія".
14.50 Мультытролія.
15.10 Чароўны сьвет, альбо Сінэма.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 ...Да 16 і ня толькі.
16.35 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Час пік.
18.35 "Адгадай мэлёдыю".
19.00 Тэма.
19.45 "Дабранач, дзеці!".
20.00 Час.
20.40 "Бангкок – Хілтан". С. 2.
21.50 "Тэатар + TV".
22.35 Навіны.
22.45 Музычная праграма "50х50".

Канал "Расея"

6.30 Ранішні экспрэс.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00, 22.50 Весткі.
7.20 "Мак і Матлі".
7.45 Час справавых людзей.
7.55 L-клюб.
8.40 Мультфільм.
9.00 "Санта-Барбара". М/ф.
9.55 Тавары – поштай.
16.20 Музыка ўсіх пакаленьняў.
16.35 Залежыць ад цябе.
16.50 "Чэленджэрс".
17.15 Тэлечасопіс "Здароўе".
17.25 Прахалодны сьвет.
17.55 Надзвычайны канал.
18.25 "Нічога, апрача..."
18.40 "Цёмная" для У.Жырыноўскага.
19.35 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 "Бочка мёду".
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 "Мэсье Робіна". М/ф.
22.40 Навінкі ад "ТВ-МЭДЫЯ".
23.05 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.15 Вінілавыя джунглі.

СПБ

11.55, 12.55, 13.55, 15.05, 16.55, 18.55, 22.00 Інфарм ТБ.
12.05 "Першае каханьне".
13.10 Тэрмін адказу – сёньня.
13.40 Парады садоўнікам.
14.05 Дэтэктыў. "Шпег".
15.15 "Пары". М/ф.
16.30 Мультфільм.
16.40 Тэлеслужба бясьпекі.
17.05 "Філязофія паводле Філа".
17.30 "Цікавы спаняня".
17.35 Стыль жыцьця.
17.40 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 "Пецярбурскі акорд".
20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 Дэтэктыў. "Шпег".
22.20 "Адвакат". М/ф. С. 1.

IV канал, НТВ

6.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
6.15 "Незвычайныя прыгоды Скубі-Ду". Мультфільм.
6.40 "Прыгоды ўдалага ваякі Швэйка". М/ф.
7.40 М/ф "Анёл".
9.10 Д/ф "Загадкі Бібліі".
9.40 М/ф "Скутыя адным ланцугом".
11.10 Час сэрыялу. "Каханьне блакітнае і ружовае".
12.00 М/ф "Выратуй і захавай".
15.30 У сьвеце жывёлаў.
16.00 Музычныя навіны.
16.10 "Нямое кіно". Рудольф Валентына.
16.45 Навіны.
17.00 Д/ф "Дзікая прырода: змаганьне за жыцьцё".
17.30 Жаночыя гісторыі. "Каханьне і нянавісьць".
18.35 Д/ф "Імкненьне да нябёсаў: гісторыя авіяцыі".
19.00 М/ф "Лепшыя часіны".
20.45 Доктар Кут.
21.35 Час сэрыялу. "Каханьне блакітнае і ружовае".
22.30 Часінка.
23.20 Шахматны турнір "Пан Вялікі Ноўгарад".
23.50 Мэляманія: "Марк Элманд".

Серада, 14 жніўня

Беларускае тэлебачаньне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Вэртыкаль.
8.45 Музычны салён Э.Язерскай.
9.30 "Лета Эмільбэка", "Бывайце, каза і ровар!" М/ф.
10.25 Мультфільмы.
10.55 "Рэкс – верны сябар паліцэйскага".
11.50 Відзьма – нявідзьма.
15.00 Навіны.
15.15 "Фліпэр".
15.40 Мультфільм.
15.55 "Жоўтая птушка". М/ф.
17.05 "У палоне часу. Паскевічы".
17.20 Госьці ў дом.
17.50 Музычны антракт.
18.00 Беларускі дом.
18.25 Эканамікст.
18.35 MTV.
18.50 Навіны.
19.00 "Рэкс – верны сябар паліцэйскага".
19.55 "Хто гэта?"
20.05 Супэргол.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Кроніка жніва-96.
22.15 М/ф "Карнавал". С. 1.
23.35 Каралеўскае паляваньне.
0.15 Навіны.

ОРТ

5.00 Тэлеранак.
8.00 Навіны.
8.15 "Новая ахвяра".
9.05 Тэма.
9.45 У сьвеце жывёлаў.
10.20 "Срэбны званок". Мультфільм.
10.40 СМАК.
11.00 Навіны.
11.10 "Кантакт".
11.55 "Чатыры танкісты і сабака".
12.55 "Мера за меру".
13.25 Каханьне зь першага погляду.
14.00 Навіны.
14.20 "Рыцар Адважнае Сэрца".
14.40 Кактус і К°.
14.50 До-Мі-Соль.
15.10 Покліч джунгляў.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Тэт-а-тэт.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.05 Футбол. Чэмпіянат Расеі.
20.00 Час.
20.40 "Бангкок – Хілтан". С. 3.
21.40 "ДАІ, ДАІ – мая зорка..."
22.50 Навіны.

Канал "Расея"

6.30 Ранішні экспрэс.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00, 23.45 Весткі.
7.20 "Мак і Матлі".
7.45 Кліп-антракт.
7.50 Час справавых людзей.
8.00 Прасьцей за простае.
8.30 "Бочка мёду".
9.00 "Санта-Барбара". М/ф.
9.55 Тавары – поштай.
10.20 "Ад'ютант яго вялікасьці". М/ф. С. 1.
16.20 Музыка ўсіх пакаленьняў.
16.35 Залежыць ад цябе.
16.50 "Чэленджэрс".
17.15 Экс-эль м'юзык.
17.25 Свая гульня.
17.55 Суайчыньнікі.
18.25 Лідар-прагноз.
19.35 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Сам сабе рэжысэр.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 "Лета каханьня". М/ф.
22.40 Ціхі дом.
23.35 Навінкі ад "ТВ-МЭДЫЯ".
20.00 Музыка ўсіх пакаленьняў.

СПБ

11.55, 12.55, 13.55, 15.05, 16.55, 18.55, 22.00 Інфарм ТБ.
12.05 "Першае каханьне".
13.10 Тэрмін адказу – сёньня.
13.40 Парады садоўнікам.
14.05 Дэтэктыў. "Шпег".
15.15 "Адвакат". М/ф. С. 1.
16.20 "20 хвілінаў зь "Песьнярамі". Ф/к.
16.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
17.05 "Філязофія паводле Філа".
17.30 "Цікавы спаняня".
17.35 Стыль жыцьця.
17.40 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 Толькі бяз панікі.
20.55 Спартовы агляд.
21.05 Дэтэктыў. "Шпег".
22.20 Футбол. Кубак Расеі. 1/16 фіналу.

IV канал, НТВ

6.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
6.15 Мультфільм "Незвычайныя прыгоды Скубі-Ду".
6.40 "Прыгоды ўдалага ваякі Швэйка". М/ф.
7.40 М/ф "Турма. Кепскія хлопцы".
9.25 Д/ф "Загадкі Бібліі".
9.45 М/ф "Лепшыя часіны".
11.25 Час сэрыялу. "Каханьне блакітнае і ружовае".
12.15 М/ф "Чорная курыца, альбо Падземныя жыхары".
14.35 Сьпявае С.Захараў.
15.00 "Прымус".
15.30 У сьвеце жывёлаў.
16.00 Музычныя навіны.
16.10 Першая пэдзі экрану.
16.35 Мультфільм.
16.45 Навіны.
17.00 Д/ф "Дзікая прырода: змаганьне за жыцьцё".
17.30 Жаночыя гісторыі. "Зачараваная Зоі".
18.35 Д/ф "Імкненьне да нябёсаў: гісторыя авіяцыі".
19.00 М/ф "Нявеста была ў чорным".
21.35 Час сэрыялу. "Дом жахаў Хамэра".
22.30 Часінка.
23.20 Такое спартовае жыцьцё.
23.50 Кавярня Абломаў.

Чацьвер, 15 жніўня

Беларускае тэлебачаньне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Госьці ў дом.
8.45 "Сяляне".
9.15 "Котка, якая гуляла сама сабой". Мультфільм.
10.30 Каралеўскае паляваньне.
11.10 "Рэкс – верны сябар паліцэйскага".
12.05 "Ёсіф і ягоны брат Пётра". Д/ф.
15.00 Навіны.
15.15 "Фліпэр".
15.40 "Разам вясёла крочыць...", "Ціха! Ідзе запіс!" Ф/к.
16.20 Кантрасты.
16.50 Арсэнал.
17.20 Заняткі Н.Наважылавай.
17.50 Музычны антракт.
18.00 Да Дня незалежнасьці Індыі. "Вялікая краіна".
18.15 "Фантазіі на тэмы Фабэржэ".
18.25 Эканамікст.
18.35 MTV.
18.50 Навіны.
19.05 "Рэкс – верны сябар паліцэйскага".
20.05 "Крок".
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Кроніка жніва-96.
22.10 "Карнавал". С. 2.
23.30 "Крок".
24.00 Навіны.
0.15 Матаспорт. Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету-96.

ОРТ

5.00 Тэлеранак.
8.00 Навіны.
8.15 "Новая ахвяра".
9.05 Футбол. Чэмпіянат Расеі.
10.00 "Муха-цакатуха". Мультфільм.
10.10 Клюб падарожнікаў.
11.00 Навіны.
11.10 "Пад дахам сьвету".
11.55 "Чатыры танкісты і сабака".
12.55 "Мера за меру".
13.25 Каханьне зь першага погляду.
14.00 Навіны.
14.20 "Рыцар Адважнае Сэрца".
14.40 ЛЕГА-ГО!
15.05 Тын-тонік.
15.35 "Элен і хлопцы".
16.00 Рок-занятак.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Час пік.
18.35 Лято-Мільён.
19.00 "Мая сям'я".
19.45 "Дабранач, дзеці!".
20.00 Час.
20.40 "Бангкок – Хілтан". С. 4.
21.50 "Мужчына і жанчына".
22.30 "Абоз".
23.20 Навіны.

Канал "Расея"

6.30 Ранішні экспрэс.
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00, 22.55 Весткі.
7.20 "Мак і Матлі".
7.45 Кліп-антракт.
7.50 Час справавых людзей.
8.00 Прасьцей за простае.
8.30 Сам сабе рэжысэр.
9.00 "Санта-Барбара". М/ф.
9.55 Тавары – поштай.
10.20 "Ад'ютант яго вялікасьці". С. 2.
16.20 Музыка ўсіх пакаленьняў.
16.35 Залежыць ад цябе.
16.50 "Чэленджэрс".
17.15 Ваш партнэр.
17.25 Даміно Міхаіла Баярскага.
17.55 Тэлескоп.
18.25 Нічога, апрача...
18.40 "Цёмная" для В.Навадворскай.
19.35 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Раз на тыдзень.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 "Дом Ашэраў". М/ф.
22.45 Навінкі ад "ТВ-МЭДЫЯ".
23.10 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.25 Аніматэка.

СПБ

11.55, 12.55, 13.55, 15.05, 16.55, 18.55, 22.00 Інфарм ТБ.
12.05 "Першае каханьне".
13.10 Тэрмін адказу – сёньня.
13.40 Парады садоўнікам.
14.05 Дэтэктыў. "Шпег".
15.10 "О, Мэльпамэна!" Тэлеспэктакаль.
16.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
17.05 "Філязофія паводле Філа".
17.30 "Цікавы спаняня".
17.35 Стыль жыцьця
17.40 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 "Тэлекампакт".
20.55 Спартовы агляд.
21.05 Дэтэктыў. "Шпег".
22.20 "Адвакат". С. 2.

IV канал, НТВ

6.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
6.15 Мультфільм "Незвычайныя прыгоды Скубі-Ду".
6.40 "Прыгоды ўдалага ваякі Швэйка". М/ф.
7.40 М/ф "Тайныя сябры".
9.15 Д/ф "Загадкі Бібліі".
9.40 М/ф "Нявеста была ў чорным".
11.25 Час сэрыялу. "Дом жахаў Хамэра".
12.15 М/ф "Кета і Катэ".
14.35 На біблейскія сюжэты.
15.00 "Прымус".
15.30 У сьвеце жывёлаў.
16.00 Музычныя навіны.
16.10 Узьлёт і падзеньне Джудзі Гарленд.
16.45 Навіны.
17.00 Д/ф "Дзікая прырода: змаганьне за жыцьцё".
17.30 Жаночыя гісторыі. М/ф "Зачараваная Зоі".
18.35 Д/ф "Імкненьне да нябёсаў: гісторыя авіяцыі".
19.00 М/ф "На рагу, ля Патрыяршых...".
21.35 Час сэрыялу. "Дом жахаў Хамэра".
22.30 Часінка.
23.20 Кіно не для ўсіх. М/ф "Слуга".

Пятніца, 16 жніўня

Беларускае тэлебачаньне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 Ф/к "Ці памятаеш ты".
8.55 "Казка пра закаханага маляра". М/ф.
10.10 Мультфільмы.
10.55 "Рэкс – верны сябар паліцэйскага".
11.50 "Я ўваходжу замест дзікага зьвера ў клетку".
15.00 Навіны.
15.15 "Фліпэр".
15.40 "Любоўю за любоў". М/ф.
17.00 Канцэртны сэзон.
17.20 "Крок".
17.50 Музычны антракт.
18.00 Творцы.
18.25 Эканамікст.
18.35 MTV.
18.50 Навіны.
19.05 "Рэкс – верны сябар паліцэйскага".
20.05 Міжнародны кур'ер.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.05 "Гараж". М/ф.
23.45 "12, альбо На ноч гледзячы"
0.05 Навіны.
0.20 Акалада.
0.50 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. "Дынама" (Менск) – "Белшына" (Бабруйск). Т. 2.

ОРТ

5.00 Тэлеранак.
8.00 Навіны.
8.15 "Новая ахвяра".
9.10 "Мая сям'я".
9.50 Грай, гармонік любы!
10.25 Пакуль усе дома.
11.00 Навіны.
11.10 Ад пятніцы да пятніцы.
11.55 "Чатыры танкісты і сабака".
12.55 "Мера за меру".
13.25 Каханьне зь першага погляду.
14.00 Навіны.
14.20 "Рыцар Адважнае Сэрца".
14.40 "Чалавек за шырмай".
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 "Галопам па Эўропах".
16.35 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.15 Чалавек і закон.
18.45 Поле цудаў.
19.45 "Дабранач, дзеці!".
20.00 Час.
20.40 "Бангкок – Хілтан". С. 5.
21.40 Погляд.
22.25 Навіны.
22.35 Камэдыя "Мужчынскі зігзаг".

Канал "Расея"

6.30 Ранішні экспрэс.
7.00, 10.00, 16.00, 22.00, 23.20 Весткі.
7.20 "Мак і Матлі".
7.45 Кліп-антракт.
7.50 Час справавых людзей.
8.00 Свая гульня.
8.30 Джэнтэльмэн-шоў.
9.00 "Санта-Барбара". М/ф.
9.55 Тавары – поштай.
10.20 Гандлёвы дом "Ле Монці".
10.35 "Ад'ютант яго вялікасьці". С. 3.
16.20 Музыка ўсіх пакаленьняў.
16.35 Залежыць ад цябе.
16.50 "Чэленджэрс".
17.15 Мой малы і я.
17.25 Эх, дарогі!
17.55 Вэртыкаль.
18.25 Клюб "АС".
19.35 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Маскі-шоў.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 Хакей. Міжнародная сустрэча. Расея – Фінляндыя.
23.10 Навінкі ад "ТВ-МЭДЫЯ".
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Начное Рандэву.

СПБ

11.55, 12.55, 13.55, 15.05, 16.55, 18.55, 22.00 Інфарм ТБ.
12.05 "Першае каханьне".
13.10 Тэрмін адказу – сёньня.
13.40 Парады садоўнікам.
14.05 Дэтэктыў. "Шпег".
15.15 "Адвакат". С. 2.
16.25 "Ганчары". Т/ф.
16.40, 20.40 Тэлеслужба бясьпекі.
17.05 "Філязофія паводле Філа".
17.30 "Цікавы спаняня".
17.35 Стыль жыцьця.
17.40 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханьне".
20.10 "Бяз назвы".
20.55 Спартовы агляд.
21.05 Дэтэктыў. "Шпег".
22.20 "Адвакат". С. 3.

IV канал, НТВ

6.00, 18.00, 21.00, 23.00 Сёньня.
6.15 Мультфільм "Незвычайныя прыгоды Скубі-Ду".
6.40 "Авіяпошта". Сэрыял.
7.40 Ф/к "Рудольф Нурыеў: я – танцоўшчык".
9.35 М/ф "На рагу, ля Птрыяршых...".
11.25 Час сэрыялу. "Дом жахаў Хамэра".
12.15 "Тры таварышы". М/ф.
14.35 Востраў.
15.05 "Прымус".
15.35 У сьвеце жывёлаў.
16.00 Музычныя навіны.
16.45 Навіны.
17.00 Д/ф "Дзікая прырода: барацьба за жыцьцё".
17.30 Футбольны клюб.
18.35 М/ф "Браты Блюз: удвох супраць усіх".
21.35 Час сэрыялу. "Дом жахаў Хамэра".

12.08 – 18.08

22.30 Часінка.
23.20 М/ф "Прэч, хлопцы".
1.10 Начны канал. Эратычныя шоў сьвету.

Субота, 17 жніўня

Беларускае тэлебачаньне

8.00 Навіны.
8.15 "Сугучча".
8.40 Лёс мой і надзея.
9.15 Здароўе.
9.50 Заняткі Н.Наважылавай.
10.20 Усё пра ўсё.
10.45 "Ералаш".
11.05 Шматгалосьсе.
11.30 Сьвет прыроды і захапленьняў.
12.20 Майстэрня.
12.50 Мультфільм.
13.00 "Разгорнутая кніга". М/ф. С. 1.
14.35 "Радавод" на Трэцім фэстывалі беларускай polькі ў Чачэрску.
15.15 "Эўрапейская дваццатка MTV".
16.00 Тэлевізійны Дом кіно.
16.45 "Добра сядзім!"
18.00 Наперад, па золата!
18.50 Галерэя.
19.25 М/ф "Васа". С. 1.
20.40 Калыханка.
21.00 Навіны.
21.45 М/ф "Фані і Аляксандар". Ч. 1.
23.30 Безьліч.

ОРТ

7.00 "Ералаш".
7.30 Фільм "Фантастычная гісторыя".
8.40 "Цудоўны калодзеж". Мультфільм.
9.00 Навіны.
9.10 Слова пастыра.
9.30 Не пазяхай!
10.00 Ранішняя пошта.
10.35 СМАК.
10.55 "Дзіўны град Маскоў".
11.25 Фільм "Чалавек зь іншага боку".
13.05 "Птушка Тары". Мультфільм.
13.15 "Тэатар + TV".
14.00 Навіны.
14.20 "Пастушка і камінар". Мультфільм.
14.50 Фільм "Востраў скарбаў". С. 1.
16.00 Вакно ў Эўропу.
16.30 М.Тарывэрдыеў. "Санэты Шэксьпіра".
17.00 Навіны.
17.20 У сьвеце жывёлаў.
18.05 Фільм "Закаханы на ўласнае жаданьне".
19.45 "Дабранач, дзеці!".
20.00 Час.
20.40 "Бангкок – Хілтан". С. 6.
21.40 "Брэйн рынг".
22.30 Фільм "Падарожжа Салівана".

Канал "Расея"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00, 23.40 Весткі.
7.20 "Мак і Матлі".
7.45 Мультфільм.
8.15 Навінкі ад "ТВ-МЭЛЫЯ".
8.30 Мультфільм
9.00 "Брадвэй" нашага юнацтва". Д/ф.
9.30 Паводле вашых лістоў.
10.00 Весткі аб адзінаццатай.
10.15 Кнігарня.
10.30 Добрае раніцы.
11.25 21-ы кабінэт.
11.55 Кліп-антракт.
12.00 Прасьцей за простае.
12.30 Тэатар маёй памяці.
13.20 "Эй, Ухнем!"
13.35 Дэ факта.
14.00 "Квіні". С. 3.
14.50 Асоба з вокладкі.
15.10 Бясконцае падарожжа.
15.55 Футбол. Чэмпіянат Расеі.
17.55 Суботні вечар у цырку.
19.35 "Дзеці Дон Кіхота". М/ф.
20.55 Надвор'е на заўтра.
21.00 Падвойны партрэт.
22.05 "Мядзьведзь на імя Артур". М/ф.

23.55 Праграма "А".

СПБ

9.15 Стыль жыцьця.
9.20 Вялікія жарсьці.
9.35 "Дзьве вэрсіі аднае сьмерці". Тэлеспэктакаль.
10.05 "Гонар маю".
10.25 Неспазнанае.
10.55, 12.55, 14.55, 18.55 Інфарм ТБ.
11.10 Ток-шоў "Наўзгад". Алег Табакоў.
11.40 Мы і банк.
12.15 Яшчэ адна Расея.
12.40 Старое танга.
13.10 "Адвакат". С. 3.
14.10 "Скарбы Пецярбургу".
14.25 Парадоксы гісторыі.
15.10 Дом кіно. "Памяці Сяргея Курохіна".
15.55 "Там, дзе жыве Павуціньч".
16.10 Цапкам праўдзівая гісторыя пра чараўніцтва.
16.30 "Дзіцячы альбом".
16.55 Спартовы агляд.
17.10 "Тэхнасапіенс". М/ф.
18.20 "Месяцовая прынцэса". Мультфільм.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.25 "Краявід з трыма купальшчыцамі". М/ф.
20.55 Сьвецкая хроніка.
21.10 Блеф-клюб.
21.45 Тэлекампакт. Музычнае шоў.
22.30 "Хлопчык з запіву". М/ф.

IV канал, НТВ

6.00, 18.00, 21.00 Сёньня.
6.15 Мультфільм "Незвычайныя прыгоды Скубі-Ду".
6.40 "Авіяпошта". С. 2.
7.35 М/ф "Машыны-забойцы".
9.10 Д/ф "Загадкі Біблі".
9.35 М/ф "Брат Блюз: удвох супраць усіх".
11.40 Час сэрыялу. "Дом жахаў Хамэра".
12.30 М/ф "Камітэт Аркадзя Фаміча".
14.00 Часопіс часопісаў.
14.10 Багема.
15.15 Крок з кола.
15.35 Навіны кіно.
15.55 Шчыра Ваш.
16.25 Ток-шоў "Кар'ера".
17.00 Мультсэрыял "Горац".
17.30 Дог-шоў. Я і мой сабака.
18.30 М/ф "Новы Адэон".
19.45 Доктар Кут.
20.00 Надоечы.
20.45 Лялькі.
21.35 М/ф "Багацьце".
23.40 Трэцяе вока.
0.25 Начны канал. "Плэйбой".

Нядзеля, 18 жніўня

Беларускае тэлебачаньне

8.00 "Варвара-Краса, Доўгая Каса". М/ф.
9.20 "Конан".
9.45 Тэлебом.
10.15 Найлепшыя хіты MTV.
10.45 Усё нармальна, мама!
11.15 Тураб'ектыў.
11.35 Канцэртны сэзон.
12.25 "Разгорнутая кніга". С. 2.
14.00 Сяляне.
14.30 Усе мы родам зь дзяцінства.
15.30 Вяршыня сьвету.
15.50 Аўта-парк.
16.05 "Крок".
16.45 "Дзікі поўдзень".
17.15 Тэатар у крэсьле.
17.55 Абібок.
18.25 "Васа". С. 2.
19.40 Калыханка.
20.00 Рэзананс.
20.50 Спартовы тэлекур'ер.
20.55 Навіны ТВ.
21.10 Ток-шоў "Карамболь".
21.30 "Фані і Аляксандар". Ч. 2.
23.00 Аксамітавы сэзон.

ОРТ

7.00 Тыраж "Спартлято".
7.15 "Харобры шавец". Мультфільм.
7.45 М/ф "Пакуль шалее мара".
9.00 Навіны.
9.15 "Недарожныя зацемкі" Д.Крылова.
9.30 Пакуль усе дома.
10.10 Ранішняя зорка.
11.00 "Служу Расеі!"
11.30 Грай, гармонік любы!
12.00 Паломніцтва Патрыярха.
12.25 Відавочнае неверагоднае.
12.55 Сьмехапанарама.
13.30 "Таямніцы пірацкіх скарбаў".
14.00 Навіны.
14.20 "Зоркі опэры".
15.10 Клюб падарожнікаў.
15.55 Неяк раз.
16.10 Мультфэервэрк.
16.50 Фільм "Віктар Цой".
17.15 Шчасьлівы выпадак.
18.05 Клюб "Белы папугай".
19.00 Час.
19.40 М/ф "Два мулы для сястры Сары".
21.45 Футбольны агляд.
22.15 Навіны.
22.25 Каханьне зь першага погляду.

Канал "Расея"

7.00 "Мітурычы". Д/ф.
7.20 "Мак і Матлі".
7.45 Мультфільм.
8.30 Вуснамі дзіцяці.
9.00 Футбол бязь межаў.
9.30 Прысяга.
10.00 Весткі аб адзінаццатай.
10.15 Расейскае лято.
10.55 Гукавая дарожка.
11.50 Мультфільм.
12.00 Прасьцей за простае.
12.30 Кнігарня.
13.00, 22.55 Весткі.
13.20 "Эй, ухнем!".
13.35 Чалавек на Зямлі.
14.05 "Квіні". С. 4.
15.00 Расейскае караоке.
15.20 У сьвеце жывёлаў.
15.45 Імпэрыя гульняў.
16.40 Рапартэр.
17.00 Чароўны сьвет Дыснэя.
17.55 Кліп-антракт.
18.00 "Мая Адэса". Спэкт.
19.00 Люстра.
19.55 Надвор'е на заўтра.
20.00 Улюбёныя камэдыі. "Дайце кнігу скаргаў".
21.35 "Фрак народу".
22.25 У Ксюшы.
23.10 Рэк тайм.
23.25 "Небясьпечны дотык". М/ф.

СПБ

9.55 Сабор.
10.20 Стыль жыцьця.
10.35 Увесь гэты цырк.
10.55, 12.55, 14.55, 16.55, 18.55, 20.55 Інфарм ТБ.
11.10 Асабістая справа.
11.40 Яшчэ адна Расея.
12.40 Мультфільм.
13.10 "Скарб рыцара Мілоты". М/ф.
14.30 Прасцэніюм.
15.10 Мэтамарфозы опэры.
15.50 Казка за казкай.
16.25 "Дзіцячы альбом".
17.05 Спартовы агляд.
17.30 "Сюкаку Такагава – майстар гульні ў Го". Д/ф.
18.00 "На хвалях памяці".
18.20 У небе Пецярбургу.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.30 "Тры плюс два". М/ф.
21.10 Ноў смокінг.
21.45 Мультфільм.
21.55 Міжнародны агляд.
22.25 "Поўня". М/ф.

IV канал, НТВ

6.00 М/ф "Валадар джунгляў". С. 1
6.25 "Авіяпошта".
7.15 М/ф "Бэрта па мянушку "Таварны вагон".
8.40 Д/ф "Загадкі Бібліі".
9.00 М/ф "Новы Адэон".
10.10 М/ф "Багацьце".
12.10 М/ф "Начны госьць".
13.05 Надоечы.
13.40 Лялькі.
15.00 Але-ап!
15.30 Багема.
16.25 Дывэртысмэнт.
17.00 "Горац". С. 3.
17.30 "Сто да аднаго".
18.00, 21.00 Сёньня.
18.30 Д/ф "Канец белых атаманаў".
19.30 М/ф "У папа быў сабака..."
21.40 М/ф "Дзікая штучка".
23.40 Аўтагонкі "Індыкар".

гаспадарка
МІКРАХВАЛЕВЫЯ ПЕЧЫ



Хуткая хваля валодае цэлым шэрагам карысных якасьцяў, якія ператвараюць яе ў ідэальнага партнэра пліты й духоўкі: ежа ў ёй хутка разаграваецца, замарожаныя прадукты хутка размарожваюцца, многія віды харчаваньня гатуюцца хутка і з эканоміяй энэргіі, захоўваючы харчовыя ўласьцівасьці прадукту.

Зь мікрахвалевымі печамі разнастайнае формы мы сутракаемся штодня. Дактары скарыстоўваюць іх дзеля цеплавых працэдураў, на іхнай аснове працуюць радарныя сыстэмы, а тэлебачаньне перадае зь іх дапамогай свае пярэстыя "малюнкі". Яны роднасныя радыёхвалям, бачнаму сьвятлу й рэнтгенаўскім праменям. Хутка падаграваць прадукты мікрахвалі могуць дзякуючы сваёй асаблівай уласьцівасьці: электрамагнітныя хвалі разганяюць малекулы ў ежы. У вар'яцкім тэмпе малекулы носяцца туды й сюды й цяруцца адна аб адну. Цяпло пры гэтым узьнікае хутчэй, чым пры перадачы цяпла звычайным чынам.

Наколькі бясьпечныя печы?

Вытворцы мікрахвалевых печаў павінны забясьпечваць, каб хвалі практычна не пакідалі мэталёвы корпус. Два засьцерагальнікі дзьверак, якія працуюць незалежна адзін ад аднаго, адразу ж адключаюць мікрахвалевую энэргію, як толькі дзьверцы адчыняюцца. Акрамя таго, печы павінны быць сканструяваны такім чынам, каб пры іхнай эксплюатацыі толькі невялікая колькасьць энэргіі трапляла вонкі. Гэта так званая норма ўтоку. У Нямеччыне яна не павінна складаць болей за 5 міліватаў на квадратны сантымэтар пры вымярэньні на адлегласьці 5 сантымэтраў ад печы. Тэсты паказалі, што мікрахвалевыя печы бязь цяжкасьці захоўваюць гэты паказьнік. Нават калі печы ўжо доўгі час служаць на кухні, гаспадару ня варта турбавацца што да выхаду мікрахваляў. Печы й праз гады застаюцца гермэтычнымі, калі за імі адлаведным чынам даглядаюць і яны не пашкоджваюцца, напрыклад, з-за падзеньня. Бездакорна функцыянуе ва ўсіх мадэляў і мэханізм дзьверцаў. Гэта нядзіўна, бо вытворцы мадэлююць іхны абумоўлены ўзростам знос. Печы павінны вытрымліваць 100.000 адчыненьняў дзьверцаў без усялякае шкоды, і пасьля таго не павінны мець павышаную норму ўтоку. Гэта адлавядае прыблізна 30 гадам працы! Пэрыядычнае зьяўленьне паведамленьняў пра няшчасныя здарэньні зь мікрахвалевымі печамі ня мае, звычайна, нічога агульнага зь недастатковай бясьпекай прыбора, а зьвязана найчасьцей зь няўважлівым ці няслушным абслугоўваньнем. Няведаньне асаблівасьцяў мікрахвалевай печы таксама можа прывесьці да непрыемных наступстваў. Таму асабліва важна добра вывучыць прыбор і пэдантычна трымацца правілаў бясьпекі.

Ці шкоднае гатаваньне ежы ў мікрахвалевых печах?

Часта зьяўляюцца паведамленьні з папярэджаньнямі пра магчымую небясьпеку для здароўя, зьвязаную з гатаваньнем ежы ў мікрахвалевых печах. Скептыкі баяцца нават ракавых захворваньняў і іншых нетэрмічных узьдзеяньняў. Яны кажуць пра "прамянёў-забойцаў" і пра тое, што прадукты, якія падпадаюць пад узьдзеяньне мікрахваляў, губляюць тым самым сваю харчовую карыснасьць і натуральныя якасьці.

Адзін факт нельга аспрэчыць: калі мы падставімся пад непасрэднае ўзьдзеяньне мікрахваляў, без абарончага прыбору, нам сапраўды будзе нанесена шкода. Але гэтага ніхто ня робіць. У колах адмыслоўцаў зараз вядуцца спрэчкі, ці ня зьнізіць паказьнікі нормы ўтоку, каб супрацьдзейнічаць магчымым уплывам на чалавека. Для печаў такое зьніжэньне паказьнікаў ня склала б праблемаў, бо яны ў іх і так намшмат ніжэйшыя за норму.

Для хваляваньняў, што мікрахвалі могуць акрамя цеплыні выклікаць іншыя, нетэрмічныя эфэкты, няма аніякіх падставаў. Таму нават самыя абазнаныя крытыкі ня раяць адмаўляцца ад набыцьця мікрахвалевых печаў. Што да адмоўных зьменаў харчовай карыснасьці, да цяперашняга часу гэтаму няма ніякіх доказаў. Зь іншага боку, мікрахвалі могуць у шматлікіх выпадках дапамагчы захаваць гэтую каштоўнасьць: пры тым, што час разагрэву й гатаваньня ежы звычайна карацейшы і ежа гатуецца зь меншай колькасьцю тлушчу й вады, чым у рондлі для варкі, таму й прыгатаваньне ежы ў мікрахвалевай печы больш ашчаднае.

Наша выснова: дарагія – не найлепшыя

13 выпрабаваных асобна ўсталяваных печаў з аб'ёмам да 32 літраў патрабуюць больш плошчы для ўсталяваньня на кухні, чым меншыя кампактныя мадэлі. Зь іншага боку, болей месца ўнутры печы. Туды звычайна зьмяшчаецца буйное начыньне. "АЭГ Мікрамат 740" і "Баўкнэхт МВС 1832" у гэтым дачыненьні ідуць наперадзе іншых, маючы карысную плошчу ў камэры для прыгатаваньня ежы памерам 1600 квадратных сантымэтраў. У іх, напрыклад, можна паставіць побач дзьве ня надта вялікія талеркі. Значна цясьней у такіх мадэлях, як "Голдстар", "Хітачы", "Мулінэкс", "Квэле" і "ТЕК", у якіх плошча дна займае меней за 1000 квадратных сантымэтраў. Вялікая талерка памерам 31 х 28 см у іх ня зьмесьціцца. Зьвесткі пра аб'ём толькі прыкладна даюць уяўленьне, колькі месца ёсьць для прыгатаваньня ежы. "Голдстар ЕР-6513 Д" мае, напрыклад, пры аб'ёме 25 літраў карысную плошчу дна ў камэры для прыгатаваньня ежы толькі 784 квадратных сантымэтраў. А "Электралюкс", зь іншага боку, пры аб'ёме "толькі" 21 літар на 300 квадратных сантымэтраў болей.

Сярэдняя якасьць на талерцы

Якімі б вялікімі ні былі б адрозьненьні ў кошце й зьвязанымі зь ім паказьніках накшталт колькасьці ватаў, колькасьці ступеняў пераключальніка, магутнасьці ці памеру, пры практычных спробных прыгатаваньнях ежы і ў агульнай ацэнцы ніводная з выпрабаваных мадэляў не паказала выніку вышэйшага за "задавальняльна". Найлепшыя вынікі паказваюцца пры варцы. Мясны рулет і цеста ў аднолькавай ступені "добра" ўдаюцца ў печах "Баўкнэхт", "Панасонік", "Квэле", "Шарп" і "ТЕК". У іншых, звычайна, мы не былі так задаволены якасьцю цеста. Для размарожваньня мы скарыстоўвалі мяса й труская́кі. Адносна ашчадна што да садавіны працуюць "Бош", "Голдстар", "Мулінэкс", "Панасонік" і "Сіменс". Іншыя порцыі выглядалі хутчэй пасрэдна, яны былі часткова неразмарожаныя, а ў некаторых месцах ужо кашападобныя. Асабліва выразна праявілася здольнасьць хваляў разьмяркоўвацца ў камэры, каб раўнамерна трапляць на прадукты з усіх бакоў, пры размарожваньні з наступным разаграваньнем. Кідаліся ў вочы рэзкія адрозьненьні ў тэмпэратуры ў печах "Электралюкс", "Голдстар", "Шарп" і "ТЕК". Напрыклад, у рыбным філе тэмпэратура ў асобных месцах была на 20 ці нават 30 градусаў вышэйшая, чым у іншых месцах. Нават адстойваньне філе на працягу трох хвілінаў не магло выправіць гэтую нераўнамернасьць.

Выпрабавальныя стравы гатаваліся з карэкцыяй часу, каб выключыць недакладнасьці гадзіньнікавага мэханізму й стварыць такім чынам аднолькавыя ўмовы для ўсіх мадэляў. На жаль, многія гадзіньнікавыя мэханізмы працуюць досыць недакладна. Адхіленьні звычайна складаюць толькі некалькі сэкундаў. Аднак якраз у ніжніх пазыцыях пераключальніка, калі печ павінна працаваць толькі некалькі хвілінаў ці нават трыццаць сэкундаў – бо дадзены прадукт большага не пераносіць ці сокі становяцца занадта гарачымі – гэтыя невялікія адхіленьні адыгрываюць значную ролю.

З грылем дадаткова

Купляючы "Мулінэкс ФМ 2945" ці "Хітачы МР 7970", адначасова зь мікрахвалевай печчу Вы купляеце грыль. Гэтыя печы ў нашым разуменьні яшчэ ня ёсьць сапраўднымі камбінаванымі мадэлямі з сапраўднымі духоўкамі. Аднак зь іх дапамогай можна зрабіць, вядома, больш, чым з чыста некамбінаванымі мадэлямі. Грыль у "Хітачы" працуе толькі пры адключаным мікрахвалевым рэжыме. Тым самым усё, трапляючы туды, выраблěецца як грыль. Акрамя таго, можна, напрыклад, прапякаць супы ці запяканкі, прыгатаваныя да гэтага ў мікрахвалевым рэжыме. На жаль, вытворца ў інструкцыі да эксплюатацыі ня кажа, што грыль і мікрахвалевая печ ня могуць працаваць, як у "Мулінэксе", у адным рэжыме.

Простае абслугоўваньне

Пры штодзённай важданіне на кухні найлепшае ўражаньне паказалі печы фірмаў "Баўкнэхт" і "Сімэнс". Аднак зь іншымі печамі праца ў цэлым ідзе спорна. Пры наяўнасьці невялікай колькасьці клявішаў і пераключальнікаў гаспадыні цяжка зрабіць шмат памылак. Дзьверцы, якія адчыняюцца ўніз ці ўбок, пераключальнік круглы, як у духоўцы, ці ў выглядзе кнопак – гэта хутчэй пытаньне густу. Зручныя ўсе гэтыя варыянты. Таксама можна аднесьці да сфэры асабістага выбару пытаньне: выбраць мадэль з асобным пераключальнікам ці печ павінна ўключацца аўтаматычна пасьля таго, як зачынены дзьверцы й пастаўлены неабходны час і г. д.

Наша парада

Аніводная з выпрабаваных печаў ня можа быць параена без агаворак. Толькі чатыры віды печаў ("Бош", "Мулінэкс", "Квэле" і "Сіменс") пераадолелі дыстанцыю бяз зрываў, аднак і яны ў цэлым маюць пасрэдны ўзровень.

Усе іншыя выпрабаваныя мадэлі маюць болей ці меней недахопаў, нават тыя, што паказалі адносна добрыя вынікі. У "Міле М 712" і "Панасоніка НН 6200", напрыклад, толькі вельмі недакладна працуе гадзіньнікавы мэханізм. "Баўкнэхт МВС 1832" і "Сімэнс ХФ 32022" найлягчэй абслугоўваць. Роднасная "Сімэнсу" мадэль "Бош" мае нязручны пераключальнік, з-за чаго ў графе "карыстаньне" пастаўлена толькі "задавальняльна".

Каму трэба шмат месца ў печы, той найхутчэй выбера "АЭГ Мікрамат 740" і "Баўкнэхт МВС 1832". Пры кошце ў 700 марак гэтыя печы каштуюць столькі ж, як і самая танная мадэль з грылем ("Мулінэкс ФМ 2945").

Хіт-сьпіс мікрахвалевых печаў

З пазначэньнем сярэдняга кошту ў нямецкіх марках

Печы бяз грылю
1. АЭГ Мікрамат 740 699,-
2. Баўкнэхт МВС 1832 699,-
3. Бош ХМТ 830 А 607,-
4. Электралюкс НФ 4031 488,-
5. Голдстар ЕР-6513 Д 299,-
6. Міле М 712 1048,-
7. Панасонік НН 6200 499,-
8. Квэле Прывілег № замовы 000.776 399,-
9. Шарп Р-5В 11 478,-
10. Сіменс Хф 32022 599,-
11. ТЕК 5008 369,-

Печы з грылем
12. Хітачы МР 7970 771,-
13. Мулінэкс фМ 2945 699,-

Старонка вершаванага радка



ЮРАСЬ ПІВУНОЎ

Паласа непаніцаваньня
У жыцьці,
З хваравітаю сьвядомасьцю
Ў быцьці,
І спакою не прадбачыцца
Нідзе,
Круті радасьці зьнікаюць
На вадзе...
У краіне роднай
Д'яблы правяць баль,
Зь беларусаў шмат хто
Верыць ім, на жаль,
І з тупой пакорай
Йдзе на згубу люд,
І забыліся усе
На Страшны Суд...

+++
Як многа трэба чалавеку,
Як мала хочацца душы,
Праз усё жыцьцё зьвіняць манэты
І вораг хіжы на мяжы.
За трыццаць срэбранікаў д'яблу
Душу прадаць, а потым што ж...
Згібееш ў церніях жыцьцёвых,
Сталееш ў прысак... Аняго ж?!
Шукацьмеш потым ратаваньня,
Але ня знойдзеш — не шукай,
Бо Богу здрадзіў і Радзіме —
Ў пакутах стогне родны край.
Чужы акраец дзярэ глотку,
Ды і майно не на карысьць,
Прадаўшы родную старонку,
Хіба ты маеш права быць?..

ЗЬМІЦЕР МАНКОВІЧ

С.Адамовичу

Устал поэт слагать стихи,
Писать уже не хочется.
Когда вокруг "ха-ха", "хи-хи",
Какое, к чёрту, творчество?
Его стихи — воды ушат
На головы политиков —
Понять не могут, не хотят
Любви страданий нытики.
А он не мог, а он не смел
Остаться в равнодушии
И, надрывая голос, пел:
"Теряем наши души мы!
К чему "фламинго розовый"?"
Но не окончена строфа
Про Павлика Морозова.
Поэт устал, поэт не смог
Бороться с конъюнктурою.
Когда вокруг душевный смог,
В чести стихи с "амурами".
Но на листе остались там
Две строчки как занозою:
"Свою страну мы предаём,
Мы — Павлики Морозовы..."

ТАЦЯНА СЬНІТКО

Нешта здарылася на зямлі.
Раптам надта спакойна стала.
Хоць і бураў наўкол нямала,
Толькі рэхам яны адышлі
У тое лета, што ўжо мінавала.
Адляцела, удаль адплыло.
Больш ня вабіць празрыстае неба.
Ні сьвятла мне, ні ветру ня трэба,
Як нічога з таго, што было.
Я чакаю сівога дажджу...
Лістапада туманнаю мрояй
Ён блукае парой вечаровай —
Нікуды яе не адпушчу.
Адлюструецца ў небыцьці,
Зачаруецца сумнай пяшчотай.
І заплача, шапнуўшы ўпотай:
"Нешта здарылася ў жыцці..."
Што? Ня трэба! Я не хачу!
Не пачую, не азірнуся.
Жоўты ліст адлятае ў скрусе —
Нікуды яго не адпушчу...
Можа стацца, яшчэ вярнуся?..
1995

АЛЯКСЕЙ ЗГАРОДЗІЧ

СОН РОЗУМУ

Гэй ты, ціхі народ,
Ты у роспачы зноў.
Церпіш зьдзекі брыдот,
Зьневажаеш сыноў.
Розум твой яшчэ сьпіць,
А мо анабіёз
Намаглі нам зрабіць,
Каб ніхто не ўваскрос?!
Чаго ж, братка, ты так
Галаву нахіліў...
Напушчаў ваўкалак
Ці ты што падхапіў?..
Падхапілі мы ўсе
Несьвядомасьці СНІД
І жывем як у сьне
Пажылых пірамід.
Бальзаміраваў бацька вусаты сьвінцом
Тэлевізар сьмярдзіць прэзыдэнцкім хляўцом!
Як прасіўся на трон,
Шмат чаго абяцаў:
"Будзем есьці мясную зацірку".
А калі ж атрымалі — прамоўны булён,
Ды з расейскага бубліка дзірку.
Не з прабіркі — з калхознага гора
З разьмяркоўскай сыстэмы райка
Вырас гэты, савецкі мутант,
А цяпер ён свабоды гарант,
Да баланды прывёў і пайка...
А сон Розуму — зьява страшней,
Чым палотны Францыска Гоі...
Нараджэньне яго звар'яцелых ідэй
Будзе горш дыктатуры зброі...
Не цярпі, Беларусь, паглумленьня сьцягоў!
Не цярпі, Беларусь, захлусеньня прамоў!
На Купальле я чую пілітаўскі роў...
Ад люстэрка скрывелага выпадзіў Шклоў
Ваўкалацкую горную кроў...
1996

АЛЕСЬ ПАДНЯБЕСНЫ

Славаміру Адамовічу ахвярую

Жыву ў краіне, дзе забіваюць паэта
За слова — сьветлы агмець у грудзях,
Дзе для набрыдзі ўсясьветнай
Сьвятыня маёй Бацькаўшчыны — жах.

Жыву ў краіне, дзе мёртвым з-за кратаў
Толькі адна паэту дарога,
Дзе правяць свой баль недавяркі і каты
І душаць усё, што ад Бога.

Жыву ў краіне, дзе любяць да сьмерці
Паэты свой горкі зьняведаны край.
Мой браце — паэт, ужо нікому ня сьцерці
Верша твайго. Дык жыві. Не канай.

ПЯТРУСЬ БАРАВІК

МАЯ ДОЛЯ

Я сёньня рана ўстаў
І верш рытмаваны напісаў.
Але гэта ня верш вядома
Бо няма вобразнасьці кома.
Бо трэба цяжка рытміць
Каб кожнаму розум закруціць.
Пішу не на красу
А каб застацца на плыву.
Бо ўжо няма цярпеньня
Быццам беларус-бязьменьнік
Быццам жыцьцё не працаваў.
А ў людзей спадманам краў.
Тады слухай каз
На маім жыцьці "памаз"
Як жыву цяпер
Не дай Бог павер.
Туды-сюды ганяюць
З працы звальняюць
З кватэры вонкі просюць
Пад самы корань косюць.
Вось так і жывецца мне
Таксама і маёй сям'е
Бо з маленства ў горы,
Языком не вярнуў горы
А працаваў ціха
Палову жыцьця ведаў ліха
Ды ўсё рукамі
Як селянін вякамі
А нехта кажыць мне,
Сам павінен у жабраце
Бо няма ў цябе многа
Рук як у Індыйскага Бога.
Аднымі сабе заграбаў
Другімі языкастым даваў
Нашто яны лепей жылі
Ды ў шаўковым шчасьці былі.
Няма ў цябе дзьве галавы
Адна дзеля ночы як у савы
Другая днём у сьвецень
Дзеля дуракоў і дзецяў
Ды няма ў цябе дзьвюх душ
Каб былі як вуж
Адна ў агідны дух
Другая на паэтычны слух.
А я дзяліцца не магу
Бо ненавіджу ўсю хлусьню,
Што мы ўсе брацьце
Ды жывём у адной хаце.
Усё ў мяне адабралі
Ды каб ня жыў дбалі
Хацелі каб у іх дудку дуў
І толькі іх голас чуў.
А я не хачу такога
Жыцьця вадкага смалянога
Хачу жыць у сваёй хаце
Ды не тапіцца ў блаце.
Хачу зямлю бацькоў
Наймець навек ізноў
Ды каб грошы вярнулі
Якія ад мяне гадамі цягнулі
За якія як той Мацей
Кармілі на сьвеце ўсіх чарцей
А мне далі закон як дышла
Дзе па-іхнаму ўсё выйшла.
Хоніць рабіць на цябе дзядзя
Бо жыву ў сваёй хаце
Працую па сваёй нагодзе
І з раднёю жыву ў згодзе.

+++
Зачмурыў мой напеў
Чорны тужань маркот
Кружаль уночку ярэў
І ўдзень душаглот
Чорнай плямай найшоў
Цела ў дужкі ўзьняў
У кроў студзёна зайшоў
Сэрца гадам зажаў
Жвавы сьвецень душыў
Сьвяты Дух выціскаў,
Поўны бездум рабіў,
У вочы сьлёзы пляскаў.
Я Ісусу ўзмаліўся
Гада з сэрца ірвануў
Зь неба зельля напіўся
Рукою зорку крануў.
Гасподзь шлях наракаў
Сьцежку прамкам па льну
У золаце Крыж ахвяраваў
На грудзях узлаўжыню.
— Будзь ты хлопец прамым
Чэсным у справе сваёй.
Даруй розным крывым,
Талент Духам узмрой.
Мне маліся штодзень
І па справе любой
Не хавайся ў цень
Ад грамады людзкой
У адзеньні грубым
Твой начатак жыцьця.
Аранауты залатым
І каруны апасьля.
29.11.92

ШАРАМЕЦЕВА ГАННА

ШПАЦЫР

Позіркам змыла свой немаўлячы цень
з муроў касьцёла сьвятога Андрэя.
Хукнула — цыбатая постаць
(я ў пару малалецтва)
растала над брукам кірмашовага пляцу.
А гэна... бач ты, што дзяўчо вырабляе:
вудаю — лыткі ў вадзе —
цягае са Шчары зыркіх платвічак.
Здалу Даўор. Палюе на блох і чакае
скончу, дык пачастую злабычай.
Махнула рукой. Палалися далёка-высока,
я (ногі у цыпках), вуда, вядзерца, платвіцы,
чэрві, бляшанка, сабака, сабачыя блохі,
белая кропелька сьліны з малінавага языка,
зьнямоглага ў чаканьні начосткі.
Савецкая, Чырвонаармейская, Антэчны
завулак.
Нарэшце — Жыровіцкая. Зьдзьмухваю пахі.
Рошчына — нашае кухні.
Сырадой — Папкевічы.
Мяявая слодыч бэзу — Шэўчыкі.
А гэна імклівы пранізьлівы палкі спакусьлівы вір —
Казіцкія прэжаць каву. Ступаю ў бок школы
(школа — такая нуда).
Ого!
Захапленьне і страх.
Сэрца тахкае ў горле. Холад вышэй жывата.
Лежачы на траве, зазіраем — я,
Ванда і Чэсь —
у сутарэньне за іхняй сядзібай.
Бруд і друз. Залатое рызьзё. Рэшткі
покрываў.
Разадраныя кнігі.
Сьцены канчаюцца ўпоравень з намі.
(Дзьму ў далонь. Далёка-высока
адлятае і гэны аскепак майго існаваньня.)
Былая радзільня. У ёй я зірнула на сьвет
першы раз у жыцьці. Калісьці
будынак належаў роду Агінскіх. Цяпер
тут новая шыльда:

СЛОНИМСКИЙ РАЙОННЫЙ
КОЖНО-ВЕНЕРОЛОГИЧЕСКИЙ
ДИСПАНСЕР.

Мэмарыяльная дошка вандалаў.
Насоўкай сьціраю свой ценік са сходаў.
Ён матляўся тут з дня,
калі ўпершыню мяне ўбачыў тата.
У Слоніме пахне хлебам.
Сёньня саракавіны, як я памерла.

АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

ГЛЫБОКАЕ

1
Глыбокае —
гэта ёсьць маёй прапульсіяй
гэта ёсьць маёй Беларусяй
сваёй, як мясцовы быльнёг
і цёплыя словы вітаньня
Глыбокае
ёсьць маёй глыбінёй
усебаковасьцю
гэта мой горад
мая глыбіня
Глыбокае
ёсьць глеба маіх продкаў
а таксама глеба маіх шуканьняў
і нават калі мне няўтульна
я шукаю смутак у глыбокім

2
сёньня я твой мой горад
я твой Доркфулфт
ты маё натхненьне
мой бэтонны стэп
ты мой Пляц Францыска
мара, якая можа ня зьдзейсьніцца
але ў якую так хочацца верыць
Глыбокае
ты мой аркуш
які ў мяне штодня намагаюцца адабраць
але ты
як папера зацялася ў друкарцы
моцна ўчапіўся за маю падсьвядомасьць

3
часам з маіх вокнаў
павявае Сартрам
я адчуваю сябе дзіркай у прасторы
а твае людзі ў натоўпе,
чорныя кубікі
на віртуальным абшары
як і ў кожным горадзе
тут жывуць людзі
але
вельмі няшмат зь іх
можна назваць падсьвядома тутэйшымі

4
Глыбокае
ты стаіш паміж мурамі
ЛІТВОЙ і БЕЛАРУСЯЙ
краінай-марай
і краінай-нератам
Глыбокае
ты
мой шлях да Вільні
надзеі
паўночна-заходні кругагляд
Глыбокае
на тваіх ваколіцах
лунае дух Власта
і адраджэньня Ізраіля
мы с табой
узбудуем свой Ерусалім

ІГАР ЛІСТАПАД

+++
Сёньня чыесьці сьвята.
На будынку райкама
Сьцяг лунае
Дзівосны.
Людзі, хто вы?
Вар'яты?
Бел-чырвона-
-белая пляма
На сумленьні ў вас.
Вам ня млосна?
У кветках шыхт вэтэранаў.
Задаволенасьць твараў.
Бо з сучасным
Яны пераможцы.
"Сьветлым учорым" вы нам
Невылечныя раны
Натварылі.
Мы вашы заложцы.
Калі толькі чырвонасьць
У азлобленьні зялёным
У маёй Бацькаўшчыне
Мае рацыю.
Гэта значна — адно!
Што?
— Манкуртва!
— Шалёнасьць!
Гэта значна для нас
— АКУПАЦЫЯ!?
Сёньня чыесьці сьвята.
Што мяне не датычыць
Каб ня пэцкаць
Сумленьня.
Чым мой край вінаваты?
Аб сапраўдным ён Жыча
Сьвяце
З назваю — Дзень вызваленьня!

АЛ. ТРАФІМ.

Прысьвячаецца маёй сяброўцы Але Афаневіч

БЯГУЧАЯ З ЛАЎСАНУ

У магілёўскім слаўным месцы,
На правым беразе Дняпра,
Дзе кветкі жаніхі й нявесты
Кладуць народным змагарам,
Стаіць самотная дзяўчына,
Застыўшы ейны бег навек.
На фоне завадзкога дыма
Яе наставіў чалавек.
Як крылы, распасьцёрты рукі,
Да неба ўзьняты гожы твар.
Здаецца, зробіць адзін рух
І птушкай узьляціць да хмар.
Ды толькі бронза не фанэра,
Ўсё, што здаецца, толькі мана.
А ўсё ж з надзеяю і верай
На Магілёў глядзіць Аксана.
Гады бягуць, як быццам людзі
На плошчы ўвечары дамоў.
Ня чулі сэрца яе грудзі,
А вусны палымяных слоў.
Не закрываў ёй сон павекі
І стома не кранала стану.
У слаўным горадзе Машэкі
Стаіць бягучая з Лаўсану.
15.02 — 25.03.96

ЯЗЭП ВІСАРЫЁНАЎ

КРУЦЕНЮ Й КРУЦЯЛЮ!

"Добры дзень, таварыш прэзыдэнт!
У чарговы раз табе, пранырa,
(Што, не спадабаўся камплімэнт?!)
Свае думкі выкажу я шчыра.
Зноў табе, шахрай, не да мяне!
Я ж сранюк, а не пасол замежны.
Курпаўся ж калісьці й ты ў сраньне,
А цяпер, — пры сьвітцы беласьнежнай!
За руку вітаўся, як браток,
Мужыкоў вясковых быў ты варты,
А цяпер жывеш, нібы панок,
Нават і ядліць ня йдзеш бяз варты!

Што датычыць мафіі, — яна, —
Кажуць у народзе, — бесьсьмяротна
І непераможна, як мана!
З думкай гэткай я, бясспрэчна, згодны.
Мне адзін хваліўся патрыёт,
(Дзед ягоны з нацыяналістых)
Што, маўляў, хавае кулямёт
У мясцох дрыгвяных і лясістых.
Дзед ягоны зырыцца на лес
І вяскоўцам задуменна кажа:
"Беларус, — нязломны як чаркес!
Пачакайце! Хутка прыйдуць нашы!"
Мае ўзрост ён каля ста гадоў,
А нібы хлапчына зухаваты,
Недзе сьцяг "нацдэмаўскі" знайшоў,
Сам замацаваў яго над хатай!

Сьцяг, які на вільчык, як на шпіль,
Я прыцьвікаваў калісь над дахам, —
Закаўкаскі хват украў, — Шаміль, —
"Вы, — маўляў, — ня вернікі Алаху!"
Кавуны прывозіў ён сюды,
Гандляваў у вёсцы нібы бэк той.
Выкраў сьцяг!!! Дык гэта ж паўбяды, —
У "Турстан" уцёк з маёй кабетай!!!
Ён жа — бэк! А я — дурны "чучмэк"!
У яго "зайцы" ёсьць і даляры.
А ў мяне?! Апошні нават чэк
На маёмасьць "скінуў" на базары!
Збыў цялушку летась я ў саўгас,
Выгадаваў я яе як трэба,
Марыў: "Грузавік набуду — "МАЗ"!"
А купіў — бутэльку з лусткай хлебу!!!
Абхітрылі зноў, як жабрака.
Год амаль марынавалі грошы.
А дырэктар — Круцялёў Лука,
Як раней, жыве сабе ў раскошы!
Збудаваў вялізны асабняк.
На "шышы", — спытай цяпер, — якія.
Ён панок, як ты, — а я — басяк,
П'ю гарэлку я, а ён — "Тракію".
Я смалю штодзённа самасад,
Ён жа, шэльма, курыць "Прэзыдэнта"!
Што й казаць, — народны дэпутат,
Гонар наш і нашая легенда!

Калі справы пойдуць так далей, —
Я падамся ў лес да партызанаў.
Ёсьць яны ў лясох, як і раней, —
Зьехаліся з усіх мэрыдыянаў!!!
Маюць сувязь і надзейны схоў,
Кулямётаў шмат і аўтаматаў.
Ёсьць і генэрал у спадароў, —
Зь лесу выйдуць хіба што з загаду!

А яшчэ яны, як і ў вайну,
Маюць штаб краёвы ў абарону!
Вось цяпер і разважай: "Ды, ну!!!", —
Пра Расею й сінюю карону!"
21 жніўня 1995 году

КУЛІК МІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ

ЖУРБА

Ой не любят меня
Ну не любят меня
А ведь я всенародна абраны
Все ругают и бьют
Гаварат, што убьют
В туалет не схадить без ахраны
Мой папанька-кабель
Сунул рубь в калыбель
И уцёк, а куда — неизвестна
Безотцовщына я
Пажалейте меня
Я харошы, а главнае — чэсны
Непонятный народ
Вроде ж я не урод
И усы, и прычоска, и галстук
Я и флаг им вернуў
И рубель тармазнуў
А ани всё: "Калхозник брахастый!"
Я ж цярплю, я ж маўчу
Я ж как лучшы хачу
Мы жа нефть нахаляву палучым
Мы ж — славянски саюз
И чэчэн, и тунгус
И татарын, и манси, и чукча
Несматра на закон
Мы устроим разгон
Всем знавцам, пазьнякам и цихиням
А карупцыи — бой
Всех варов — на убой
У жывых никаго не пакинем
Вот ат этих газет
Мне спасения нет
Будта мухи — всё гадят и гадят
То тиран я, капчэй
А то Гитлер, вабшчэ
Ничэго, мы их тожа пасадим
Ну, пара выступаць
Нада што-та сказаць
Штобы люди услышали праўду
"Мы..вам..всё..их..сейчас
Я тут..эта..как раз
Все дурныя, а я самый главный!"

ВІКТАР ШОСТАК

БАЛІЦЬ ДУША

Не лічы, зязюлька, мне гады.
Не жадай удачы і спакою.
Ты ня знаеш, як баліць душа
Хмураю асеньняю слатою.
Ты ня знаеш, як сярод бяроз
Стыне вечар ў сіняве туману
І бывае крыўдна мне да сьлёз
Ад няпраўды, горычы падману...
Прыляціш ты зноўку па вясьне,
Заблукаўшы ў зелені бяроз,
Зноў пачнеш прарочыць шчасьце мне,
Доўгія гады і іншы лёс.

ГАННА ДВАРЭЦКАЯ

МЕНСКІ ГЕРБ
Паданьне

Як звычайна спаў горад уночы.
Калыхала матуля дзіця.
Толькі бляск нейкі ўдарыў у вочы,
Пазбаўляючы ўсіх пачуцьця.
Асьвяцілася раптам неба,
Пасьвятлела, як вокам ні кінь.
Нібы хто запаліў на патрэбу
Мільёны зарнічак-вяргінь.
Стала жудасна ціха навокал
Не плёшчыцца болей рака.
Нібы крылы раскінуўшы сокал,
Бегла к рэчцы людзей талака.
І спынілася, скамянела.
Ніхто слова ня кінуў ў прастор —
Усе глядзелі на цуд той зьнямела,
Што ляжаў нібы ў сэрцы дакор.
Прытуліў да сябе бераг рэчкі
Цудадзейны сьвяты абразок
Маткі Божай Марыі, бяз спрэчкі,
І некрануты быў там пясок.
Нібы зь неба спусьцілася к людзям
З херувімамі Панна тады,
Каб сказаць ім, што шчасьце будзе,
Уратуюць што Менск ад бяды.
І схіліліся мужны галовы
Перад воляй ўсявышняй багоў
Прыкланіцца калені гатовы,
Рукі даць хочуць многа дароў.
Толькі дарам ад гораду стала,
Што стаў гербам сьвяты абразок.
І да сёньня мінае навала.
Горад наш
Ты ня згодзен, браток?
Дык прыйдзі ты ў храм той да Бога —
Не сьцяжэе ад крыжа рука.
Памаліся, і згіне трывога
Як нячысьцікі ад абразка.
1992

12.08 – 18.08

КІНО. МЕНСК

АЎРОРА

Прытыцкага, 23, тэл. 533-360, 533-361

Чужы 12-18 – 16.00 (ільготны)

Вулічны прыгажун (камэдыя) 12, 15-18 – 18.30, 20.30; 13-14 – 18.30 (ільготны), 20.30

Для дзяцей:

Слугі д'ябла 12-14 – 14.30

Целаахоўнік 15 – 11.00, 14.30; 16-18 – 14.30

БЕРАСЬЦЕ

пр. газэты "Праўда", 25, тэл. 728-660, 716-888

Ван Дам – кікбаксэр 12, 14, 18 – 14.30

Небясьпечная гульня 12-15, 18 – 16.00, 19.00, 20.30; 16-17 – 16.00, 19.00

Інфармацыйна-забаўляльная праграма 16-17 – 20.30

ВІЛЬНЯ

Каліноўскага, 55, тэл. 655-262

Адшукваецца герой (дэтэктыў) 12-18 – 15.00 (ільготны), 21.10

Наша гісторыя (у галоўных ролях А.Дэлён і Н.Бэй) 12-18 – 18.00

Спакушэньне-2**** 12-18 – 16.45, 19.50

Кіна-дыска-шоў для падлеткаў 18 – 15.00

Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Ўсьмешка" 13, 17, 18 – 21.00

Танцавальны вечар "Для тых, каму за 30" 16 – 20.30

ЗЬМЕНА

Даўгабродзкая, 4, тэл. 353-903

На каго Бог пашле (лірычная камэдыя) 12-18 – 14.00, 18.00

Паліцыянт і дзяўчына (баявік) 12-18 – 16.00, 20.00

Для дзяцей:

Залатыя рогі 14 – 10.00; 17-18 – 12.00

КАМСАМОЛЕЦ

Жылуновіча, 39, тэл. 454-194

Ваўчыца 12-18 – 12.00, 15.00

Максымальнае паскарэньне 12-18 – 17.00, 19.00, 20.30

Мужчына лёгкіх паводзінаў 12-18 – 16.00, 20.20

Заля індыйскага фільму "**Храм каханьня**" (2 сэрыі) 12-18 – 14.00, 18.00

Для дзяцей:

Котка, якая гуляла сама сабой 12-14 – 10.30

Збор часопісаў "**Ералаш**" 15-16 – 10.30; 17-18 – 11.00

КАСТРЫЧНІК

пр. Ф.Скарыны, 73, тэл. 329-325, 329-429

Сэнсацыя 12-18 – 17.30, 21.00

Зь пісталетам нагола 12-16 – 19.30; 17-19 – 16.00 (ільготны), 19.30

Макс-шоў (тэл. 232-00-38) 12-16 – 22.00

КІЕЎ

бульвар Шаўчэнкі, тэл. 373-270

Жандар і жандармэткі 13-16, 18 – 15.00, 16.50; 17 – 15.00 (ільготны), 16.50

Гудзэнскі ястраб (баявік, у галоўнай ролі Б.Ўіліс) 13-18 – 18.40, 20.30

Відэапаказ 12-18 – 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00

Для дзяцей:

Заяц, які любіў даваць парады і іншыя мультфільмы 13 – 13.30

Загадкавы стары 18 – 13.30

МАСКВА

пр. Машэрава, 13, тэл. 231-448, 231-533

Адзін дома-2 12-17 – 17.00; 18 – 15.00 (ільготны), 17.00

Сьляды чырвонай памады 12-18 – 19.10, 21.00

МІР

Казлова, 4а, тэл. 333-771

На залатым ганку сядзелі... (стэрэафільм) 12-18 – 12.00

Адзінаццаць дзён, адзінаццаць начэй 12-16 – 16.00, 18.00, 20.00

У холадзе начы 12-16 – 15.00, 19.00

Няма дзе схавацца 12-18 – 13.00, 17.00, 21.00

ПАРТЫЗАН

Талбухіна, 18, тэл. 663-526

Няма куды бегчы 12-18 – 17.20, 20.20

Маўчаньне вяндліны 12-18 – 16.00, 19.00, 22.00

Джэк-паскакун 12-18 – 15.00, 17.00

Кінаклюб "Гімэнэй": "**Эмануэль**" 12-18 – 19.00

Інфармацыйна-забаўляльная праграма 14-18 – 21.00

Дэнс-шоў 16-17 – з 24.00 да 7.00

ПІЯНЭР

Энгельса, 20, тэл. 278-945

Раман з камянём 12-15 – 13.40, 15.40; 16-18 – 15.10, 17.10

Раньняя сталасьць, ці Хлопчык Лявэляс 12-15 – 17.30, 19.20; 16-18 – 19.10

Для дзяцей:

Палёт у краіну пачвараў 12-13 – 10.30

Дзіўная гісторыя доктара Джэкіля й містэра Хайда 12-13 – 12.00

Віцька Шушара і аўтамабіль 14-15 – 10.30

Падлеткі ў Сусьвеце 14-15 – 12.00

Карпуша і іншыя мультфільмы 16-18 – 10.30

Памылка старога чараўніка 16-18 – 12.00

Непераможная нага 16-18 – 13.30

РАДЗІМА

Лізы Чайкінай, 16, тэл. 426-779

І сланы бываюць няверныя 12 – 15.00 (ільготны), 18.50; 14 – 18.50; 15-18 – 15.00, 18.50

Незаконнае ўварваньне 12, 13-15 – 16.50, 20.40; 16-18 – 16.50

Музычна-забаўляльная відэапраграма 14-15 – 16 – з 19.00 да 23.00

Відэазаля:

Гульні для дзяцей школьнага ўзросту (для дзяцей) 14-18 – 16.00

Падступства славы (камэдыя) 14-18 – 18.00

Схаваны лягер (камэдыя) 14-18 – 20.00

Для дзяцей:

Прынц Ходан і прынцэса Ранран 14 – 10.30; 17-18 – 13.00

РАКЕТА

Рабочы зав., 3, тэл. 260-620

Сьпіс каханак 12-14, 17-18 – 17.00, 20.00

Шалёныя ночы Клеапатры**** 12-14, 17-18 – 18.30

Вялікі прыз 17-18 – 15.00

САЛЮТ

пр. Ракасоўскага, 150а, тэл. 474-167

Спакуса 12-16 – 16.00, 19.30; 17-18 – 14.00, 17.30, 21.00

Паварот лёсу (баявік) 12-16 – 17.30, 21.00; 17-18 – 15.30, 19.00

Начны танцавальны рух 16-17 – з 21.00 да 6.00

СУЧАСЬНІК

Харкаўская, 70а, тэл. 515-563

Аднойчы ўкушаны 12-18 – 18.00

Зьвер 12-18 – 16.30, 19.30, 21.00

Для дзяцей:

Чараўнік Смарагдавага гораду 17 – 14.30

Паліцэйскі сабака 18 – 14.30

СЬЦЯГ

Вялікаморская, 3, тэл. 211-009

Чужыя-2 (2 сэрыі) 12-13, 16 – 16.30; 17-18 – 12.00, 16.30

Мастацтва каханьня 12-13, 16 – 19.00; 17-18 – 14.30, 19.00

Для дзяцей:

Трынаццатая нявеста 17 – 10.30

Шасьцёра, што блукаюць па сьвеце 18 – 10.50

УДАРНІК

Жукоўскага, 156, тэл. 259-630

Гарачыя галовы-1 12-18 – 15.30

Гарачыя галовы-2 12-18 – 17.10

Каханьне, каханьне, каханьне... (2 сэрыі) 12-18 – 18.50

Для дзяцей:

Роня – дачка разбойніка 14 – 14.00

Збор часопісаў "**Ералаш**" 17 – 14.00

Мараплаваньне Солнышкіна і іншыя мультфільмы 18 – 14.00

ЦЭНТРАЛЬНЫ

пр. Ф.Скарыны, 13, тэл. 208-297

Асацыяцыя зламысьнікаў 12-18 – 12.05, 15.40, 19.15

Прафэсіянал 12-18 – 13.50, 17.25, 21.00

ЭЛЕКТРОН

Казінца, 117, тэл. 789-563

Малыш-каратэ 12-16 – 12.00, 15.20, 17.00; 17-18 – 15.20, 17.00

Падмаскоўныя вечары 12-18 – 13.40, 21.00

Вялікая прагулка (2 сэрыі) 12-18 – 18.40

Для дзяцей:

Куды даскача раньняя пташка 13 – 10.30

Тобі Мактыг 15 – 10.30

Ляпляндзкія казкі 17-18 – 12.00

Відэасапён

Магутны ўдар-2

Рэж. Пол Зілер, у ролях Бола Енг, Ўільям Забка, Майкал Бэрнарда і інш.

ЗША. Баявік. Сын паліцыянта з Сан-Францыска загінуў у Маямі ад рук арганізатара боек да сьмерці – крывавай забавы мясцовых мафіёзі. Бацька пакляўся адпомсьціць і спыніць жудасныя баі сучасных глядыятараў. Ён зьбірае сваю каманду байцоў на чале з настаўнікам усходніх адзінаборстваў, ураджэнцам Ганконгу. Кожны зь іх ненавідзіць жорсткае відовішча і яны не пакідаюць шанца злачынцам... 12-18 – 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00

АДРАСЫ ВІДЭАЗАЛЯЎ

"ГАЛЯКТЫКА" пр. газэты "Известия", 18, тэл. 714-512;

"ПАЛЯНЭЗ" вул. Бачылы, 16, тэл. 441-342;

"ПОЎНАЧ" вул. Герасіменкі, 26, тэл. 433-813.

ЗОРНЫЯ РОССЫПЫ:

– Арнольд Шварцэнэгер падчас Алімпійскіх гульняў у Атлянце зьявіўся на спаборніцтвах разам з Ванэсай Ўільямс (партнэрка Арні ў апошнім кінапраекце). Гэта была сумесная заплянаваная паездка ў рамках рэклямнай кампаніі і эўрапейскай прэм'еры фільму "Прафэсія: выціральнік". На пытаньне камэнтатара каналу "Эраспорт" пра тое, ці падабаюцца яму спаборніцтвы, Шварцэнэгер сказаў, што вельмі. На пытаньне музычнага тэлеканалу МСМ пра ягоныя схільнасьці ў галіне музыкі, экс-містэр Алімпія адказаў, што музыку ён слухае пераважна ў аўтамабілі, а падабаюцца яму розныя добрыя кампазыцыі, але асабліва хіты 60-х і 70-х гадоў. (Апэратыўная інфармацыя атрымана з дапамогай ВКФ "Рамак").

– Стывэн Сьпілбэрг ужо ў сёлетнім верасьні распачне здымкі фільму-працягу з працоўнай назвай "Страчаны сьвет: Парк Юрскага пэрыяду" (Lost World: Jurassic Park). Галоўную ролю ў стужцы выканае Джэф Голдблюм, а ягонай асноўнай партнэркай будзе Джуліяна Мур ("9 месяцаў"). Здымкі адбудуцца на студыі Amblin Entertainment, што належыць Стывэну Сьпілбэргу, а асноўным распаўсюднікам стужкі на рынку будзе найбуйнейшая кінакампанія сьвету Universal Pictures. Прэм'ера фільму чакаецца на Каляды 1997 году.


– Джэры О'Конэл – герой тэлесэрыялу для падлеткаў "Сьлізгуны" (Sliders) – выканае галоўную ролю ў новым кінапраекце тэлекампаніі MTV пад назвай "Кватэра Джо" (Joe's Apartment). Гэта будзе рэжысэрскі дэбют 34-гадовага Джона Пэйсана, а раскажа ён гісторыю пра хлопца са штату Аёва, які прыехаў у Нью-Ёрк з сур'ёзнымі намерамі праславіцца. Аднак вялікім плянам Джо ня суджана спраўдзіцца з-за набегаў і хамскіх паводзінаў мярзотных тараканаў, што пасяліліся ў ягонай кватэры (дарэчы, у здымках бралі ўдзел прыкладна 5000 тараканаў). На працягу фільму (праца працягвалася болей за 6 тыдняў!) тараканы штораз зьяўляюцца ў самы непатрэбны момант і актору О'Конэлу ў літаральным сэнсе даводзілася дзяліць сваю ежу з брыдкімі букашкамі. Але разам з гэтымі сапраўднымі тараканамі, якіх выдатна выдрэсіяваў энтамоляг Рэйманд Мэндэс, у стужцы "ўдзельнічаюць" штучныя жучкі-мадэлі і віртуальныя тараканы, створаныя на супэрсучасных кампутарах. Бюджэт стужкі $ 20 млн.

– Новы фільм Джыма Кэры "Ілгун, ілгун" (Liar, Liar) ужо змантаваны, агучаны і гатовы да кінапракату. Дыстрыб'ютары стужкі чакаюць толькі найлепшага моманту і рыхтуюцца да масіраванай рэклямнай кампаніі, якая здолее забясьпечыць салідны касавы посьпех іхнаму "дзіцяці". Выпускаць цяпер у пракат новы фільм з Джымам Кэры – гэта значыць ня цалкам скарыстаць касавы патэнцыял іншай ягонай стужкі – "Кабэльшчык" (Cable Gun), якая паранейшаму зьбірае багаты ўраджай грашовых знакаў ад кінагледачоў ва ўсім сьвеце. Джым Кэры заявіў, што пасьля фільму "Ілгун, ілгун" ён больш ня будзе граць пэрсанажаў у стылі "тупы і яшчэ тупейшы", а пасьля непрацяглага перапынку будзе здымацца ў "сур'ёзным" кіно. Джым, напэўна, меў на ўвазе будучую працу ў стужцы "Трумэн Шоў" (Truman Show) вядомага рэжысэра Пітэра Ўіра ("Сьведка", "Таварыства мёртвых паэтаў"). Невялікі перапынак у кінакар'еры Кэры вымушаны зрабіць яшчэ з прычыны запаленьня сустава вялікага пальца нагі. Так што актору давядзецца пэўны час паляжаць на шпітальным ложку. А потым Джым абяцае сваім прыхільнікам зрабіць у кіно ўсё, што толькі можа.

ФІЛЬМЫ ТЫДНЯ:

1. "ПРЫЕМНАСЬЦЬ АД ЗАБОЙСТВА"

Італія, 1988, 90 хв., +++1/2, El Placer De Matar; узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Фэлікс Ратаетса, у р. Антоніё Бандэрас, Вікторыя Абрыль, Мат'е Кар'ер.



Баявік. Што можа аб'яднаць Андрэаса — прыкладнага сем'яніна, настаўніка і Люіса — гандляра наркотыкамі? Толькі іх хобі і любоў да забойстваў. "Працу" ім дае нейкі брудны дзялок Барантэс, які наймае двух кілераў для падстрахаваньня. Такім чынам, "на працы" забойцы пасябравалі і сталі езьдзіць разам за горад практыкавацца ў стральбе. Аднак бляшанкі — кепская мішэня для такіх хлапцоў як Андрэас і Люіс. Вось таму яны вывозяць за горад адну далёкую сваячку Андрэаса і з-за залішняй упартасьці (не сышліся характарамі) прыстрэльваюць яе. Выпадковыя знаёмыя дзяўчыны з бара становяцца чарговай жывой мішэняй. Урэшце, апошняй ахвярай прагнай любові да забойстваў галоўных герояў стаў сам сіньёр Барантэс...

2. "КАЎКАСКІ ПАЛОНЬНІК"

Расея, 1996, 95 хв., +++1/2; узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Сяргей Бадроў, прад'юсэр: Барыс Гілер, у р. Алег Меншыкаў, Сяргей Бадроў-малодшы, Аляксей Жаркоў.

Ваенная драма. Зараз гэта самы рэклямаваны фільм на расейскім тэлебачаньні. Асноўныя падзеі стужкі разгортваюцца ў нашы дні на тле вайны ў Чачэніі. Двое расейскіх вайскоўцаў трапляюць у палон да чачэнскай сям'і. Галава сям'і зьбіраецца абмяняць палоньнікаў на сына, затрыманага прадстаўнікамі мясцовай камэндатуры за ўдзел у антыўрадавым мітынгу. Пасьля няўдалай спробы абмену чачэнец пад страхам сьмерці прымушае напісаць абодвух салдатаў дамоў маці, каб тыя самі паўплывалі на палявых камандзіраў і вызвалілі яго сына ў абмен на сваіх сыноў. Пакуль лісты былі ў дарозе, "каўкаскія палоньнікі" паспрабавалі ўцячы...

3. "КРОЎ І ПОНЧЫКІ"

Канада, 1996, 90 хв., +++, Blood & Donuts; узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Холі Дэйл, у р. Дэвід Кронэнбэрг, Гордан Кары.

Камэдыя з налётам пародыі на ўсялякія фільмы жахаў і многія містычныя стужкі. Глядач зразумее гэта зь першых кадраў. Уявіце сабе такую сытуацыю: 1969 год, амэрыканцы высаджваюцца на Месяц і тут жа на экране зьяўляюцца тытры: "Людзі ступілі на Месяц, а Бая залез у мяшок". І вылез ён адтуль у нашы дні (яго "патурбаваў" няўдала паспаны кімсьці мяч ад гольфу!). Апрытомнеўшы, Бая адразу накіраваўся на... могільнік, дзе адчыніў дзіўны куфэрак. Пасьля ўсяго гэтага ён наведаў прыдарожную кавярню, выратаваў таксіста ад рэкетыраў (ператварыўшыся ў страшэннага монстра) і пасяліўся ў невялікім гатэлі. Гэты дзіўнаваты фільм быў цёпла сустрэты амэрыканскай публікай, пра што сьведчаць някепскія касавыя зборы (каля $ 10 млн.).

4. "ЛЯЛЕЧНЫ ДОМІК З ЭМІТВІЛЯ"

ЗША, 1996, 92 хв., ++1/2, Amityville Dollhouse; узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Стыў Ўайт, у р. Робін Томас, Стар Андрэеф.

Жахі. Гісторыя злавеснага асабняка Эмітвіль дагэтуль прыцягальная для гледачоў і ёсьць спрыяльнай глебай для розных кінаэкспэрымэнтаў у Галівудзе. Эмітвіль — гэта прыстанак прывідаў і іншае нечысьці. Такім чынам, перад намі новая страшная гісторыя. ...Сям'я Мартынаў пераехала ў новыя ўтульныя апартамэнты. Поруч з катэджам ад ранейшых землеўладальнікаў застаўся хлеў, у якім навасельцы выявілі чароўны лялечны домік. Лепш бы яны яго не чапалі! Пачалося усё з начных жахаў, якія паступова пачалі ператварацца ў жудасную рэальнасьць. Цяпер героям фільму давядзецца добра папрацаваць, каб загнаць шалёныя дэманічныя сілы назад у лялечны домік.

5. "ШАЛЁНЫ"

Ганконг, 1995, 95 хв., +++, Wild Search; узр. абм.: ад 16 гадоў. Рэж. Рынга Лэм, у р. Чоў Юн Фэт, Чэры Чанг.

Баявік-драма. Пасьля няўдалага затрыманьня асабліва небясьпечных злачынцаў паміж імі і паліцыяй здарылася незаплянаваная перастрэлка, у выніку якой гангстэрам удалося ўцячы, а адна з падазраваных была забітая. У руках паліцыі апынулася яе маленькая чатырохгадовая дачка Кэй Да. Прадстаўнік аддзелу барацьбы з наркотыкамі, які адказвае за правядзеньне няўдалай апэрацыі, вымушаны на кароткі час стаць "бацькам" маленькай сьведкі. Паліцыянт Мяў-Мяў (Чоў Юн Фэт) вельмі хутка пасябраваў з кемлівай дзяўчынкай і здолеў адшукаць яе блізкіх сваякоў: дзядулю і цётку. Паліцыя спрабуе натрапіць на сьлед злачынцаў, а злачынцы сьпяшаюцца зьнішчыць усе доказы і адзіную юную сьведку падзеяў...

***Інфармацыя Аналітычнай службы сеткі "Відэа+" і Агенцтва кінавідэазабаваў "Моцная Кава". *Аўтар дзякуе ВКФ "Рамак" за дапамогу.**

Падрыхтаваў Мікалай Кавалеўскі


Заняткі псыхатрэнінгу

Давайце паспрабуем вызначыць, як адбываюцца кантакты паміж людзьмі ў складаных сытуацыях. Пры гэтым істотна зразумець, што нашыя кантакты ідуць на двух узроўнях: маўленчым і немаўленчым, г. зн., у працэсе кантактаў удзельнічае ня толькі нашая мова, але важны стан цягліцаў, галасавых зьвязак, дыханьня (так званых немаўленчых кампанэнтаў кантактаў).

У тых выпадках, калі чалавек знаходзіцца ў непаразуменьні са сваёй самакаштоўнасьцю, гэта значыць з самім сабою, гэтыя два ўзроўні кантактаў не супадаюць, а часта нават пярэчаць адзін аднаму. Паспрабуйце вызначыць, якая роля найбольш адпавядае Вашым паводзінам у сям'і. Гэта дапаможа Вам скарэктаваць сябе.

У практыцы кантактаў, як сьцьвярджае В.Сатыр, можна назіраць чатыры пазыцыі-ролі, якія граюць людзі, калі адчуваюць пагрозу сваёй самакаштоўнасьці – свайму "я".

"Ахвяра". Кожны чалавек у пазыцыі "ахвяры" адчувае пагрозу сваёй самакаштоўнасьці і імкнецца зрабіць усё, толькі каб на яго не раззлаваліся. "Ахвяра" падлашчваецца, пагаджаецца з усімі, заўсёды размаўляе так, каб атрымаць прыхільнасьць іншых, імкнецца быць ветлівай, нават папераджальнай. Яна кажа так, быццам нічога не жадае й ня можа зрабіць для сябе, але толькі для іншых, і павінна заўсёды атрымліваць чыюсьці пахвалу. Напрыклад, на працы ў мужа сьвяточны вечар, куды запрошаны супрацоўнікі з жонкамі. І ён прапаноўвае Вам пайсьці разам. Але ў Вас няма настрою, дый нехта з супрацоўнікаў Вас ня любіць і таму Вы адмаўляецеся: "Лепш пайдзі адзін, адпачні, пабудзь са сваімі". Аднак хутка Вас ужо разрываюць пачуцьці, Вы шкадуеце, што не пайшлі разам зь ім. А мужу імкнецеся гэтага не паказаць, хаваеце крыўду й расчараванасьць ("Я радая, што табе было вясёла"). Вось толькі ўнутры Вас ўсё крычыць аб тым, што Вы такая няшчасная, так пакутавалі, пакуль ён забаўляўся бяз Вас...



А цяпер паглядзіце на мал. а і паспрабуйце прыняць позу "ахвяры". Калі вы будзеце граць гэтую ролю хаця б на працягу 5 хвілінаў, у Вас узьнікне непрыемнае пачуцьцё. Каб добра выканаць гэтую ролю, Вы павінны падумаць пра сябе як пра чалавека, які сапраўды нічога нявартны й шчасьлівы ўжо тым, што яму дазволілі існаваць. Вы прагнеце і молiце кожнага аб удзяцы, і Вы ўвесь час чакаеце, што з Вамі адбудуцца разнастайныя непрыемнасьці. І, натуральна ж, Вы цалкам згодныя з усялякай крытыкай на Ваш адрас і шчыра ўдзячныя таму, хто з Вамі размаўляе, пры гэтым тое, што ён кажа, ня мае аніякае значнасьці. Вы нават ня думаеце, што можаце папрасіць што-небудзь асабіста для сябе. "Хто я такі, каб прасіць штосьці для сябе?".

Паспрабуйце ўявіць сябе слабым, бязвольным. Напрыклад, Вашыя калені на падлозе, Вы зьлёгку трымціце, адна рука паднятая ва ўмольным жэсьце. Вы адразу адчуеце, як забаліць шыя, а вочы, калі Вы будзеце спрабаваць глядзець проста, праз пэўны час стомяцца, у Вас забаліць галава. Калі ж Вы паспрабуеце загаварыць, то пачуеце, што Ваш голас будзе жаласным, бо Вы ня здолееце ўдыхнуць шмат паветра для таго, каб ён гучаў гучна й чыста. І Вы адчуеце, што ў такой позе схільныя пагаджацца з усім, незалежна ад таго, што Вы сапраўды думаеце ці адчуваеце.

Статус ахвяры – гэта асаблівы фізычны стан, які выклікае асаблівыя "ахвярныя" псыхалягічныя рэакцыі.

"Абвінаваўца". Чалавек у гэтай пазыцыі спрабуе прымусіць усіх паверыць у ягоную значнасьць, прымусіць бачыць сябе больш моцным, чым ёсьць насамрэч. Напрыклад, Ваша сям'я чакае гасьцей. Але яшчэ шмат хатніх справаў (дзеці не апранупіся сьвяточна, у мужа некуды зьнік гальштук, пірог ніяк не падрумяньваецца). Вы затузаны, ужо і госьці ня ў радасьць. Але замест таго, каб шчыра сказаць: "Дарагія, я стамілася, дапамажыце мне, няхай кожны зробіць тое й тое", – Вы ўсчынаеце гнеўную тыраду: "У гэтай сям'і ніхто нічога ня можа зрабіць акрамя мяне, усё валіцца на маю галаву, увесь час я за ўсё адказваю, пра ўсё думаю, дапамогі ад вас не дачакаесься, уяўляю, што з вамі было б, калі б ня я".

Чалавек у пазыцыі абвінаваўцы схільны вышукваць памылкі ў іншых. Гэта дыктатар, які заўсёды кажа пагардліва: "Калі б ня ты, то ўсё было б цудоўна". Пры гэтым у яго павышаецца ціск, голас становіцца жорсткі, рэзкі.

А цяпер станьце ў позу абвінаваўцы (мал. б), адну руку пакладзіце на пояс, а другую выцягніце ў накіроўным загадным жэсьце і ўсклікніце: "Ты ніколі нічога ня зробіш як трэба, нічога ня ўмееш! Чаму ўсё я ды я павінна гэта рабіць?" І не чакайце адказу. Гэта неістотна. Абвінаваўца зацікаўлены ў тым, каб быў ціск на навакольных, ён не шукае выйсьця з сытуацыі.

Пастойце пэўны час у гэтай позе. Ці праўда, што Вы адчуваеце сябе так, быццам і самі нічога ня вартыя? Менавіта таму Вы й прымушаеце кагосьці падначальвацца Вам. Толькі так некаторыя людзі маюць адчуваньне хоць якойсьці ўласнай самакаштоўнасьці.

"Кампутар". Чалавек у гэтай пазыцыі, баючыся згубіць уласную самакаштоўнасьць, паводзіць сябе так, быццам ён заўсёды мае праўду і ўсё можа зразумець і вытлумачыць. "Кампутар" жадае абмежаваць сябе ад дадатковых хваляваньняў, спрабуе схаваць свой стан за плыньню развагаў і разумовых схемаў. Ягонае цела напоўнена сухасьцю, голас манатонны, а словы часьцей за ўсё абстрактыя й мудрагелістыя. Гэтую пазыцыю можна праілюстраваць хаця б такой сытуацыяй. Зьявілася лёгкае падазрэньне, што муж Вам здраджвае, Вы вырашаеце сказаць пра гэта й пры гэтым гаворыце так: "Трэба трымаць сябе ў руках, ні ў якім разе нельга паказаць, як я яго кахаю, што мяне крыўдзіць ягоная халоднасьць, у якім я адчаі". Настроіўшы сябе такім чынам, падчас разборкі "кампутар" спрабуе раскласьці ўсё па палічках: што мужчыны наўрад ці здольныя захоўваць вернасьць, і гэта трэба прымаць як дадзенасьць, што ў сямейным жыцьці непазьбежныя крызісы, але трэба ўсё ўзважыць і памятаць, што пакладзена на шалі.

Часта "кампутар" не зьвяртаецца ні да каго канкрэтна, пазьбягае аналізаваць канкрэтныя сытуацыі, гаворыць ад трэцяй асобы: "Калі б людзі паглядзелі ўважліва, то, магчыма, яны б пабачылі..." Ён ня вельмі клапоціцца пра тое, ці слухаюць яго. Суразмоўцы найчасьцей не вытрымліваюць гэтых тырадаў без пачуцьця.

Паспрабуйце ўявіць сябе ў позе "кампутара" (мал. в), спрабуйце вымаўляць вельмі доўгія фразы. Прынамсі, Вы будзеце здавацца вельмі разумным, тым больш, што акрамя першых фразаў, Вашу прамову ніхто ня ў стане слухаць далей. Каб выразьней адчуць сябе ў ролі "кампутара", уявіце, што Ваша хрыбетніца ператварылася ў стальную нацягнутую драціну, а стальны хамут сьцягвае галаву й шыю. Вашае цела, рукі й ногі могуць рухацца, але Вам даводзіцца рухаць імі. У пазыцыі "кампутара" ваш сапраўдны голас нібыта паміраe, бо ў Вас зусім няма моцы, каб актыўна рухаць языком і вуснамі, бо Вы машына!

"Флюгер". У гэтым выпадку ўсё зусім іншае. "Флюгер" зусім перастае кантраляваць сытуацыю, ён хоча паказаць усім, што аніякай пагрозы не існуе і можа рабіць што заўгодна. Ягонае цела вуглаватае, нязграбнае, яно знаходзіцца ў хаатычным руху. Уявіце сабе, што з блізкім Вам чалавекам Вы ўпершыню трапілі ў кампанію ягоных сяброў. Вы вельмі баіцёся ім не спадабацца і таму ніяк ня можаце знайсьці адпаведнага тону, ня ведаеце, як паводзіць сябе. Вы спрабуеце прапанаваць свае паслугі гаспадыні дому на кухні, але высьвятляецца, што ўсё ўжо зроблена, спрабавалі расказаць показку, але ад сарамлівасьці скамечылі яе й атрымліваецца нясьмешна. То раптам весялееце, а то напускаеце на сябе мэлянхолію й сядзіце з млявым выглядам. У кожным выпадку хаваеце сваё "я", бо яно, сапраўднае, здаецца Вам нявартым нічога і нецікавым для гэтых людзей, і Вы ўпіхваеце разнастайнасьць сваёй натуры ў зададзеную схему. Чалавек у ролі "флюгера" ніколі не дае дакладных і непасрэдных адказаў. Ягонае ўнутранае адчуваньне падобна да галавакружэньня, інтанацыя не адпавядае думкам. Пры выкананьні гэтай ролі ўявіце сябе ваўчком, які ня ведае, як і куды ён круціцца (мал. г).



БІЛЬЯРД

ЗАНЯТАК 4

(Працяг. Пачатак у N 16)

Для гэтага наносіцца "працяжны" (*більярдны тэрмін – заўвага рэд.*) доўгі ўдар у верхнюю частку бітка. Пры гэтым бітак, акрамя паступальнага руху наперад, атрымае вярчальны рух зьверху ўніз і пасьля сутыкненьня з гуляльным шарам, затрымаўшыся на хвіліну, пакоціцца наперад. Такі ўдар – "накат" – звычайна ахвотна выкарыстоўваюць пачаткоўцы, бо ён нескладаны ў выкананьні. Лічыцца, што пры "накаце" ўдар і прыцэл найбольш верныя.

Не заўсёды ўдар наносіцца ў названую вышэй кропку. У залежнасьці ад адлегласьці паміж "сваім" і гуляльным шарамі кропка ўдару можа крыху ссоўвацца па вэртыкалі. Чым бліжэй стаіць бітак да гуляльнага шара, тым вышэй і мацней наносіцца ўдар, і наадварот. Напрыклад, калі адлегласьць паміж шарамі невялікая (каля 0,2-0,5 м), то для атрыманьня "накату" наносіцца кароткі й моцны ўдар амаль у самы верх бітка.

3. "Адцяжка" – удар у ніжнюю кропку строга пад цэнтрам бітка. Калі патрабуецца, каб пасьля ўдару "свой" адышоў назад, то ўдар наносіцца ў ніжнюю частку бітка. Пры гэтым, у супрацьлегласьць "накату", разам з паступальным рухам наперад бітак пачынае круціцца вакол гарызантальнай восі зьнізу ўверх і, затрымаўшыся на месцы, пасьля ўдару коціцца назад.

"Адцяжка" лічыцца адным з самых прыгожых і цяжкіх удараў і выкарыстоўваецца ў гульні вельмі часта. Пры "адцяжцы" важныя імгненнасьць і мяккасьць удару. Апроч таго, яна патрабуе ідэальнага стану наклейкі: толькі добра ўкрэйдаваная, закругленая, элястычная й шурпатая ейная паверхня дапаможа дакладна выканаць гэты ўдар.

Першыя тры ўдары ў бітак забясьпечваюць ці спыненьне, ці рух яго пасьля сутыкненьня з гуляльным шарам наперад ці назад.

Калі ж неабходна, каб пасьля сутыкненьня з прыцэльным шарам "свой" пакаціўся ўправа ці ўлева, то выкарыстоўваюць бакавыя, ці французскія, удары. Зьявіліся яны на першых бязлузных французскіх більярдах у карамбольных партыях. Вядомасьць атрымалі пасьля ўдасканаленьня кіёў і зьяўленьня скураной наклейкі. Галоўная вартасьць бакавых удараў у шырокай магчымасьці выконваць зь іхняй дапамогай адыгрыш і выхад. Вось гэтыя ўдары:

4. "Правы бакавік" – удар у сярэднюю кропку на правым баку бітка. Пры такім удары бітак атрымлівае акрамя паступальнага руху наперад вярчальны рух вакол вэртыкальнай восі, што праходзіць праз цэнтар шару, справа налева. Сутыкнуўшыся з гуляльным шарам, перадаўшы яму паступальны рух, закруціўшыся ваўчком і цягнуты сваім вярчальным рухам, бітак пойдзе толькі ўправа.

5. "Левы бакавік" – удар у сярэднюю кропку на левым баку бітка. Гэты ўдар аналягічны папярэдняму (4), толькі вэртыкальнае вярчэньне бітак атрымлівае зьлева направа й пасьля сутыкненьня з гуляльным шарам пойдзе толькі ўлева.


Наступныя чатыры ўдары – найскладанейшыя. Гэта так званыя камбінаваныя ўдары, якія ўключаюць у сябе адначасова элемэнты бакавых удараў, а таксама "накату" ці "адцяжкі". Часам такія ўдары называюць "бакавы накат" ці "бакавая адцяжка".

6. "Верхні правы бакавік" – удар у верхнюю кропку на правым баку бітка. Гэты ўдар выконваецца, калі трэба, каб бітак пасьля сутыкненьня з шарам пакаціўся ўправа й наперад. Бітак удараюць у верхнюю правую частку шара плаўна й працяжна. Гэты ўдар дае шару: 1) паступальны рух наперад, 2) рух паскарэньня – "накат", 3) некаторае, ледзьве прыкметнае для вока, ухіленьне ў правы бок дзякуючы бакавому вярчэньню шара вакол вэртыкальнай восі, гэта значыць "эфэ".


7. "Верхні левы бакавік" – удар у верхнюю кропку на левым баку бітка. Усе тут аналягічна папярэдняму ўдару (6), толькі бітак сыходзіць улева й наперад.

Працяг у наступным нумары

ШАХМАТЫ



1п. Белыя перамагаюць.



4п. Белыя перамагаюць.



2п. Чорныя пачынаюць і перамагаюць.



5п. Белыя перамагаюць.



3п. Белыя перамагаюць.



6п. Чорныя пачынаюць і перамагаюць.

Адказы ў наступным нумары

АДКАЗЫ НА ПАПЯРЭДНІЯ ЗАДАНЬНІ

Шахматы

Тлумачэньні:
Кароль — **Кр**;
Гетман (Фэрзь) — **Г**;
Вежа (Тура) — **Вж**;
Вышнік (Слон) — **В**;
Конь — **К**.

1п. 1 Гg7!! Кр:g7 2. К:d5+ f6 3. К:f6 Вж:f6 4. Кg5! Гc8 5. Вж:c1 Кc6 6. Кe4 e5 7. К:f6 Кр:f6 8. f4! Гe8 9. fe++ Кpe7 10. Вa3+ Кpe6 11. Вж:f6+ Кр:e5 12. Вж1:c5 Чорныя здаліся.

2п. 1... Кe1+ 2. Кpg1 Гh1+!! 3. Кр:h1 Вжf1+. Белыя здаліся.

3п. 1. Гd8+!! Кр:d8 2. Кe6++ Кpe7 3. Вg5+ f6 4. Кd8+! Чорныя здаліся.

4п. 1. Гg4! Гb5 2. Гc4!! Гd7 3. Гc7!! Гb5 4. a4 Г:a4 5. Вжe4! Гb5 6. Г:b7! Чорныя здаліся.

5п. 1. Гg6!! fg 2. К:g6+! hg 3. Вжh3+ Гh4 4. Вж:h4X.

6п. 1... Вж:a3! Белыя здаліся.

Забаўкі
1. 5 **2.** 484 **3.** CRUISING

ЗАБАЎКІ


Задача 1

Падстаўце лік, якога бракуе



Задача 2

Устаўце фігуру, якой нестае



Задача 3

Падстаўце дзесяць лікаў, якіх нестае

(39 487 4 147 84)
(172 39 28 12 39 28 84)
(199 4)
(? ? ? ? ? ? ? ? ? ?)

Адказы ў наступным нумары

Ганна Матусэвіч

Дзёньнік без канца



28.07. Ня трэба казаць «мы» там, дзе трэба сказаць «я». Калі б у мяне папыталіся: хто вышэйшы, Багдановіч ці Багушэвіч, я б адказала: з-за далечыні не відаць. І толькі, як новы віток сьпіралі дасканалейшы за стары, так можа быць Багдановічава заўвага «калі б я ня ведаў, панове, што пекна сьпяваюць і жабы» карацейшая за доўгую натацыю інтэлігенту: «маліся ж бабулька да Бога». Альбо, магчыма, завостраны меч «біце ў сэрцы іх...» патрапляе ў сэрца хутчэй, чым пералік іменаў: «знаць Чачота ўсе павінны...» Магчыма...

Прыжаніўся мой сусед-разводнік, і я лаўлю сябе на думцы, што мне стала лягчэй. У тым сэнсе, што баба з возу... І мне ўжо ня трэба будзе насіць яму бульбу на талерцы.

30.07. У Ракуцёўшчыне Міколка нёс маленькі сьцяжок. Якісь дзед з бабай напалі на дзіця, каб яно «выкінула вон гэтую анучу». Наш інтэлігентны спадарожнік стаў з запалам раскідваць пэрлы... Я не хачу пакрыўдзіць гэтага мілага ахвярнага чалавека, які столькі зрабіў і робіць дзеля Бацькаўшчыны, але мушу сказаць усім. Маўчыце, спадарства, маўчыце, калі ня хочаце, каб старое Купалава запытаньне «Чаго Вам хочацца, панове?» было пераадрасавана шаноўнаму спадарству. Вы проста ня ведаеце, што нашыя маткі з самых нашых народзінаў туга здушвалі нас спавівачом, клалі ў почвы ды совалі пад ложак, каб мухі не кусалі. А самі беглі адрабляць калгасную паншчыну...

31.07. Сьніўся сёньня Алам Глёбус. Мы сустракаліся зь ім некалькі разоў на дзень, і я ўсё насіла яму нейкія пакункі. Ён быў са мной іранічны. Урачыста гучалі словы: «Веру ў Розум Сьветлы і Надземны». Было хораша.

1.08. Чытаю ўспаміны Юліяны Вітан-Дубейкаўскай і міжволі параўноўваю той час з нашым. Там усё ж былі якія-ніякія цывілізацыя. А ў нас — чыстае барбарства. Я шмат развагала, парадкуючы свае запісы, ці варта мне паказваць на людзі свае чорныя парэпаныя пяты й загрубелыя рукі зь недагледжанымі пазногцямі? Але ж бачу, што ў нас усе запалоханыя, у кожным сядзіць зьнявераны баязьлівец. Фэномэн папулярнасьці Лукашэнкі паходзіць адсюль. Бээнэфаўцы баяцца прызнацца, што яны бээнэфаўцы, жыды замоўчваць сваю нацыянальнасьць, баптысты толькі ў падваротні шэпчуць аб сваёй веры ў Бога і г.д.

І я баюся... здрадзіць Богу. Таму й не баюся быць наіўнай у вачах людзей. Няхай і іншыя не баяцца.

2.08. Яшчэ зь вітальні заўважыла, што на бальконе нязвыклы спакой. Паглядзела — у гнязьдзе не тырчаць, як раней, дзьве цёмненькія цікаўныя галоўкі. Выбраліся да Ільлі нашыя мілыя кватаранты-ластаўкі.

Вось гляджу на гэтыя хоку. Квадрат, сьпіралі, рыскі, кропкі... Гэта — халодны Космас, увасобленае ў плоць жывое чалавечае жыцьцё зноў абернута ў сухую касьмічную формулу. Гэта, як дыстыляваны кандэнсат. Паслухайце, як гучыць гэта на Зямлі: чыстая раса. І пакуль я ўваплочана на Зямлі — мне мілей раса, чым кандэнсат.

3.08. Едзем позна ўвечары на роварах. Сонца ў хмару заходзіць... зайшло. Крывавая разора на небе. Цішыня. Паўзмрок. Зжатыя палі. Самотная «хуткая дапамога». Разьвітальныя вогнішчы ў цемры. Восеньскаю тугою й жалем шчыміць усё паветра.

Тацяна Сьнітко

«No pasaran!»



27 ліпеня. Дзіцёнак перастаў кашляць. Надвор'е кліча зьехаць у вёску. Рэкляма — у Э гіпэт.

«Мама, а што такое салют? Які ён? А што такое незалежнасьць?»

Да мітынгаў і шэсьцяў у ролі мамы я цьвёрда вырашыла не набліжацца. Бо дзіцёнак 30-га еў марозіва ў «Пінгвіне» і спытаў, куды павезьлі тых дзядзяў у машыне. Цяпер вось прыбягае на кухню ў сьлязах: котка ўчыніла пабег з турмы, пабудаванай з падушак і скрынак.

— Свабоду котцы! — кажу я, мыючы посуд.

— Яна скрала мой ружовы аловак! — у роспачы даводзіць дзіцёнак, прагнучы справядлівасьці.

І вось котка сьпіць, аловак выцягнуты з-пад ложка, турма пераробленая ў палац, а зьняволеная ўжо — прынцэса з бантам на соннай мызе. Панаваньне справядлівасьці час ад часу перапыняецца камэнтарамі накшталт:

— У Пецярбургу быў такі палац! І яшчэ такая турма! Ты ў іх хоць была, мама? А як па-ангельску «Мілка»? «Мілкі ўэй», напэўна? Наша котка па-іхняму зусім не разумее!

Нібыта гаспадары коткі суцэльныя паліглоты...

У Дзень нашай незалежнасьці прагрымеў выбух у Атлянце, а беларуская спартоўка заваявала першы ў гісторыі незалежнай краіны залаты мэдаль на Алімпіядзе. Чаму так заўсёды супадае: радасьць ураўнаважваецца нечай трагедыяй?

На прыпынку насупраць Опэрнага тэатру... Калёна набліжаецца, і чамусьці становіцца лягчэй дыхаць. «Гэта, — нібы адчуўшы мой стан, тыча ў калёну са сьцягамі нейкі стары дзед, — гэта ідуць фанатычныя нацыяналісты!» Спапяліўшы мяне позіркам, дзядок злуецца яшчэ больш і ледзь ня з крыкам «No pasaran!» зьнікае з вачэй. Дэманстранты нясуць наперадзе партрэты беларускіх герояў і сьвятых...

— Твае землякі! — кажа сяброўка, і я бачу шахцёрскія каскі. Здаецца, я скачу ад радасьці. Даўно не была ў родным горадзе. Там тыя, хто нарадзіўся ў Салікамску, цяпер кажуць: «у іх у Расеі... у нас у Беларусі...» Ня ведаючы добра нашае мовы, могуць весела распавесьці: «Была сустрэча з аднаклясьнікамі на Ўрале. Сказалі, што я праз 20 гадоў гавару зь беларускім акцэнтам». — «Гэта кепска?» — «Гэта нармальна!» — амаль абураны адказ на недарэчнае пытаньне.

Гэта з нашага пралетарска-паўрасейскага гораду прыехала тая самая труна з надпісам «Дыктатура», якую пранесьлі па менскіх вуліцах. Гэта ў нас (мне распавялі ў калёне) у дзіцячым садку прайшоў ранішнік у гонар Дня Незалежнасьці. Гэта нашыя працаўнікі даюць Беларусі ў дзяржаўную кішэню каля трацiны валюты, у той час як дзяржава ня вельмі сьпяшаецца хаця б вывучыць стан экалёгіі рэгіёну... Такое вось атрымваецца сьвяточнае прывітаньне з радзімы, той самай Случчыны, дзе баранілі незалежнасьць яшчэ ў 1920-м.

Калі слухаеш у радыё пра заяву расейскага дэпутата-камуніста ці чытаеш у нашай прэсе артыкул з рэфрэнам «У паветры пахне бэнзынам,» — перасмыкаеш плячыма. Некаму трэба з намі пабіцца, ну проста хранічна неабходна знайсьці «дзяцей хлусьні»! А ў нас — проста сьвята. І мы проста гаворым тое, што думаем. І хаваць тут няма чаго: я — гэта я, і як-небудзь разьбярэмся, што да чаго. Гэта той дзядок, што махаў рукою і крычаў пра фанатызм, ня можа зразумець, як можна існаваць не па-сталінску. Дайце чалавеку нармальную пэнсію, і няхай жыве спакойна.

«... Мама, а што знаходзіцца вышэй за неба? Глядзі, у тэлевізары Ельцын і наш дзядзя Саша Лукашэнка...»

Аднагодкі Незалежнасьці калі-небудзь раскажуць пра сёньняшні дзень сваім дзецям, нікога не ненавідзячы, ня спальваючы позіркам, і бяз "no pasaran".

Зьміцер Бартосік

Выхад у горад

* * *



Цікава, колькі патрэбна часу, каб па прыезьдзе дадому адчуць ня толькі радасьць сустрэчы, але яшчэ й захапленьне ад тых зьменаў, што адбыліся падчас тваёй адсутнасьці. Калі гаварыць пра Гомель, то тыдня яўна замала, каб ня тое што ссумавацца па ім, але адчуць, што ты ўвогуле некуды ад'яжджаў.

Мне застаецца толькі пазайздросьціць майму вагоннаму спадарожніку, маладому міліцыянту, які адразу прыліп да шыбы, як толькі ў ёй паплылі шэрыя сьцены «Сельмашу». Міліцыянта, напэўна, чакае на пэроне ягоная жонка. Мяне ж чакае толькі пэрон і надпіс «Выхад у горад». Горад, у які даўно хочацца выйсьці неяк небудзённа. Але што ў ім можа зьмяніцца?..

Вось каму я зусім не зайздрошчу, дык гэта гасьцям нашага гораду. Асабліва тым, што, у адрозьненьне ад мяне, далей вакзальнага пляцу не пасунуцца. І, перасеўшы на іншы цягнік, павязуць ад Гомеля ўражаньне такое ж бруднае і шэрае, як гэты пляц. Напэўна, усе яны, вакзальныя пляцы, брудныя. Чаму ж мне апошнім часам падаецца, што бруднейшага за гомельскі няма? Бамжоў, здаецца, не паболела. Міліцыянтаў не паменела. Нават гмах Палацу чыгуначнікаў імя Ў.І.Леніна, аддадзены ва ўладу вятрам, пацукам ды прывідам, даўно не выклікае ў мяне пачуцьця няўтульнасьці. Наадварот, сваімі фанэрнымі шыбамі, абадранымі сьценамі ды разваленымі прыступкамі ён больш падобны да Рэйхстагу перад штурмам, чым да культурнай савецкай установы. Ён набыў веліч руінаў імпэрыі, стаў жывым экспанатам мёртвае эпохі. Можа, уся справа ў рэклямных шчытах Coca-Cola і Marlboro панад бляклай сьцяною гатэлю "Гомель". Ад сузіраньня іх «пить Coca-Cola» мне болей не закарцела, а пляц падаўся яшчэ больш убогім. Уся справа, напэўна, у тым, што акрамя гэтых новых намаляваных каўбояў краіны Marlboro, болей нічога новага ў гэтым горадзе не зьявілася. А ў мяне зьявілася жаданьне зьехаць адсюль гадоў гэтак на сто. Хаця б у тую ж краіну Marlboro. А безь мяне тут і ДК разваліцца канчаткова, і касьцёл дабудуецца, і Палац адродзіцца. Але ж безь мяне! Таму мне даўно ўжо ня страшна застацца тут назаўсёды.

* * *

Наколькі былі ўпэўненыя актывісты свабоднага прафсаюзу, якія наладзілі сустрэчу з дэпутатамі-дэмакратамі П.Данейкам і Л.Грызновай, што вольных месцаў у залі ДК Гомсельмашу ня будзе, настолькі ж яны і расчараваныя сваёй рабочаю клясай, якая знайшла больш патрэбныя заняткі ў гэты пагодны вечар. Хтось, напэўна, падаўся на пленэр, хтосьці заняўся рамонтам свайго Опэля, а хтосьці ўвогуле пайшоў па «Рэчыцкае». І толькі некалькі дзясяткаў пралетарыяў прыйшлі паслухаць дзеячоў грамадзянскага дзеяньня. Пра паралізуючы каляпс, пра бушуючую інфляцыю, пра інвэстыцыйны голад ды іншыя страхоцьці нашае сучаснасьці. Пра галоўную «ўжасьць» нашай зялёнай рэспублікі і, як зь ёй змагацца, таксама было распаведзена нямала. Згодна з усім, што гаварылася, хітаючы галавой, я ўпершыню ня мог асудзіць тую адсутную большасьць. Якая сапраўды мае рацыю, бо надвор'е сапраўды пленэрнае, бо Опэль сапраўды трэба рапараваць, а «Рэчыцкае» — увогуле фантастыка! Навошта кудысьці ісьці пратэставаць у краіне, дзе машыны і кватэры купляюцца за самыя гандураскія кошты? Дзе за ўсё адказвае табою абраны «свой мужык». У той час, калі ў Баўгарыі хлебныя чэргі, у тваёй краіне танны бэнзын. Калі ў Расеі стала нормай штодзённая зводка з забітымі і параненымі, у тваёй краіне разгон «нейкіх бээнэфаўцаў» — самае страшнае, на што асьмеліўся злачынны рэжым.

Але ўсё ж упершыню мне стала шкада нашага «ўкраіцеля», які так неасьцярожна ўставіў галаву ў экран тэлевізара. Баюся, перагрывае. І адзін на ўсіх пераменіцца ўсімі на аднаго. З замілаваньнем узгадваю той час, калі неахопная савецкая правінцыя зайздросьціла сваёй далёкай сталіцы, усім гэтым «Новым мірам», Таганкам і іншым сталічным штучкам, якія і блізка не пускаліся на правінцыйныя падмосткі і старонкі. Можа гэта самападман, але ў мяне такое адчуваньне, што ў нашай паўднёвай правінцыі беларушчыне іншым разам дыхаць лягчэй, чым у недалёкай сталіцы. Калі Цэнтральная кнігарня Менску не рызыкуе браць на рэалізацыю кнігу Энтані Сьміта, то тут можна ня толькі наладзіць продаж гэткіх кніг, але і прарэклямаваць «Нацыяналізм у XX стагодзьдзі» ў праграме мясцовага тэлебачаньня. Цікава, гэткі лібэралізм ад таго, што беларушчына не ўспрымаецца ўсур'ёз, ці, наадварот, успрымаецца як сталічная штучка?..

Андранік Антанян

Тры «М»



Сядзіш сабе на адным месцы. Паўгады сядзіш, год сядзіш. Нікуды не выяжджаеш. Бо ехаць кудысьці няма ніякай пільнай неабходнасьці. Ліставаньне зь сябрамі згасае праз пяць-шэсьць месяцаў. То з прычыны абодвагостарай лянoты, а здараецца часам зусім анэкдатычна — у самы апошні момант, калі ражок канэрты ўжо аблізаны, высьвятляецца, што ў кішэні «не зьвініць» нават на паштовую марку. Ліст адкладаецца да лепшых часоў, да якіх я даўно ўжо перастаў рыхтавацца. Тэлефонная сувязь... Пра што можна пагаварыць з чалавекам праз тэлефон? Ну хіба што пра надвор'е. Вось так і забываесься на йснаваньне людзей, зь якімі ў цябе ёсьць што ўзгадаць, і нават пра што пагаварыць.

Жывеш сам сабою. Варысься ва ўласным соку. Ходзіш па адных і тых вулках. П'еш адное й тое піва ў адной і той кавярні на Зарэччы, у Ёнаса. Ёнас, напэўна, найлепшы бармэн у Вільні, а «Калнапіліс» — найлепшае піва ў колішнім СеРу-СеРу, чэснае піянэрскае...

Сустракаючы нешматлікіх знаёмых, перамываеш адныя й тыя косткі адным і тым людзям. Уражаньне, што трапіў у вялізны атракцыён Колаагляд, сядзіш адзін у люльцы. Занудоціўся, а зьлезьці ня можаш. Застаецца толькі скакаць зь верхатуры ўніз. Во я й скокнуў.

Ляцець доўга не давялося. Проста на Замкавай сустрэў свайго сябручка Далюса, які займаецца праблемамі фармальнай лёгікі ў Інстытуце Філязофіі, а па сумяшчэньні — агрэсіўны сувалкійскі рэгіяналіст, які да таго ж спачувае сэпаратыстам, што робяць сваю справу на захадзе беларускага Палесься. Мы пайшлі ў краму, каб набыць па бутэльцы піва, але дайсьці да крамы не пасьпелі, як сустэлі Рамунаса. Калі мы ўтрох пачалі зьвяраць нашыя пляны ды намеры, то высьветлілася, што мы ўсе ў прынцыпе за тое, каб выпіць па бутэльцы піва на Зарэччы, на якім-небудзь даху аднаго з паўразбураных дамоў.

Спакойнай гамонкі ў нас не атрымалася. Бо я толькі вярнуўся зь Менску, а Далюс завёў размову «за палітыку». Распавядаць пра ўсё, што робіцца літаральна за 30 км ад гэтага дворыка, не было жаданьня. Проста прапанаваў хлопцам зьезьдзіць на тыдзень у Менск ды Магілёў. Далюс спаслаўся на брак грошай, дапіў піва й разьвітаўся з намі. Ну, а Рамунас зацікавіўся такой прапановай, таму мы пайшлі ў Стары Горад, каб выпіць яшчэ ды патэлефанаваць у Менск да нашага агульнага сябра Міколкі Рамаоўскага. Міколка з радасьцю згадзіўся нас прыняць, а мой магілёўскі сябручок Шыма нават прапанаваў зьезьдзіць разам ў Мсьціслаў. Карта йшла ў масьць, а таму нічога не заставалася, як змацаваць папярэднюю дамоўленасьць яшчэ кухлем сьвежага «Калнапіліса».

Вось так мы й паехалі. Распавядаць пра Менск не хачу. У Магілёве? Ну што ў Магілёве. Зайшлі ў касьцёл, зараз ужо асьвячоны. Увесь аўтар заліты пазалотаю, стары драўляны амбон зьнік у невядомым накірунку. Вообшчэм, зьдзелайце нам красіва, как у Бальшом цiятры. Я й раней меў падазраньне, што густы ксяндзоў, міністраў і прастытутак мала ў чым адрозьніваюцца...

Так заўсёды. Прыяжджаю ў Мсьціслаў — трапляю ў іншае вымярэньне. «Продоётся трохкомнотная квартира со всеми удобствиями». Люблю чытаць абвесткі, што расклееныя на аўтастанцыях беларускіх раённых цэнтраў.

Папуляцыя знакамітых мсьціслаўскіх коз, як на маё вока, не паменшылася. Горы засталіся такімі ж высокімі і амаль непрыступнымі. Вуліца Леніна пачынаецца адтуль, адкуль пачыналася раней. Хлеб — найсмачнейшы ў Беларусі, асабліва калі паліты найсьвяжэйшым мёдам, які назьбіралі пчолы спадара Маліноўскага. Гэтыя ж пчолы закусалі насьмерць суседзкага сабачку. Сабачак я баюся й адначасова ненавіджу. Таму мяне гэтая навіна ўсьцешыла. Рытм жыцьця тут не зьмяніўся ад часоў Першага крыжовага паходу. Людзі не сьпяшаюцца. І слушна робяць. Рэстаўратары рэстаўруюць. У ксяндзоўскім дамку жыве клерык з Камэруна, кажуць, чорны. Ён жаліцца на холад і паліць па начах грубку. На старых жыдоўскіх могілках — суніцы падагрэтыя сонцам. Зьеў парачку, каб прыгадаць той самы смак першай ягады. Колькі гадоў я ня сеў суніцаў?

Аднаўляюцца даўно забытыя водары і смакі. Сырадою, сухога дрэва, лугавых кветак і цыгарэт «Гродна». Водары Мсьціслава — за такую тэму мог бы ўхапіцца ці не любы пісьменьнік пэдантычнага XVIII-га ст. Толькі я жыву ў XX-м. Мая стыхія — хаос. Сьцяг — чорнага колеру. Я еду назад у места, якое па-расейску горад.

Апошні нядзельны аўтобус. Магілёўскія дзеткі мсьціслаўскіх бацькоў забілі ўвесь аўтобус, і стомленыя мамашы плаксівых дзяцей паўтараюць свае адвечныя словы: «Гавары па рускі. Гавары правільна».

Мсьціслаў застаецца чакаць свайго Патрыка Зюськінда.

Мастацтва непадроджаных



Алесь Белы
Ноч

Дзень жыве. Але сонца коціцца на захад. Дзень ведае, што трэба будзе паміраць. Ён толькі дзеля таго і жыве, каб потым павольна пазбавіцца ад грукату ў сэрцы. З свайго паміраньня ён робіць неблагое шоў, якім усе так любяць захапляцца, — захад.

Цікава назіраць, як сонца паступова зьнікае, але не апускаецца за нейкую рысу, а проста зьнікае: ці то ўваходзіць у воблака, ці проста рашчыняецца паволі ў небе, бы кавалачак засохлай аранжавай фарбы ў шклянцы з блакітнай вадой.

Ты думаеш: а як ТЫ будзеш паміраць? Гэтак жа марудна, як і дзень? Гэтак жа спакойна, як і дзень? Гэтак жа весела?..

У той час, як усе ўтаропіліся ў заходні край неба, разьвітваючыся з днём, ніхто чамусьці не скіруе свой позірк на ўсход, дзе ў гэты час нараджаецца ноч. Неба, тое блізкае неба, на якім увесь дзень плавалі аблокі, кудысьці зьнікае, адкрываючы чорную пустату з падвешанымі ў ёй зоркамі.

Панна ў чорным заходзіць у горад, накрываючы сабою кварталы, раёны. Людзі, як дурні, хаваюцца ад яе ў электрычным сьвятле, не разумеючы, што яна ўсё роўна іх пераможа. А ты не хаваесься ад яе, з радасьцю пускаеш у свой дом, і за гэта яна дае табе спакой, лёгкасьць і сьвежасьць.

Ты заўсёды думаў, што ноч — гэта час адзіноты. Адзінокія тыя, хто сьпіць, хто перанес сваю душу далёка-далёка. Адзінокі і ты. Тэлевізар толькі шыпіць, на радыёхвалях — толькі туркі з арабамі. Ты проста вымушаны быць адзінокім. Так хоча Чорная пані.

Ты часта думаў: ці будзе сьмерць такой самай, як і ноч? Ці будзе ў сьмерці столькі спакою і ціхага суму, як бывае ўначы? І калі яна прыйдзе, спадарыня Сьмерць?..

У доме насупраць сьвятло толькі ў двух вокнах — хутчэй за ўсё, забыліся патушыць. Выходзіш на балькон. Над табою —месяц. Ля цябе — горад. У цябе — Ноч. Паліш, і адначасова хочаш прабрацца на суседні дах, каб паглядзець адтуль на агонь сваёй цыгарэты. Ноч у зэніце. Ходзіш па кватэры. Хочаш думаць, але Ноч адабрала ў цябе галаву. Трэба класьціся спаць. Яшчэ адна цыгарэта на бальконе.

Засынаеш і думаеш, што раніцай усе будуць глядзець, як нараджаецца дзень, усе будуць захапляцца ўзыходам сонца. І ніхто не захоча зірнуць на захад, дзе будзе паміраць пані Ноч.

Менск

Яўген Саляйчук
Мой сон

Сёньня ноччу я прысьніў Бога. Прынамсі так разгадалі гэты сон мае знаёмыя. Я быў у незнаёмым горадзе. Быў ня сам, зь нейкімі людзьмі. Зьбіралася навальніца. Хмары насоўваліся на неба. Я выразна бачыў гэтыя хмары, і яны не былі вельмі чорныя, не выклікалі страху. Яны толькі прыцягвалі маю ўвагу.

Мне чамусьці вельмі хацелася глядзець уверх, на неба. І я глядзеў. Бачыў, як мільганула маланка, раз, другі. Маланка была маленькая, выгнутая ў падкову. Але грому не было, не было і дажджу. Цікава, што гэта не падалося мне дзіўным, я нават гэтай акалічнасьці проста не заўважыў.

Мяне цягнула глядзець на неба. І я ўбачыў, як хмары паступова, у адным месцы, разышліся. На блакіце чыстага неба зьявіўся чалавечы твар, вялікі, прыгожы, нібыта створаны з аблокаў. Вочы на гэтым твары былі заплюшчаныя. Я глядзеў на гэты твар зусім адкрыта. Страху не было, была цікаўнасьць і чаканьне. І я ўбачыў як вочы паволі расплюшчыліся. З таго месца, дзе павінны быць зрэнкі, палілося сонечнае сьвятло. Навокал захоўвалася пахмурнае надвор'е. І праз гэтую шэрань струменілася сьвятло на зямлю. Я ўглядаўся ў зрэнкі. Здавалася, што я бачу празь іх, недзе далей. Я ня ведаў, што там, за гэтымі зрэнкамі, я проста адчуваў, што там пануе спакой, радасьць, упэўненасьць. І праз струмяні сьвятла, якое лілося з зрэнкаў, гэтыя спакой і радасьць ішлі на зямлю. Потым вочы заплюшчыліся ізноў. Паволі ўсё зьнікла. Я пачаў сьніць кароткія, незразумелыя сны.

Калі я прачнуўся, у мяне чамусьці ўзьнікла шкадаваньне, што гэта быў сон...

Мая знаёмая пані Алена, як і ўсе сказала, што я бачыў Бога. Але яна сказала больш. Хмары і навальніца, якія я бачыў у сьне — гэта нейкі змрочны пэрыяд, які насоўваецца на Беларусь. Бог заплюшчыў вочы на наш край. Але Ён раскрые іх і пральле сьвятло на нашу зямлю, на наш народ. Пані Алена ня вельмі цікавіцца палітыкай, амаль абыякавая да яе...

Пінск

Зьміцер Ка
The end

Мне падабаліся сьвітанкавыя сьцёкі на сонны бульвар, лямант першых тралейбусаў і яшчэ раней — напружаны шэпт, як фон, звон у вушах ці, лепей сказаць, напружанасьць, калі хочацца адчуць сябе тэлевізарам, але час ранішніх праграмаў яшчэ не настаў.

У вачах пырхаюць каляровыя палосы і плямы, ва ўрыўкі ілюстрацый леташніх часопісаў упісваецца моцная, усепранікальная пыкота гадзіньніка... Хтосьці спускае ваду ў клязэце, а потым клыпае, натыкаючыся на зэдлікі ў напоўненай тытунёвым дымам прасторы. Постаці зьмяняюцца, як кадры ў нямым кіно, ты спрабуеш намацаць трывалую, як суворая нітка лінію, але сюжэт рассыпаецца ў безаблічны хаос дзьвярэй і вакон з дадатковымі таблiцамі твараў і голазадых пахмылак.

Лёгка дыхаецца, калі паліш з расчыненага вакна, стрымліваеш млосьць... Засаленыя валасы... Наўмысны кілок назад — гэта, каб пераадолець жаданьне выкінуцца.

Бязглузда жыць і гразнуць, як нехта казаў, калі ты падзелены на квадраты і сантымэтры жылплошчы. Людзі ў плашчах сьпяшаюцца на працу, у вачах холад. Дворнікі сколваюць лёд, які растае і чымсьці нагадвае пра зіму. Усё імкнецца скончыцца, як скончыліся запалкі у тыпа насупраць:

— У вас спичек не будет?

Запытальна маша рукамі і гумова шчэрыцца. У мяне баляць вусны і дрыжаць пальцы. Мы палім і глядзім на транспартны паток —транспарцёр. Ня так даўно сьцёрлі транспаранты... Ці надоўга? Людзі раскладаюць і складаюць парасоны — жагнаюцца. Вясна? Колькі можна біць стомэтроўку ў гэтым патоку. Ён моўчкі азіраецца і, трасучы бутэлькі ў авосьцы, сьпяшаецца ў пункт прыёму шклатары. Авось? «Авось» дабяжым да тралейбуса, галоўнае ўскочыць, а там пабачым, ці свой.

Нашы рыпяць на канапах, нашы ўсьпіраюць валізкі на пяты паверх, нашы штурмуюць электрычкі, баючыся, што электрычнасьць скончыцца, адкручваюць лічыльнікі назад. Нашы? Плюю ў вакно і чакаю, калі ляснуць дзьверы, і нехта будзе абурацца... Не. Сьцярэ плявок і рушыць далей, паўз газон, які выскублі дзеці і абгадзілі каты, паўз валасьцёкі, з расчыненых фортак сьцякае сьліна і саплівы вецер палошча сьцягі. Нашы! Гуляюць у сьнежкі і запускаюць паветраных зьмеяў, ад якіх шугаюцца птушкі забэтаванага неба.

Цішыню расколваюць крокі з пляцоўкі, хтосьці торкае ў замок і, прыліпаючы пальцамі да жуек (дзеці), мацюкаецца штосілы і яшчэ, яшчэ колькі разоў, кожны вечар чаканьне ранкаў, праломлены пуф і крываногі зэдлік, узмылены блакітны экран і позіркі, позіркі, позіркі...

Мазгі праванялыя да столі, як росчырк па паперы — трэцяе арыфмэтычнае дзеяньне, нявывучаныя фоткі памерлай бабулі і сьлізкія прыступкі — поўны змрок, праз заседжанае мухамі шкло няправільны сьвет, фанэра, каб сонца толькі па ліміце — ноч, каб быць з дамешкамі музыкі, і выціснутая нечым цэлам шыба, патрушчаныя талеркі марынаванай гародніны, гарэлачны дух і плямы ад віна на абрусе. Дотык да скроняў — пошук нечага прахалоднага, пасьля гарачых імгненьняў хочацца кавы ці проста хлёраванай вады з-пад крану.

— А, куды ты будзеш пісць? — пытаюцца за вуглом на Трынаццатай. «... от улыбки станет день светлей...» — на вялікую радасьць бухарыкаў чуецца ля шапіка зь півам. Далёка адсюль завывае «хуткая дапамога». Мне зьверху добра бачна. «Глядзі ты, як ў казцы...» — зьдзівіцца нехта (бо мой паверх апошні) упэўнены, што мяне больш ня будзе.

Там запальваюцца агні вялікага гораду. Зь цемры нехта некаму даводзіць, што:

— Ты памыляесься... Сабакі ня кажуць праўду, яны толькі брэшуць..

У забармочанае паветра хочацца крыкнуць і, завіснуўшы ў атмасфэры, сьпікіраваць на дзіцячую пляцоўку. Але я буду жыць... Я маўчу, я маўклівы... Таму буду жыць.

Дойлід, калі ты ствараў гэты сьвет, што ты думаў? Утыкнуўшы галаву ў калені, не схаваесься ад сьмерці — гэта ня толькі бачаньне, але й адчуваньне, як крышыцца ня мармур, а гліна і, ты ведаеш, другой Марыі ня будзе. У цэрквах, якія былі —будуць птушкі, у храмах, якія ёсьць — прысутнічаюць людзі, на ростанях сыходзяцца і разыходзяцца, губляюць і знаходзяць і гэтак далей, акумулюючы чорна-белыя кадры — кароткія прамежкі, і ня болей.

Зрэдку здаецца, калі гаснуць рэклямы, сьцішваюць хаду магістралі, затанчваюць месцамі матылі, ліхтары, прадзіраючы цемру, надумана ўдаюць дзень, і кароткія цені — вечная супольнасьць. Дзе-нідзе паблісквае бітае шкло, нехта памірае ад інсульту ў ложку прастытуткі, заглушаныя шторамі цяжкія ўздыхі ненасычанага жаданьня.

Першы досьвед у змрочнай падваротні, цёплыя надпісы, халодныя рэфлектары рэльефяць сьпіну і прышрубаваны стогн лезе пад вопратку, ірванай тканінай лопаецца цемра, распальваючы вогнішчы, каб спаліць сябе... Не заўважаючы нас, ломяцца людзі, хрыпяць на гітарах далёкія водгукі грамадзянскай абароны, у загазаваным паветры шморгае вецер, закладваючы за пазуху сухое лісьцё і колкі пыл.

Мы сьпяшаліся на несваё цягнікі. Здавалася нешта. Імгненныя фота з архіву памяці. Лісты ці то па той бок мяжы, ці то сябру ў суседні квартал. Недарэчнасьць, узятая з бруку, якога даўно ўжо няма. Летапіс марозіва, выгодная пазыцыя і ўводзіны ў гісторыю складаньня альфавіту, прынцыпова мацнейшае шкло, зжаваная магнітафонная стужка ці памадка. Расчыненае вакно, кавалкі падваконьня, напал лямпы ў сьвеце ценяў, каляровы асфальт, вітрына гастраному. На рагу Трынаццатай сустракаліся двое. Гэта як ісьці на захад і не зьвяртаць увагі на розныя анамаліі — калючы дрот, што завіткамі цёрню цягнецца ў неба, нібыта працяг зямлі — мэталёвыя ружы, згублены ключ ад кватэры... Усё складае хаос, зразумелы толькі ім.



Малюнак Андрэя Скідана

Дарэмна завучаная музыка, паркавыя сьцяжынкі, выкладзеныя прыгожымі камянямі, прагнуць наўтопу, напоўненыя сьмецьцевыя бакі чакаюць ранку з аранжавымі падмятайламі. Мы будзем гаварыць пра лёгкі згублены вецер і мець на ўвазе душы ў вечнай абстракцыі зь верай па той бок сьвітанку. Выводзіць формулы каханьня і чакаць новых кватэраў, і лепшых часоў... Гэта тэрмін, патрэбны сабачніку на выгул сваёй істоты, нападкі ў тралейбусе, ранішняя чарга па дзённую мэлёдыю, алавянае срэбра і медная золата.

Нас выштурхоўвае плошча, зь верай у сьветлую будучыню мінаем чыгунную абгарожу, з дынамікаў рэпрадукуецца магчымасьць забыцьця. Шаркаюць падэшвы, нехта імкнецца да імправізацыі. Гледачы зь мінакоў і тых, хто працуе на зьбіраньні пустых бутэлек, цікуюць за маніпуляцыямі тынэйджараў. Народ валіць скопам, затуляючы сабой расьліннасьць, мацюкаецца з-за месцаў. Звыкла закручаная плытка рокэндрольных рытмаў — задаволена вішчаць ад фанэры, фатаграфуючы сабе падобных, крывяцца. Бомж з тоўстай цёткай атупела вальсуе пад рэйв, час ад часу падскокваючы, пляскае ў далоні, і гнілазуба хіхікае.

Нехта за пультам сашчурыўся і, прыціснуўшы позіркам натоўп, хапае мікрафон:

— Граждане! Не топчите газоны... Они у нас одни!

На пляцоўцы суха шчоўкае — дух раскаванасьці, дынамікі глуха загулі, выплёўваючы і картавячы наступны сынгл, дыскжакей зьбег перахапіць лішку. Вякнула рэха, спакаваныя пачуцьці пачалі распакоўвацца, патыхала зялёным лісьцем і скурай.

— Я надеюсь, что здесь присутствуют интелектуально развитые люди и все обойдется без ненужных эксцесов... — бухнула раптоўна праз музыку і зусім нерытмічна змоўкла, як звыкла і завучана не паводле камічнага рэцэпту, зь ня «ўсімі дома», далёка не рэклямнага фармату аднекуль з-за рогу. Паралітычна датыкаецца да нас, нешта гнілое ў зялёным фрэнчы і прыспушчаных портках, заходзіцца ў чымсьці далёкім да блізкасьці.

Гэта лета.

Лета можа скончыцца, як канчаюцца дыскатэкі, і прысутныя разыходзяцца ў цёмных, тубэркулёзна-сырых прысадах парку. Вокны старых муроў апаломлена гаснуць. Адно за адным хаваюцца ў змрок. На газонах пахнуць кветкі, і рамантыка даводзіць да выкарыстаных прэзэрватываў. Вечар скончыўся, як скончылася лета. На паркавыя лаўкі асядае туман, загуслы да кандэнсацыі расы, ловіць нешта з хмарнага неба — Нішто ня сьвеціць нам. Можа толькі здані і апошні, падобны да птушынага, крык. А можа, сьмех?

Мы перасталі адчуваць сьнег, намаляваны на вусны ці макулатурна рэльефны праз шкло. Пальцы, як раскіслая маса, утыркаюцца ў клявішы раялю ягонай сяброўкі, гульня плястылінавымі сьнежкамі і плястыкавае паветра, нейкія дзеці і жоўтыя сабакі — востракутны сьвет гарадзкога двара, пакой у 17 квадратаў і іржавае бідэ.

Бяда ў тым, што ніхто, ніхто з нас не спрабаваў лавіць ластавак, а толькі ў самым дзяцінстве — мыльныя пульхіры. Няма нават фота, а калі ёсьць, дык пад голым небам цаглянай сьцяны. Колькі нас таптала іржавыя дахі, бегла ў даль, дзе не сканчаюцца рэйкі, і замызганы аўтамабільчык дзядзечкі-інваліда тарахцеў амаль цэлыя суткі.

Мы не былі ў Нью-Ёрку, не пражывалі ў Чыкага, хтосьці марыў пра Лёндан, сплёўваючы на падлогу сваёй камунальнай кватэры, дзе пад голым небам электрычнага сонца жылі і верылі, што ён прыйдзе, дзе млявыя твары суседзкіх дзяцей нагадвалі гарачы смог вечара, дзе ў напаленых мэрыдыянах жыцьця расплываліся цыгарэтным дымам агні вялікага горада... І было дадзена аднойчы — мэханічныя цацкі, галовы парцалянавых лялек, вераб'іны гам, толькі аднойчы перасьцеленая ноч у віленскім гатэлі... Дзяцінства, якое пахне пылам з вулачак Рыгі і Вільнюса — вобразы, згубленыя паводле прынцыпу «такпатрэбнасьці»... Млосна і бязважка. Апошняя газэта, апошняе намаганьне і ўжо без абрыдлівага хэпі энду.

Гомель

Адам Глёбус

Грыгеры

Сьмерць любіць праказіцца на машыне «хуткай дапамогі».

Саборы — амбасады Бога.

Каштан — вожыкавы яблык.

Хада сьцюардэсы ня можа быць цяжкай.

У Швэйцарыі аблокі робяцца з малака, а ў Галяндыі — зь вяршкоў.

Падчас пазяханьня трэба прыкрываць рот, бо душа ўцячэ.

Калі ў халасьцяка памірае маці, ён робіцца ўдаўцом.

У басэйна твар пакрыўджанага гішпанскага караля.

Самыя непатрэбныя рэчы ў кватэры — падарункі.

Жыцьцё — аднаразовы шпрыц.

Аснова кулінарыі — сьліна кухара.

Чуткі — найкаштоўнейшы матэрыял, зь якога ўтвараюцца міты.

Машына часу ёсьць у кожнага чалавека — гэта памяць.

Нават самы найлепшы сябра любіць сябе болей, чым цябе.

Злодзей прыходзіць да разявакі.

У школьным ранцы круглы год жыве раніца першага верасьня.

Сьмерць, як лекар, ходзіць у белым халаце.



Паэту цяжка сказаць нешта такое, што да яго не гаварылі, таму і стварае паэт новую мову.

Нават ні разу не апранутая кашуля хутка старэе.

Вораг — пераапрануты сябра.

Пакупніка адштурхоўвае не вялікі кошт, а кепскі прадукт.

"Перамогі ня будзе!" — менавіта з такім перакананьнем ідзеш на бой.

Могілкі — склад старых макінтошаў.

Прывіды нараджаюцца ў люстэрках.

Грыгеры — жарты, якія робяць выгляд, што яны афарызмы.

Мэдыцына — найпапулярнейшая ў XX ст. форма рэлігіі.




Сапраўдны сацыяліст той, хто ня хоча мяняць свой сацыяльны статус.

Нацыяналіст — гэта гісторык, які стварае рамантычнае мінулае нацыі.

У мроях лунае зародак хімеры.

Можна не сумнявацца, што электрычнасьць і сродкі масавай інфармацыі вынайшаў Д'ябал.



Кароль жыве ў кожным чалавеку; кепска толькі, што большасьці каралёў не хапае слугаў.

Юда — найвялікшы драматычны актор у хрысьціянскім сьвеце.

Рэўнасьць вынайшлі брыдкія жанчыны.

Грахі — учынкі, якія прыемна згадаць.

Калі зірнуць на людзей з другога паверху, здаецца што яны ўнурыліся, глядзяць у зямлю і маюць кепскі настрой.



Надыходзяць і такія часы, калі нават звычайнаму літаратару нічога не застаецца, як пісаць таемны дзёньнік.

Падманшчыка пазнаеш па сур'ёзным твары.

Калі вымаўляю «прырода», уяўляецца краявід з высокімі зялёнымі дрэвамі.

Алесь Чобат. Новая Галілея. Вершы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1995.

Па-за часам

У мястэчку жыве паэт. Ходзіць па вуліцах, п'е каву, піша вершы. Ягоныя творы час ад часу зьяўляюцца ў сталічным друку. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», як і мае быць, два разы на дзесяцігодзьдзе выдае кніжку ягоных вершаў. Кніжка раскупляецца ў мястэчку сябрамі, сваякамі ды проста знаёмымі. У сталіцы яна ляжыць у кнігарнях і паступова ператвараецца ў Энцыкляпэдыю дактыляскапіі: у рукі яе браць — бяруць, гартаць — гартаюць, але купляе мала хто. Літаратурныя крытыкі пра паэтаву кніжку маўчаць. А паэт складае ў сваёй правінцыі новыя вершы, якія чытаюцца і ўспрымаюцца ягонымі суседзямі й сябрамі «на ўра». Бо ён, вядаць, піша ня толькі для сябе, але й для іх.

Для яго не йснуе такой праблемы, як тэма для верша. Ён можа напісаць і пра родную вуліцу, пра палітычнае становішча, пра станцыю Парэчча, пра апошняга савецкага маёра. Можа пра каханка з каханкай ды ейным мужам. Пры гэтым умудрыцца ўплесьці ў звычайны чалавечы трохкутнік фразачку «але ўсіх трох напаткаў пракляты савецкі лёс». І нічога. Паэт з правінцыі чалавек шчыры. Умоўнасьці для яго не йснуюць. Мяркую, ён ведае пра тое, што ў сталіцы эклектычнасьць лічыцца праявай дрэннага густу. На правінцыі прыкмета дрэннага густу — азірацца на сталіцу.

У вершах Алеся Чобата багата цытатаў, якія пазнаюцца пры наяўнасьці мінімальнай літаратурнай эрудыцыі. Постмадэрн? Магчыма. Акцэнт ставіцца ня столькі на перапрацоўку чужых радкоў, атрыманых у спадчыну (а значыць, у пэўным сэнсе «на халяву») пры дапамозе кантэксту, колькі на тым, што сукупнасьць беларускіх правінцыйных сюжэтаў апошняга стагодзьдзя не вызначаецца разнастайнасьцю. У лепшых вершах Час, як вымярэньне, што дапамагае нам азірнуцца ў прасторы, заззвычай адсутнічае. Паставіць дату пад імі немагчыма.

У Вільні — як у Вільні. Цэлы сьвет.
Старыя брукі. Цесна ад касьцелаў.
Аблокі нізкія над вежай Гедыміна.

Паэзія існуе па-за часам. Калі сказаць гучна — у вечнасьці. Алесь Чобат пра гэта здагадваецца. Ён здагадваецца пра тое, што гісторык павінен азірацца назад, трактар — гудзець песьняй баявой, партызан — мініраваць мост, а паэт — не шкадаваць слоў.

Толькі вось ніхто ня ведае, хто паэт, а хто невядома хто.

Андранік

Калгасная плянёрка

Працяг са старонкі 1.

– Ты ў мяне дождж прасіў усё лета, кожнай раніцы заказваў. Я цябе яго прысылаў. Пара атвыкаць ад парцыйных прывычак. Мы жа не на Луне жывем, не ў ЗША вядзем сельскахаазяйственнае праізводства. Штоб я большэ не слышал разгавораў аб том, што вы не купілі плашч ілі зонцік. Хто сьледуюшчы?

– У заражаных радыяцыяй вёсках у нас толькі па 15-17 працэнтаў працаздольнага насельніцтва, няма каму рабіць.

– Баюсь наклікаць на сібя вой апазіцыі, которая міня хоча атрашыць ад уласьці. Але мы паедзем у самую страшную зону, гдзе не ступала нага чалавечаская і наладзім там праізводства сельскахаазяйсцьвеннай прадукцыі. Зімля не даўжна пуставаць. Эта – растачыцельства. Хай скажа ціпер сваё вескае слова наш перадавік, калхоз мільянер.

– У нас у «Прагрэсе» мы на круг зьнялі па 50 цэнтнераў ячменю з гэктару. Пастаўкі не правалім. А калі што, то мая галава першая с плеч. Адна бяда, трактары. У некаторых за месяц па два разы мянялі двігацелі. А напружаньне на жніве мы саздалі. Воўрэмя паставілі цехніку на лінейку гатоўнасьці.

– Слышаў, Лукашоў? На сваіх пляччах панясеш гэты трактар у мехмасьцярскія і атраманьцірыеш за свой шчот.

– Мы ў Валеўцы абсалютна справядліва васпрынімаем вашу крытыку а камбайнах. У срэду астаўшыяся ўступіць у бой. Пакуль маем 23 цэнтнеры з га, а вучоныя абяшчаюць...

– Учоныя кароў вам даіць не будуць і быкоў карміць тожа. Очань важна, што этат наш разгавор слышаць усе мэханізатары. Хацеў бы выразіць благадарнасьць труджанікам палёў і фэрм. 600 тон у нас застаецца на палях – столькі, сколькі мы закупляем у год за граніцай. Так што нада пранікнуцца гасударсьцьвеннай атвецтвеннасьцю. У чрэзвычайным рэжыме работаць. Саздаць брыгады кантроля. Дайсьці да кожнага мэханізатара. Работаць і ноччу. Гасподзь бог нам прадаставіў пасьля двух гадоў засухі харошы хлеб на карню.

(Прысутныя хорам: «Сагласны!»)

– Чрэзвычайнае функцыяніраваньне народнага хазяйства ў аўгусьце-сенцябрэ. Любое працівадзействые на местах будзе расцэньвацца як сабатаж. Нія працэсы будуць неабрацімы. Я абяшчаю крэсьцьянам і фэрмерам, што вазьму на кантроль. Хачу падчэркнуць то напражэньне і заботу, каторыя я праяўляю. Таварыш Бойка, слышыце?

– Слышу-слышу.

– К кожнаму зёрнышку з чуўствам настаяшчага хадзяіна. Забудзем забастоўкі, астраненьне ад уласьці прадсядацеля адложым на восень. Усе на ўборку ўраджая! Ад гэтага завісіць прадавольсьцьвеннае благапалучые і безапаснасьць гасударства. Я веру ў свой народ. Есьць шанц пераламіць сітуацыю ў лучшую сторану. Будзе хлеб, будуць і песьні, нашы – дзеравенскія.

(Аплядысмэнты ў памяшканьні).

– Ні нада. Спасіба. Чалавек – глаўная фігура на ўборке. Вазрадзім традыцыі маральнага пашчрэньня. Прыдумаем палажэньне аб унутрыхазяйсьцьвенным сарэўнаванні на ўборцы. Самаацьверджаная работа на ўборцы заслужвае і гасударсьцьвенных нагрaд. І няважна: камунісьцічаскае, сацыялісьцічаскае ілі капіталісьцічаскае гэта будзе сарэўнаваніе.

(«Правільна!» – ухвальная рэпліка з боку слухачоў).

– Работнікі прэсы, шырако асьвячайце ў пячаці ход уборкі! У газэтах даўжны быць не фатаграфіі міцінгаў, агалцелых паліцыкаў, а – мэханізатараў, як у нашы ўрэмена.

Ціпер пра страцегію і такціку. Упасі гасподзь, будзеце салому складаць у стагі, потым спаліце і дажа не запашыце. Упасі гасподзь, будзе трэбавацьад сельскіх пэнсіянераў бутыль самагонкі ілі водкі. Спрос будзе жалезным. Аб страцегії. Калхозы і саўхозы кормяць страну і ім альцернацівы няма. Саздайце напражэніе зьверху донізу, да мэханізатара – как у пряжнія ўрэмена.

Сідзяшчыя ціпер у цілівізара мэханізатары, якія слухаюць свайго прэдсядацеля, спросяць у ажырэўшых паліцікаў, чаго яны пад рознымі флагамі ходзяць. Спрос за анціпрэдсядацельства, за анцікалхозную прапаганду будзе жалезным. Я кацігарычаскі запрэшчаю ўсякія міцінгі і забастоўкі. Кагда крэсьцьянін работае ані занялісь атрашэньнем міне ад уласьці. Усе даўжны работаць. А я ешчо два срока буду. Усем на зло. Я гатоўлю запрэшчаюшчы ўказ.

Утром нос цем, хто сьпіць і відзіць, што мы правалілі ўборку.


Заслона.

Сяргей Астраўцоў



Стары гарадзкі краявід

Конкурс



Здавалася, усё проста: бажніцы на тое, каб у іх маліцца, музэі на тое, каб зьберагаць і дэманстраваць рэліквіі і мастацкія творы, стадыёны – для спорту і відовішчаў... Наша стагоддзе шмат чаго зблытала. З бажніцаў рабілі і крэматорыі і вядзабары, у музэях раней ладзілі чырвоныя куткі, а цяпер уладкоўваюць офісы, а на стадыёнах сёньня кірмашы.

Дзевяноста гадоў назад, калі «Наша Ніва» толькі пачынала сваё жыцьцё, усё было на сваіх месцах. І тады на стадыёнах былі ўрачыста ўбраныя людзі. Яны прыходзілі, каб адпачыць, папракты-кавацца ў нязвыклых фізычных забаўках, паслухаць музыку, выпіць гарбаты...

З тых стадыёнаў нельга было зрабіць ні канцэртнай арэны, ні кірмаша, ні канцлягера. Усё было на сваіх месцах. Пачатак стагоддзя абяцаў трыюмф розуму і хараства.

Што выяўлена на гэтым здымку? Які гэта горад?

Чакаем Вашых адказаў...

Сяргей Харэўскі

Інспэкцыя

6 жніўня супрацоўнікі «Нашае Нівы» правялі своеасаблівую інспэкцыю ў Нясьвіжы і Міры з мэтай высьвятленьня стану помнікаў матэрыяльнае культуры. Арганізаваць выправу нам дапамагло сумеснае беларуска-польскае прадпрыемства «Arbor», якое спэцыялізуецца на рамонтных і будаўнічых работах, за што рэдакцыя выказвае падзяку.

Дарога

Па ўсёй берасьцейскай шашы вядзецца інтэнсіўны рамонт. Балазе, пакуль да 1 лістапада тут можна езьдзіць бясплатна. Грошы, выдаткаваныя Эўрапейскім Банкам Рэканструкцыі і Разьвіцьця яшчэ два гады таму, пасьпяхова лясьнулі ў прэзыдэнцкіх калідорах, а хоць нешта з шашою рабіць трэба. Таму за яе рапарацыю давядзецца плаціць усім, хто па ёй езьдзіць. У тым ліку і нам. А каб не ўзьнікала пытаньне «за што?», – езьдзяць і езьдзяць дзелавітыя каткі і самазвалы. Работа кіпіць.

Мір

Напэўна, увесь цэнтар Міра пабялілі за адзін дзень, але ён выглядае ўрачыста. Усе дамкі залепленыя новымі шыльдамі прыватных крамак і кавярняў. Усё па-беларуску, але так мудрагелiста «гатычна», што цяжка разабрацца, дзе што. Будзены дзень, але жыцьцё кіпіць, як перад фэстам: турысты, пасажыры аўтобусаў, мінакі, дзеці і гатовыя спатоліць смагу мужчыны таўкуцца на пляцы між крамак, яткаў, кавярняў. Чуваць і польскую і літоўскую мовы. Касьцёл аднаўляецца павольна, цагліна за цаглінаю, але рознакаляровыя шкельцы ў сыгнатурцы над абсідаю і новая дахоўка абавязкова трапляюць у вочы. Усё мяняецца, хоць нішто нікуды не цячэ.

Рэстаўрацыя

У старым парку вакол капліцы-пахавальні шчыруюць хлопцы: косяць траву, зграбаюць сьмецьце. Навучэнцы рэстаўрацыйнай вучэльні. Толькі чаму ў жніўні? Можа, троечнікі, а можа абітурыенты? Сама капліца ўжо занядбаная дашчэнту. Хіба абавязкова спачатку зрываць картушы, выломваць дзьверы, чакаць, калі пагніюць масьніцы і пацячэ страха, каб пасьля ўсё браць на пуп?


Замак ужо набыў прадстаўнічы выгляд. Можна вазіць дэлегацыі, ладзіць банкеты. У паўднёва-заходняй вежы, самай старой, ужо дзейнічае прыстойная экспазіцыя, і толькі дасьведчаны адрозьніць копіі ад аўтэнтыкі. Чаго яшчэ, на шчасьце, не даўмеліся, дык пазафарбоўваць бел-чырвона-белыя сьцягі і «Пагоні», а таму ў замку жыве пакуль Беларусь такой, якой мы марылі яе бачыць яшчэ два гады таму.

Тэмпы рэстаўрацыі і тут павольныя, але ўжо ёсьць адчуваньне не незваротнасьці. Пакуль будзе даробленая апошняя кавалак муру, першы набудзе «сапраўдзічны» выгляд. Хоць часам недаробкі рэжуць вока. На ўваходзе ў замак выкалі з сучаснай цэглы і штучнага каменю абрысы падмурку агароджы канца XVII ст., але на сёньня гэтая «навуковая» дэталь ужо раструшчылася.

Калі стаіш пад час дажджу на галерэі, слухаеш, як бомкае вада па дахоўцы, а ўнізе працуюць і працуюць людзі, стаіновіцца спакойна. Калі што будзе ня так, прыйдзе час, можна будзе выправіць. Але дзясяткі людзей ужо ганарацца тым, што яны робяць...

Нясьвіж

З будынкаў езуіцкага кляштару выводзяць вайсковую частку. Вельмі ахайна і чыста. Войска ўжо як бы сваё. Пераяжджаюць у ... дамініканскі кляштар. Ну, не ўсе адразу. На касьцельных дзьвярах расклад імшы: па-нашаму і па-польску, як, дарэчы, і ў Міры. Чалавек мацуе над галоўным франтонам крыж. Спыніўся на хвіліну. Расьпяцьце. Наноў пабялілі Слуцкую браму... Сьведка авантур... У «Доме на рынку» – дзіцячая бібліятэка. Адрэстаўравалі, разбурылі старасьвецкі ганак, замянілі бакавыя сьцены, драўляныя на мураваныя. Усе лепшае – дзецям.



Сюррэалізм

У пагодлівы летні дзень цяжка пазбавіцца адчуваньня сюррэалізму ўсяго, што робіцца ў Беларусі сеньня. Асабліва гэта заўважаеш у малых гарадах і мястэчках, дзе кантраст паміж учарашнім і сёньняшнім сфакусаваны максімальна.

Уязная брама нясьвіскага замку сёньня аздоблена навокаю манаграмаю Радзівілаў. Але тутака ж падноўленая шыльда па-расейску, якая сьведчыць, што тут у 1917 годзе адбыўся сход Саветаў, а насупраць – шыльда па-беларуску, якая нагадвае, што гэты замак – помнік. А роўна пад радзівілаўскай манаграмаю – шыльда «Межколхоздравница». Ну дзе яшчэ побач пабачыш статую босай савецкай жанчыны (1962), якая шпурляе мадэль спадарожніка і постаць прывіда Чорнай дамы рабоні Янушкевіча? У старым парку яшчэ не закончаныя працы па пабудове разьвітога фэадалізму: пасьля ўшанаваньня памяці радзівілаўскага сабакі, прыступілі да Коласаў, Сіроткаў, Бэрнардоняў. А на цэнтральным пляцы, перад ратушаю, на якой ужо каторы год вісіць ахайная шыльда «Помнік архітэктуры. Вядзецца рэстаўрацыя», стаіць блакітны Ленін. Ільліча толькі што патынкавалі і пафарбавалі. У Нясьвіжы шмат помнікаў! Над райсаветам лунае чырвона-зялёны, а на кратах парку яшчэ вісіць «Пагоня», перад замкам яшчэ гарыць «вечны агонь» (сюды б інспэкцыю «Газпраму»), а за замкам, у парку ўжо смуткуе Ундзіна.

Замак

Гадоў дзесяць я ня мог пабачыць інтэр'ераў палацу. Ня змог і на гэты раз: руплівая вахцёрка адпраўляе ўсіх да лекара. У галоўнага лекара я ўжо бываў ня раз. Разгар курортнага сэзону. Поўны палац народу. З вокнаў зьвісаюць пакеты, ручнікі, станікі, майткі. Пахне шпітальнаю кухняй. Заросль зьмяяліся роў.

У парку няма ўжо Японскай альтанкі, зь ёю хутка ўправілася моладзь. Але з новымі гранітнымі львамі на прыстані ўправіцца будзе цяжэй. Хаця... Дрэва «японскага мастка» не пасьпявае цямнець. Ну ня можа яно стаяць, калі можна паламаць. Між іншым, ужо прыдумалі добры ход – адзін масток зроблены з бэтону. Студня Ундзіны ўжо амаль цалкам закіданая пустымі пляшкамі. Як праходзілі міма замка ў першы раз, шапік «Кнігі», які запоўнены таварамі народнага спажываньня (зразумела, ня кнігамі) быў адчынены. Па вяртаньні з парку заўважаем – ужо замкнуты. Хацелася штонебудзь на памяць набыць...

Палякі

Палякі ў Беларусі ёсьць. Праўда, плён іхняе дзейнасьці мізэрны ў параўнаньні з дасягненьнямі палякаў Літвы. Беларуская пальшчызна сапраўды выглядае маргінальнаю, нягледзячы на салідны гістарычны падмурак. Чаму? Меншасьць этнічная зазначаецца ў правакацыях. У выніку двухбаковых правакацыяў меншасьці і большасьці мацуецца самаідэнтыфікацыя, меншасьць становіцца суб'ектам права, культуры, палітыкі. Гэтае правіла пацьвярджаецца ў Канадзе, Літве, Гішпаніі, Малдове, Брытаніі. Але не ў Беларусі. У нас ніхто ня цьвічыць палякаў, а іхнія правакацыі праходзяць незаўважанымі. У Нясьвіжы на будынку Саюзу палякаў (плябань XVI ст., адзін з самых прэстыжных дамоў места) руплівцы зьмясьцілі вялікую шыльду «ulica Mickiewicza», а беларусы не заўважылі, бо і самі ня надта цямяць, колькі моваў у краіне дзяржаўных і дзе яны мусяць ужывацца. Этнічныя правакацыі ў Беларусі марныя. Каб нешта такое адбылося ў Вільні, гвалту было б на колькі гадоў наперад. Можа таму і самім палякам нецікава ляпіцца ў апазыцыю да большасьці, якая не разумее, у чым праблемы з палякамі, расейцамі, жыдамі ці яшчэ з кім. Дарэчы, пра Вільню: у мірскіх ятках гандляркі разглядаюць каляровыя часопісы «Magazyn Wileński». На пытаньне, адкуль яны іх дастаюць, з ахвотаю тлумачаць, што іх дасылае пачкамі Саюз палякаў Беларусі. А насупраць, на касьцельным цвынтары, зарасьлі быльнягом магілы польскіх жаўнераў, на іх – сьвежы конскі гной. Вось чаго немагчыма пабачыць у Літве, дык такой індыфэрэнтнасьці.

Дуалізм

На адваротным шляху мінаем Новы Сьвержань. Едзем наўпрост праз старажытнае мястэчка. Зьлева касьцёл, справа царква. Амаль насупраць адзін аднаго, на пагорках абапал дарогі – два помнікі рэнэсансу. У XVI ст. сёньняшні касьцёл быў кальвінскім зборам, а праваслаўная царква тады была ўніяцкаю, пры базыльянскім кляштары. Мінаюць часы, зьмяняюцца веры, а Беларусь як была паміж Усходам і Захадам, так і не сыйшлася ў адно. Абедзьве бажніцы аднолькаваму адрамантаваныя, крытыя новай бляхай, урачыста зіхцяць, нібы ўсьміхаюцца адна адной.

Сяргей Харэўскі

... падпісаны ў друк 23°°, 11/8/1996. Друкарня ... Мінск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 4441 ... Кошт ...